СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе і І квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	**10120**	**30360**	**60720**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**9570**	**28710**	**57420**
63858 (ведамасны)	**16170**	**48510**	**97020**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**14740**	**44220**	**88440**

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

10 СНЕЖНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 233
(26346)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

АЛЯКСІЙ II ПАХАВАНЫ Ў БОГАЯЎЛЕНСКІМ САБОРЫ МАСКВЫ

Фота БЕЛТА

Праваслаўныя вернікі праводзілі ў апошні шлях свайго духоўнага пастыра — Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II. Прадстаяцель Рускай праваслаўнай царквы, які памёр 5 снежня на 80-м годзе жыцця, пахаваны ў Богаяўленскім саборы Масквы. Для ўдзелу ў жалобных мерапрыемствах у расійскую сталіцу прыехаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Богаяўленскі кафедральны сабор у народзе яшчэ называюць Ялохаўскім. Ён быў пабудаваны ў 1717—1722 гадах, і з таго часу ў ім ніколі не спынялася служба. Да адраджэння храма Хрыста Збавіцеля Богаяўленскі сабор быў галоўным кафедральным саборам Масквы. У храме знаходзяцца мошчы нябеснага заступніка Патрыярха — Мітрапаліта Маскоўскага Аляксія, які ўзначальваў Рускую царкву ў XIV стагоддзі. Тут жа знаходзіцца магіла Патрыярха Сергія, які кіраваў царквой у гады савецкай улады да 1944 года.

Менавіта ў Богаяўленскім саборы ў чэрвені 1990 года прайшла цырымонія ўступлення Аляксія II на патрыяршы прастол: атрымалася, што ў гэтым храме пачынаўся і завяршыўся яго 18-гадовае служэнне. На магіле ўстаноўлены часовы саркафаг, зроблены з дрэва і размаляваны пад камень. Праз два месяцы яго заменяць на новы, зроблены з уральскага каменю.

Невялікі Богаяўленскі сабор не змог змясціць усіх жадаючых прыняць удзел у пахаванні Патрыярха. Таму людзі выстраіліся ўздоўж усяго маршруту з храма Хрыста Збавіцеля, дзе праводзілася адпяванне, да Богаяўленскага сабора. І гэта нягледзячы на тое, што развітанне з Аляксіем II пачалося яшчэ вечарам 6 снежня і праводзілася кругласутачна. Вернікі стаялі па шмат гадзін у кіламетровай чарзе, нягледзячы на дождж, які не спыняецца ў Маскве ўжо некалькі дзён. Гаварылі, што гэта сама прырода аплаквае смерць любімага народам Патрыярха.

Доступ у храм Хрыста Збавіцеля пачаў абмяжоўвацца толькі ўчора раніцай, калі загучала апошняя памінальная літургія. Услед за ёй прайшло адпяванне Патрыярха. На гэтай цырымоніі прысутнічаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які прыбыў у храм незадоўга да яе пачатку. Кіраўнік беларускай дзяржавы стаў за некалькі метраў ад труны Аляксія II. Крыху пазней месца побач з Прэзідэнтам Беларусі заняў Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. На адпяванні таксама прысутнічалі прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Малдовы Уладзімір Варонін, Прэзідэнт Арменіі Серж Саргсян, Прэзідэнт Сербіі Барыс Тадзіч, Прэзідэнт Абхазіі Сяргей Багапш, Прэзідэнт Паўднёвай Асеці Эдуард Какойты. Развітацца з Аляксіем II у расійскую сталіцу прыехалі і многія палітыкі з краін СНД і Балтыі: сакратар Савета нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны Раіса Багатырова, кіраўнік Партыі рэгіёнаў Украіны Віктар Януковіч, міністры замежных спраў Эстоніі і Латвіі Урмас Паэт і Марыс Рыекстыньш і іншыя. Акрамя таго, аддаць даніну павагі кіраўніку Рускай праваслаўнай царквы прыбылі высокапастаўленыя рэлігійныя дзеячы іншых канфесій.

Адпяванне Аляксія II праводзілася па асаблівым свяшчэнніцкім чыне. Ён адрозніваецца большай працягласцю і ўрачыстасцю. Асаблівасць гэтага адпявання — 5 чытанняў Евангелля, кожнаму з якіх папярэднічаюць чытанне псалмоў, песнапенні і малітвы. Цырымонія доўжылася амаль тры гадзіны. Завяршылася адпяванне чынам развітання: спачатку з Аляксіем II развіталіся свяшчэннаслужыцелі, а затым — свецкія афіцыйныя асобы.

Аляксандр Лукашэнка пакінуў запіс у Кнізе спачуванняў. «Жыццё і служэнне Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II сталі найвялікшым подзвігам у імя ўрачыстасці Праваслаўя, сцвярджэння ідэалаў веры, высокай маральнасці, самаахвяравання і міласэрнасці, умацавання згоды і ўзаемаразумення паміж людзьмі, — гаворыцца ў спачуванні. — Яго Святасць заўсёды быў для Беларусі добрым сябрам, духоўным айцом і настаўнікам. Мы пастаянна адчувалі яго падтрымку і пастырскую любоў. Светлая і ўдзячная памяць аб Патрыярху Маскоўскім і ўсяе Русі Аляксіі II назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах».

Сам Патрыярх сваё добрае стаўленне да Беларусі пацвярджаў і словам, і справай. Ён удзяляў пільную ўвагу развіццю Беларускай праваслаўнай царквы, наведваў рэспубліку з пастырскімі візітамі 6 разоў — у 1991, 1995, 1998, 2001, 2002 і 2008 гадах. У час свайго апошняга візіту ў кастрычніку 2008 года ён прыняў удзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных 1020-годдзю Хрышчэння Русі. Пад патранатам Патрыярха Аляксія II у Мінску быў пабудаваны Дом міласэрнасці, узводзіўся храм-помнік у гонар Усіх святых і бязвінна забітых у Айчыне нашай.

Некалькі гадоў таму карэспандэнту БЕЛТА пашанцавала браць інтэрв'ю ў Аляксія II: уся размова была прасякнутая любоўю да Беларусі і беларускага народа. «Я заўсёды з задавальненнем бываю ў Беларусі, гэтыя візіты ўмацоўваюць адзінства праваслаўных славянскіх народаў, — сказаў тады Патрыярх. — Я ўдзячны беларускаму народу, які заўсёды праяўляў гасціннасць і брацкія пачуцці да рускага народа. Мы ўдзячны кіраўніцтву Беларусі, якое прымае ўдзел у аднаўленні храмаў. Адносіны царквы і дзяржавы ў краіне развіваюцца і ўмацоўваюцца. З боку ўрада заўсёды аказваецца дапамога ў тых пытаннях, дзе можа дапамагчы дзяржава».

Аляксій II падкрэсліў, што ў Беларусі многае робіцца для таго, каб простаму чалавеку было лягчэй жыць, а магчымасці, якія адкрываюцца перад народам пасля вяртання да духоўных вытокаў, выкарыстоўваюцца максімальна. «Нас не можа не радаваць эканамічны рост, які ажыццяўляецца ў Беларусі, — адзначыў Яго Святасць. — Кожны раз, бываючы ў вас, я бачу паляпшэнне жыцця. Дай Бог, каб гэта развіццё ўмацоўвалася і ў далейшым на карысць беларускага народа і Беларусі, якая мае важнае значэнне, знаходзячыся на шляху з Захаду на Усход».

«Жадаю беларускаму народу і міру, і згоды», — так завяршыў сваё інтэрв'ю Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II.

БЕЛТА.

«Прамая лінія»

ПЕНСІІ: УСЁ, ШТО ВАМ ЦІКАВА

Пенсійная тэма — актуальная заўсёды. І сведчаннем гэтага становяцца званкі ў рэдакцыю, вынікам якіх стала рашэнне правесці чарговую «прамую лінію» са спецыялістамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Асаблівасці падліку стажу, індывідуальнага каэфіцыента, надбаўкі, магчымасці датэрміновага выхаду на заслужаны адпачынак — аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць з **намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валерыем Валер'евічам КАВАЛЬКОВЫМ.**

Наша «прамая лінія» ***адбудзецца 12 снежня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.***

«Прамая лінія»

Далоў камяні... І цыстыт, і прастатыт

17 снежня, у сераду, з 14.00 да 15.00 у рэдакцыі газеты на пытанні аб прафілактыцы і лячэнні мочакаменнай хваробы, дабраякаснай гіперплазіі прастаты, нетрымання мачы, запаленчых хвароб мочапалавой сферы — прастатыту, піелянефрыту, цыстыту адкажа **загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр Уладзіміравіч СТРОЦКІ.**

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

МЫ ЕДЗЕМ!

...Факт: на чарговы розыгрыш прызоў, які адбудзецца на пачатку ўжо Новага года, прыйшлі першыя 300 картак. На кожнай з іх, як і належыць, прозвішча-імя, назва аддзялення сувязі, дзе афармлена падпіска, зваротны адрас, нумар тэлефона... Карацей, інфармацыі пра чытача, як быццам, шмат?

Але ж мы ўжо ведаем, што яе — проста бязбожна мала!

Каб даведацца больш (хоць пра асобных!) трэба парукацца-пагаварыць. А яшчэ лепей — наведаць, так бы мовіць, па месцы жыхарства, пазнаёміцца з сем'ямі...

Магчымасць такіх вось сустрэч даюць нашы Дні падпісчыка, нашы прызы. Чарговы з іх, каляровы тэлевізар «Віцязь», разыграны па выніках папярэдняй падпісной кампаніі, чакае сваёй адпраўкі на Асіповіччыну. І мы ўжо нават ведаем, каму ён будзе служыць — вядомаму тут краязнаўцу і педагогу Сямёну Дзмітрыевічу Бародзічу.

Засталося толькі ўручыць.

Яно, гэтае ўручэнне, згодна з папярэдняй дамоўленасцю адбудзецца ў чацвер, 11 снежня, у 12 гадзін у актавай зале Дараганаўскага сельскага Савета. Куды, карыстаючыся выпадкам, і хацелася б запрасіць усіх нашых (ды і чужых) падпісчыкаў — для знаёмства, для шчырай размовы. Пра ўсё.

Звяздоўцы.

P.S. Па дарозе, як заўжды, плануем недзе спыняцца і недзе збочваць.

Калі хочаце, каб з прызам (ці і без яго?) мы збочылі да вас, пішыце, выпісвайце газету, дасылайце картку на розыгрыш прызоў — усё магчыма. А тым больш — наканадні Каляд ды Новага года!

Каб сусветны крызіс зачапіў па мінімуму...

Ва Ўрадзе

Не толькі пытанні, якія ў найбольшай ступені вызначаць эканамічную сітуацыю ў нашай краіне ў перыяд глабальнага фінансавага крызісу, але і комплекс захадаў па мінімізацыі ўплыву знешніх пагроз на айчынную эканоміку абмяркоўваліся на ўчарашнім пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

Як зазначыў кіраўнік Урада, крызіс ахоплівае ўсё больш дзяржаў, і яго ўплыў на эканоміку Беларусі ўзмацняецца, улічваючы яе экспартную арыентаванасць. Тым не менш, нягледзячы на ўсе складанасці, год краіна завяршае з годнасцю. За выключэннем знешнегандлёвага балансу, падкрэсліў Сяргей Сідорскі, будуць выкананы ўсе асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Што ж датычыцца першачарговых антыкрызісных захадаў, то сярод іншых прэм'ер-міністр вылучыў неабходнасць скарачэння расходаў у рэальным сектары эканомікі шляхам жорсткай эканоміі. Паводле яго слоў, рэкорднае падзенне цэнаў на нафту і на матэрыялы дасць магчымасць прадпрыемствам знізіць выдаткі на вытворчасць прадукцыі, што, у сваю чаргу, дазволіць выйсці на канкурэнтаздольныя цэны на знешніх рынках. Нагадаў прэм'ер і пра тое, што ўжо ў гэтым годзе павінна быць завершана лібералізацыі і мадэрнізацыя эканомікі. «Такую задачу паставіў Прэзідэнт, — сказаў Сяргей Сідорскі. — І да яе рашэння засталося 20 дзён». Звяртаючыся да прысутных кіраўнікоў, ён зазначыў, што прыйшоў час хуткіх рашэнняў на ўзроўні ўсіх звенняў кіравання. І акрэсліў пытанні, якім яны павінны надаваць асаблівую ўвагу, — зямля, уласнасць, лібералізацыя афармлення дакументаў, праца з замежнымі інвестарамі. Спыніўшыся на апошнім прыярытэце, Сяргей Сідорскі паведаміў, што на працягу 2-3 гадоў краіна можа прыцягнуць мільярды долараў інвестыцый. І гэта не проста прапановы, а канкрэтныя праекты. Аднак, каб ажыццявіць іх, патрэбна аператыўна вырашаць пытанні лібералізацыі і дэбюракратызацыі і па рабоце з замежнымі інвестарамі. Ён заўважыў, што часам пытанні, якія можна вырашыць на працягу аднаго дня, у міністэрствах ляжаць месяцамі.

Міністр эканомікі Мікалай Зайчанка, ацэньваючы сітуацыю, заўважыў, што з нарастаннем уплыву сусветнага фінансавага крызісу агульнай тэндэнцыяй, якая праявілася ў чацвёртым квартале, стала запаволенне эканамічнага росту, зніжэнне тэмпаў вытворчасці прамысловай прадукцыі, спажывецкіх тавараў, экспарту. Па большасці арганізацый, праінфармаваў ён, фіксуецца падзенне попыту і пакупніцкай здольнасці гандлёвых партнёраў. Найбольш заўважна гэта праяўляецца ў чорнай металургіі, машынабудаванні, хімічнай і нафтахімічнай галінах, лёгкай прамысловасці. Замаруджванне дзелавой актыўнасці выклікала рост запасаў гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў: на 1 снежня яны склалі па кошце больш за 5,2 трыльёна рублёў і выраслі толькі за месяц на 700 мільярдаў рублёў. Суадносіны аб'ёмаў запасаў да сярэднемесячнай вытворчасці прадукцыі ў прамысловасці склалі 63,5 працэнта.

Міністр нагадаў, што Прэзідэнтам і прэм'ерам пастаўлена задача істотнага скарачэння гэтых запасаў. Выконваючы яе, напрыклад, скараціўшы запасы на 50-70 працэнтаў, рэальны сектар эканомікі можа пазбавіцца ад фінансавых цяжкасцяў і атрымаць 2,6-3,6 трыльёна рублёў абаротных сродкаў. Мікалай Зайчанка, гаворачы пра неабходнасць рэзкай актывізацыі работы па рэалізацыі прадукцыі, зазначыў, што рабіць гэта трэба не спыняючы прадпрыемстваў і не дапускаючы скарачэння персаналу.

«Неабходна павялічыць пастаўкі айчыннай прадукцыі і на ўнутраны рынак», — падкрэсліў міністр. — Міністэрству гандлю, аблвыканкамам, Мінгарвыканкаму, Белкаапсаюзу пастаўлена задача жорстка забяспечыць прыярытэтнасць разлікаў гандлёвых арганізацый за прадукцыю айчынных прадпрыемстваў, распрацаваць сістэму стымулявання гандлёвых работнікаў за продаж менавіта беларускіх тавараў». Скарачэнне запасаў будзе спрыяць і паляпшэнню вынікаў знешнеэканамічнай дзейнасці. Паводле папярэдніх ацэнак, сальда знешняга гандлю па выніках года складзе мінус 3,6 мільярда долараў ЗША.

Мікалай Зайчанка паведаміў, што Ўрадам для падтрымкі рэальнага сектару і захавання макраэканамічнай стабільнасці прыняты шэраг апераджальных захадаў па мінімізацыі наступстваў сусветнага фінансавага крызісу. Гэтыя захады ахопліваюць пытанні захавання ліквіднасці банкаў, стабільнасці на валютным рынку, скарачэння дзяржаўных расходаў і падтрымкі рэальнага сектару. Перш за ўсё, пачалася дэталёвая інвентарызацыя ўсіх дзяржаўных праграм з аналізам выканання мерапрыемстваў інвестыцыйных праектаў і атрыманых вынікаў па іх на прадмет аптымізацыі іх фінансавання. Усё, падкрэсліў міністр, што датычыцца рэальнай вытворчасці, інвестыцый, развіцця, захоўваецца. Другасныя ж праекты, без якіх можна абысціся, адкладваюцца да лепшых часоў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

НЕ СПАЗНІЦЕСЯ Ў СВЯТЫ

Графік работы пасажырскага транспарту ў Мінску змяняецца напярэдадні Новага года.

У Мінску ў перыяд правядзення калядных і навагодніх святаў, у сувязі з пераносам рабочых дзён змяняецца работа камунальнага пасажырскага транспарту. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама.

Гарадскія аўтобусныя маршруты 25 і 28 снежня, 1 і 4 студзеня будуць працаваць па графіку нядзельных дзён; 26 і 27 снежня, 2 і 3 студзеня — па графіку суботніх дзён.

Работа тралейбусных і трамвайных маршрутаў 25, 26, 27 снежня, 2 і 3 студзеня арганізуецца па графіку суботніх дзён; 28 снежня, 1 і 4 студзеня — па графіку нядзельных дзён.

Прыгарадныя аўтобусныя маршруты 19, 20, 24 і 31 снежня будуць працаваць па графіку пятніцы; 25, 26 снежня, 1 і 2 студзеня — па графіку суботніх дзён; 21, 27, 28 снежня, 3 і 4 студзеня — па графіку нядзельных дзён.

* * *

Змяненні адбудуцца і ў руху прыгарадных цягнікоў.

Паводле інфармацыі УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі», на ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Асіповічы, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша яны будуць курсіраваць наступным чынам. 20 снежня і 10 студзеня — па раскладзе рабочых дзён; 24, 31 снежня і 6 студзеня — як па пятніцах; 25, 26 снежня, 1 і 2 студзеня — як па суботах; 27 і 28 снежня, 3, 4 і 7 студзеня — па раскладзе нядзелі.

24 і 30 снежня дадаткова прызначаюцца прыгарадныя электрацягнікі зносінамі Мінск — Брэст (адпраўленнем на 17.29 і 18.42).

1 студзеня 2009 года адмяняюцца наступныя электрацягнікі: Маладзечна — Мінск (адпр. 04.03), Стоўбцы — Мінск (адпр. 04.21), Барысаў — Інстытут культуры (адпр. 04.27), Мінск — Аляхновічы (адпр. 06.09), Аляхновічы — Мінск (адпр. 07.34), Пухавічы — Мінск (адпр. 05.13), Мінск — Пухавічы (адпр. 05.30), Пухавічы — Мінск (адпр. 07.25), Інстытут культуры — Барысаў (адпр. 04.55), Барысаў — Інстытут культуры (адпр. 06.37).

У Маладзечанскім вузле прыгарадныя электрацягнікі 20 снежня і 10 студзеня будуць хадзіць па графіку рабочых дзён; 25, 26 і 27 снежня, 1, 2, 3 і 7 студзеня — па раскладзе суботы; 28 снежня і 4 студзеня — па раскладзе нядзелі.

На ўчастку Орша — Лепель у перадсвяточныя і святочныя дні рух электрацягнікоў будзе ўстаноўлены такім чынам: 20 снежня і 10 студзеня — як па рабочых днях; 25, 26, 27, 28 снежня і 1, 2, 3, 4 і 7 студзеня — як па выхадных.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Беларускую малочную прадукцыю і рапсавы алей дазволена экспартаваць без біржавых таргоў

Юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам з 8 снежня дазволена экспартаваць некаторыя віды малочнай прадукцыі і рапсавы алей без заключэння здзелак на біржавых таргах ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа». Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1882 «Аб некаторых пытаннях экспарту асобных тавараў», паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

У прыватнасці, без заключэння здзелак на біржавых таргах дазволена экспартаваць малако і вяршкі (код Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь 0402 10), сметанковае масла (код 0405 10), сыры (код 0406 90). Таксама не трэба будзе ўдзельнічаць у біржавых таргах пры пастаўках на знешнія рынкі казеіну для прамысловых мэтаў, акрамя вытворчасці прадуктаў харчавання або корму для жывёлаў (код 3501 10 500 0), і рапсавага алею (код 1514).

БЕЛТА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.12.2008 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 188,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	2 813,33	USD	28,0029
1 латвійскі лат	3 967,00	10 UAH	36,0061
1 літоўскі літ	814,35	1000 BYR	12,8395
1 чэшская крона	109,21	EUR	37,2379
1 польскі злоты	716,29	Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.12.2008 г.)	
1 расійскі рубель	78,13	USD	2175 / 2250
1 украінская грыўня	289,04		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

НОВЫЯ МАРКІ

8 снежня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне блок «425 гадоў Нясвіжскаму замку», падрыхтаваны ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Святлана Ржэуцкая.

9 снежня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне маркі: «З Нараджэннем Хрыстовым! З Новым годам!», «З Новым годам!», падрыхтаваныя ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Ганна Раманоўская.

ISSN 1990 - 763X

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает

о снижении процентной ставки на 5 процентных пунктов при досрочном погашении физическими лицами кредитов на общих основаниях.

Снижение процентной ставки осуществляется с 10 декабря 2008 г. по 31 января 2009 г. при досрочном погашении кредитополучателями кредитов на общих основаниях в белорусских рублях или в иностранной валюте на 5 процентных пунктов за период пользования кредитом с момента осуществления последнего платежа по основному долгу по дату досрочного (окончательного) погашения задолженности по кредитному договору.

Для снижения процентной ставки по кредиту необходимо обратиться в службу кредитования населения учреждения ОАО «АСБ Беларусбанк» для заключения дополнительного соглашения по кредитному договору.

Более подробную информацию относительно погашения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте

www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ВАДА ПА САБЕКОШЦЕ

Хто не ўсталюе лічыльнік — будзе плаціць утрая больш

У адпаведнасці з пастаўленай задачай, да канца гэтага года камунальныя службы абавязаны забяспечыць поўнае абсталяванне ўсяго жыллёвага фонду краіны прыборамі ўліку спажывання вады. Да апошняга часу адпаведная лічба ў шэрагу месцаў дасягала 90-працэнтнага ўзроўню і далей практычна не рухалася.

Затое зараз у водаканалах сапраўдны ажыятаж — нярэдка можна ўбачыць даволі вялікія чэргі. Актывізавала жыхароў паведамленне аб тым, што з пачатку наступнага года тыя, хто не ўсталюе лічыльнікі вады, будуць разлічвацца па сабекошце. Гэта амаль ўтрая больш, чым вызначана цяперашнімі тарыфамі. Як паведаміла начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена Дудзінская, сярэдні ўзровень пакрыцця насельніцтвам затрат па водазабеспячэнні складае 35 працэнтаў. «Куб» вады каштуе 321,4 рубля.

Няцяжка падлічыць, што плацяжы па сабекошце будуць амаль утрая больш. Таму насельніцтва імкнецца ўстанавіць лічыльнікі. Як стала вядома карэспандэнту «Звязды» некалькі прычын, па якіх вадамер не быў усталяваны, могуць лічыцца ўважлівымі. Можа здарыцца, што жыхар доўгі час адсутнічае і не можа своечасова прыбыць для ўсталявання лічыльніка. Такімі прыборамі немэтазгодна абсталёўваць вельмі зношаны жылфонд і дамы малапавярховай забудовы, якія ў перспектыве плануецца знесці. Нельга ўсталяваць лічыльнікі там, дзе для гэтага няма тэхнічнай магчымасці. Ва ўсіх астатніх выпадках прычыны, па якіх у кватэры няма прыбораў уліку вады, будуць лічыцца няўважлівымі, і плацяжы будуць выстаўляцца па сабекошце. Такая практыка, як мяркуецца, будзе зацверджана адпаведнай пастановай Савета Міністраў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

У РЭГІЁНАХ КВАТЭРЫ ТАННЕЮЦЬ ПА-РОЗНАМУ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наша выданне ўжо паведамляла, што за апошнія два месяцы другаснае жыллё ў суседніх краінах патаннела ў сярэднім прыкладна на 10—20 працэнтаў. Жыллёвая нерухомасць Мінска таксама пачала таннець, аднак істотна меншымі тэмпамі — прыкладна 2—5 працэнтаў за 3 месяцы. Мы вырашылі прааналізаваць становішча і «паводзіны» другасных рынкаў жылля ў заходнім і ўсходнім рэгіёнах нашай краіны.

Кіраўнік Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці» г. Брэста Анатоль Вайтовіч адзначыў, што ўжо з сярэдзіны кастрычніка колькасць рэальных пакупнікоў кватэр паменшылася ўдвая і працягвае знікацца. Прычынай такой тэндэнцыі, паводле меркавання мясцовых рыэлтараў, з'яўляюцца два фактары. Па-першае, гэта адсутнасць магчымасці атрымаць танныя рублёвыя крэдыты — валютныя пазыкі з максімальнымі працэнтнымі стаўкамі попытам сёння ў насельніцтва не карыстаюцца. А па-другое, на патэнцыйных пакупнікоў працягвае цяснуць інфармацыйны паток аб моцным сусветным фінансавым крызісе, у выніку якога можа патаннець жыллё ў тым ліку і ў Беларусі. Між іншым, дакладна ніхто не ведае, калі гэты агучаны прагноз спраўдзіцца, але яго чаканне ўжо прывяло да таго, што попыт на ўсе віды жылля працягвае знікацца.

БРЭСЦКІЯ ПРАДАЎЦЫ ЗГОДНЫЯ СКІДВАЦЬ 5—7 ТЫС. USD

Сёння ў горадзе над Бугам самымі таннымі лічацца аднапакаёўкі-маласямейкі ў дамах- «хрушчоўках». Такія кватэры з агульнай плошчай ад 22 да 28 квадратных метраў з кухняй у межах 4,3—4,5 «квадратаў» прапаноўваюцца па 30—38 тысяч долараў. У новых каркасных дзевяціпавярховых дамах кватэры з агульнай плошчай да 45 квадратных метраў і кухняй да 12 «квадратаў» каштуюць ад 50 да 60 тысяч долараў. Маленькія двухпакаёвыя кватэры-«хрушчоўкі» з агульнай плошчай каля 34—35 квадратных метраў каштуюць да 45 тысяч долараў. Сярэдняя двухпакаёвая з кухняй у 9 «квадратаў» і агульнай плошчай каля 52—54 квадратных метраў прапаноўваецца пакупнікам па кошце ад 60 да 65 тысяч долараў. Існуюць і даволі якасныя двухпакаёвыя кватэры ў новых дамах з сучаснай планіроўкай і кухняй да 12 «квадратаў», якія каштуюць на другасным рынку жылля Брэста да 70 тысяч долараў.

Самы нізкі кошт трохпакаёвых кватэр з агульнай плошчай каля 52—55 квадратных метраў і кухняй 5,7 «квадрата» пачынаецца з 60 тысяч долараў. Сярэдняя па якасці трохпакаёвая кватэра з агульнай плошчай да 67 квадратных метраў у панэльных дамах каштуе прыкладна ад 70 да 75 тысяч долараў.

Кіраўнік дзяржаўнай рыэлтарскай канторы Брэста Анатоль Вайтовіч падкрэсліў, што колькасць прапаноў кватэр на продаж у апошнія два месяцы істотна не павялічылася. Ніякай істэрыі на гэты конт сярод уладальнікаў «лішніх» кватэр у Брэсце няма. Так, існуе тэндэнцыя, калі ў агенцтвы нерухомасці пачалі звяртацца гаспадары кватэр, якія раней спрабавалі прадаць сваё жыллё па максімальным кошце самастойна. Пры мінімальным попыце на рынку прадаць дарагое жыллё па такой схеме сёння нерэальна.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

с 10 декабря 2008 г. повышает процентную ставку по срочному банковскому вкладу в белорусских рублях

«ГАРАНТИРОВАННЫЙ ДОХОД» НА 15 ДНЕЙ до 13 процентов годовых.

Увеличенная процентная ставка применяется с 10.12.2008 г. как по вновь принимаемым, так и по ранее принятым вкладам «Гарантированный доход» на 15 дней.

Дополнительную информацию по размещению денежных средств на банковские вклады можно получить в любом учреждении банка или на сайте

http://www.belarusbank.by

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2007 г.
Вклады до востребования	20,3	62,4	149,7	238,4	148,6	193,3	202,6	233,2	244,1	365,5	397,0	29 577,5	31 832,6
в том числе: в белорусских рублях	19,4	59,3	146,3	234,1	142,4	187,7	196,5	222,2	237,7	355,5	388,0	29 408,3	31 597,5
в иностранной валюте	0,9	3,1	3,4	4,3	6,2	5,6	6,1	11,0	6,4	10,0	9,0	169,2	235,1
Срочные депозиты	30 358,5	32 352,4	24 405,4	38 746,0	48 555,5	31 125,0	54 036,6	38 911,9	30 223,7	55 111,0	42 713,9	52 150,6	478 690,4
в том числе: в белорусских рублях	26 895,8	28 068,5	20 038,5	29 455,9	42 531,2	25 248,9	42 908,6	32 018,1	23 385,1	42 826,4	34 573,9	35 011,8	382 962,8
в иностранной валюте	3 462,7	4 283,9	4 366,9	9 290,1	6 024,3	5 876,1	11 128,0	6 893,8	6 838,6	12 284,6	8 140,0	17 138,8	95 727,6

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЯК «ПРАБІЦЦА» НА РАСІЙСКІ РЫНАК?

У Маскве адбылася сустрэча кіраўніка Федэральнай службы па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе Сяргея Данкверта і намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіла Савельева. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Мінсельгасхарчы, бакі разгледзелі надзвычай актуальныя зараз пытанні — стан і перспектывы супрацоўніцтва па ветэрынарным наглядзе, павышэнне эфектыўнасці памежнага веткантролю пры аглядзе і афармленні грузаў.

Падведзены вынікі праверкі беларускіх перапрацоўшчыкаў, якая праводзілася ў жніўні спецыялістамі Рассельгаснагляду. Падчас гэтай даволі маштабнай акцыі былі праінспектаваны 35 прадпрыемстваў, якія зацікаўлены ў пастаўках прадукцыі жывёльнага паходжання ў Расію. Дасягнута дамоўленасць аб тым, што ў спісе аб'ектаў гаспадарання, якія маюць права на экспарт, могуць быць захаваны Талачынскі філіял «ААТ Лепельскі малочна-кансервавы завод» і Гомельская фабрыка марожанага. На шэрагу прадпрыемстваў выпраўлены выяўленыя падчас праверкі недахопы, ім прадастаўлена права на пастаўкі з 1 студзеня 2009 года. Гэта Ляхавіцкі малочны завод, Верхнядзвінскі масласырзавод, Слаўгарадскі масларобна-сыраробны завод, Асіповіцкі малочны камбінат, філіял «Сервалюкс-агра» СЗАТ «Сервалюкс», а таксама прадпрыемства «Старфуд».

Яшчэ 14 беларускіх прадпрыемстваў недахопаў пакуль не ліквідавалі, таму з пачатку наступнага года яны спыняюць пастаўкі прадукцыі на расійскі рынак. Аднак пры ўмове выпраўлення «хібаў» і выканання ветэрынарна-санітарных патрабаванняў Рассельгаснагляд абавязаўся разгледзець магчымасць аб уключэнні гэтых перапрацоўшчыкаў у спісы экспарцёраў. Дарэчы, паводле інфармацыі, якая змешчана на афіцыйным сайце Мінсельгасхарча, для экспарту ў Расійскую Федэрацыю акрэдытавана 48 малакаперапрацоўчых і 26 мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Трэба мець на ўвазе, што ў бліжэйшы час патрабаванні да экспарцёраў змяняюцца. З 21 снежня ў Расіі пачынае дзейнічаць тэхнічны рэгламент на малако і малочную прадукцыю, а з 28 снежня — на маслатлушчавую прадукцыю. Таму айчыннym вытворцам неабходна ў сціслыя тэрміны правесці пацвярджэнне патрабаванням адпаведных нарматываў. Як паведамілі ў Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі, прадугледжаны дзве формы: у выглядзе прыняцця дэкларацыі аб адпаведнасці юрыдычнымі асобамі альбо індывідуальнымі прадпрымальнікамі ці ў выглядзе сертыфікацыі прадукцыі ў адпаведнай установе. Устаноўлена, што правам пацвярджэння валодае Дзяржстандарт. З 1 снежня прадпрыемствы харчовай прамысловасці могуць звяртацца ў аддзел па сертыфікацыі прадукцыі Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Надвор'е

Зноў слота і моцны снег

На гэтым тыдні амаль паўсюдна ападкаў не прадбачыцца, паведаміў рэдакцыі начальнік службы Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Сёння ўдзень па Віцебскай вобласці, а ў чацвер—пятніцу месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пройдзе мокры снег і дождж. У сераду ўдзень па ўсёй краіне туман, на дарогах галалёдзіца, тэмпература паветра ад мінус 2 да плюс 3. Тэмпература паветра ўначы ў чацвер і пятніцу ад мінус 4 да полюс 2, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў. У выхадныя і наступны панядзелак ападкаў не будзе. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да 5 марозу, удзень — ад мінус 2 да плюс 3.

Сяргей КУРКАЧ.

І торт, і шампанскае — на кожны святочны стол!

Ніводная група тавараў не трапіць пад Новы год у разрад дэфіцытных. Для гэтага ў аптовых і рознічных гандлёвых арганізацыях быў створаны запас харчовых і нехарчовых тавараў, які гарантуе, што ў перадсвяточныя і навагоднія дні попыт насельніцтва ва ўсіх групах тавараў будзе забяспечаны ў поўным аб'ёме. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведамілі журналістам прадстаўнікі Міністэрства гандлю і Галоўнага ўпраўлення арганізацыі спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Напрыклад, Міністэрствам гандлю дасягнута дамоўленасць з прадпрыемствамі краіны аб максімальным выкананні заявак гандлёвых арганізацый на пастаўку алкагольных напояў у самым шырокім асартыменце. Быў зацверджаны графік пастаўкі ігрыстых вінаў і шампанскага ААТ» Мінскі завод ігрыстых вінаў» на кастрычнік- снежань па абласцях і па Мінску ў колькасці 3 млн 893 тысячы бутэлек. Рознічныя цэны на ігрыстыя віны і шампанскае айчыннай вытворчасці складаюць ад 9 да 16 тысяч рублёў, а на аналагічны тавар замежнай вытворчасці вагаюцца ад 17 да 70 тысяч рублёў.

Актыўна рыхтуюцца да навагодніх святаў зараз і кандытарскія прадпрыемствы. Фабрыкі «Камунарка» і «Спартак» плануюць паставіць у гандаль 1 млн 700 тысяч салодкіх падарункаў. Усяго ў гэтым годзе распрацавана больш як 40 відаў навагодніх набораў у выглядзе баулаў і мяккіх цацак вагой ад 300 грамаў да 2,5 кілаграма і коштам ад 6 да 100 тысяч рублёў. Так бы мовіць, на любы густ і фінансавыя магчымасці. Да таго ж у аддзелах, што рэалізуюць кандытарскія вырабы, ёсць святочныя баулы рознай формы для самастойнага фарміравання пакупніком падарункаў.

У перадсвяточныя дні па традыцыі павялічваецца зменнасць работы кулінарных і булачна-кандытарскіх цэхаў, якіх налічваецца па краіне больш за чатыры сотні. Яны плануюць выпусціць і рэалізаваць каля 3 тысяч тон кандытарскіх вырабаў і кулінарнай прадукцыі. У сталіцы ў дні Калядаў і навагодніх святаў у крамы кожны дзень будуць пастаўляць па 18-20 тон тартоў. У аб'ектах грамадскага гандлю распачаўся прыём папярэдніх замоў на кулінарныя вырабы, паўфабрыкаты і кандытарскія вырабы (пірагі, тарты, у тым ліку і з навагоднім афармленнем).

З 20 снежня будзе праведзена больш за 3 тысячы выстаў-продажаў прадукцыі грамадскага харчавання, у тым ліку пройдуць аўтарскія выставы майстроў-павароў і майстроў-кандытараў. Усяго ў перадсвяточныя і святочныя дні ў аб'ектах грамадскага харчавання плануецца абслужыць каля паўмільёна чалавек, а непасрэдна навагоднюю ноч там правядуць 110 тысяч гасцей, тым ліку 25 тысяч чалавек — у сталічных кавярнях і рэстаранах. Кошт заказу складае ў рэгіёнах ад 50 да 150 тысяч рублёў, а ў сталіцы — «стартуе» са 100 тысяч...

Як заўважыў у сваім выступленні намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі гандлю і паслуг Міністэрства гандлю Андрэй Новікаў, у апошнія гады святкаванне Новага года распачынаецца намнога раней за афіцыйную дату і не завяршаецца 1 студзеня. У сталічных крамах будзе арганізавана звыш 100 распродажаў тавараў са зніжэннем рознічных цэн за кошт змяншэння адпускной цаны вытворцамі і зніжэння гандлёвых надбавак. Акрамя таго, у рамках перадсвяточнага гандлю ва ўнівермагах сталіцы і іншых буйных гандлёвых арганізацыях, уключана ў фірменай гандлёвай сетцы, адбудзецца больш за 80 рэкламных акцый з уручэннем пакупнікам сувенірнай прадукцыі, прызоў і падарункаў пры ажыццяўленні пакупак. Мінчанам нават абяцаюць арганізацыю тэатралізаваных прадстаўленняў, накшталт тых, што ладзяцца ў буйных замежных гандлёвых цэнтрах з удзелам Дзеда Мароза і казачных персанажаў. А ўсяго па краіне пройдзе 770 рэкламных мерапрыемстваў і акцый.

Зараз у гандлёвых арганізацыях прадстаўлена каля 1,5 тысячы відаў ёлачных упрыгажэнняў, больш за сто відаў карнавальных касцюмаў і масак, больш за чатыры сотні найменняў сувенірнай прадукцыі з керамікі, фарфору, шкла, пластмасы, саломкі, ільновалакна з калядная і навагодняй тэматыкай: абрусы, ручнікі, падсвечнікі, дэкаратыўныя свечы. Асартымент штучных ёлак налічвае больш за 50 відаў. Іх кошт вагаецца ад ад 10 да 300 тысяч рублёў.

23-24 снежня пачнуць працаваць ёлачныя кірмашы, якіх па краіне будзе арганізавана больш за 660. У Мінску арганізуюцца 10 ёлачных кірмашоў: лясныя гаспадаркі Міншчыны плануюць прывезці ў сталіцу больш за 40 тысяч лясных прыгажунь. Да таго ж, эксперыментальная фермерская гаспадарка «Калядны лес» збіраецца прапанаваць пакупнікам два віды натуральных ёлак уласнай вытворчасці ў кадушках: блакітныя ёлкі і гатунак «Энгельман», вышынёй ад 50 сантыметраў да 3 метраў і коштам ад 50 да 200 тысяч рублёў. А 25 снежня побач з Палацам спорту ў Мінску пройдзе агульнагарадскі калядны кірмаш, дзе таксама можна будзе набыць лясную прыгажуню.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Каб сусветны крызіс зачапіў па мінімуму...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Узгадваючы пра мерапрыемствы, накіраваныя на падтрымку малога і сярэдняга бізнэсу, разняволванне прадпрымальніцкай ініцыятывы, міністр расказаў аб зацверджаным плане па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці. Найбольш важныя захады мяркуецца рэалізаваць ужо да 1 студзеня 2009 года. За непрацяглы час неабходна падрыхтаваць рашэнні, якія закранаюць пераўтварэнні ў сферах распараджэння дзяржмаёмасцю, рэгулявання зямельных і арэндных адносінаў, спрашчэння сістэмы падаткаабкладання, удасканалення кантрольнай дзейнасці, ліцэнзавання, цэнаўтварэння, спрашчэння адміністратыўных працэдур, стымулявання інавацыйнай дзейнасці і інш. Іх рэалізацыя будзе стымуляваць развіццё бізнэсу і дасць істотныя імпульсы пашырэнню сферы паслуг. Дзеля развіцця апошняй распрацаваны комплекс дадатковых захадаў па пашырэнні платных паслуг: прадугледжваецца павелічэнне сеткі арганізацый бытавога абслугоўвання, грамадскага харчавання недзяржаўнай формы ўласнасці, пашырэнне сеткі станцый дыягностыкі, рамонту і тэхабслугоўвання аўтамабіляў, спектра платных медыцынскіх паслуг, паслуг сувязі.

Акрамя таго, з улікам прапаноў міністэрстваў, дырэктарская корпуса сфарміраваны праект комплексу дадатковых захадаў па мінімізацыі негатыўнага ўплыву сусветнага фінансавага крызісу на функцыянаванне рэальнага сектару эканомікі. Гэты план будзе ў бліжэйшы час прадстаўлены для зацвярджэння. Частка яго, паводле слоў міністра, ужо рэалізаваная, у прыватнасці, прадпрыемствам даецца магчымасць ажыццяўляць экспарт, у тым ліку па ніжэйшай за сабекошт цане. Сярод іншых Мікалай Зайчанка вылучыў таксама мерапрыемствы па прадстаўленні беспрацэнтнага падатковага крэдыту для арганізацый экспарцёраў, кампенсацыю за кошт бюджэтных сродкаў часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, устанаўленне льготных тарыфаў па энергетыцы для асобных прадпрыемстваў. Для вырашэння гэтых задач і забеспячэння фінансавання рэальнага сектару эканомікі прадугледжваецца павелічэнне статутных фондаў чатырох сістэмаўтваральных банкаў.

Разам з тым міністр упэўнены, што для пераадолення наступстваў сусветнага крызісу неабходна актывізаваць і каардынаваць дзеянні па стратэгічных напрамках супрацоўніцтва з дзяржавамі — членамі ЕўрАзЭС, у першую чаргу з Расіяй. Для гэтага трэба распрацаваць і прыняць план сумесных дзеянняў у рамках ЕўрАзЭС, ключавым напрамкам якога павінна стаць стварэнне сістэмы даверу плацяжоў па ўзаемных пастаўках, з мэтай ліквідаваць праблему несвоечасовых разлікаў за пастаўленую прадукцыю і падтрымаць экспарт кожнай краіны.

Пра перспектывы на наступны год Мікалай Зайчанка распавядаў без ружовых акуляраў. Сітуацыю ў эканоміцы ён назваў цяжкапрадказальнай. «Аб'ектыўна ацэньваючы перспектывы завяршэння гэтага і сітуацыю пачатку наступнага года, відавочна, што праблем у 2009 годзе менш не стане», — лічыць ён. У першым і другім квартале 2009 года прагназуюцца ніжэйшыя тэмпы эканамічнага росту з яго кампенсацыяй у другой палове года пры наяўнасці больш спрыяльных знешніх умоў. У прыватнасці, паводле прагнозу, рост ВУП у першым квартале складзе каля 105 працэнтаў, у першым паўгоддзі — 107.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Абзац

■ У выніку снегападу ў Гомельскай вобласці былі абясточаныя 82 населеныя пункты. Без святла засталіся вёскі ў Лоеўскім, Брагінскім, Веткаўскім і Гомельскім раёнах.

■ Нацбанк Беларусі ў студзені-лістападзе прадаў насельніцтву 1936 брыльянтаў агульнай масай 315,68 карата. Было прададзена 4384 брыльянты агульнай масай 737,66 карата. Выручка ад іх рэалізацыі склала каля Br2,56 млрд, або $1,18 млн.

■ Тэхнічны рэгламент «Аўтамабільны бензін і дызельнае паліва. Бяспека» (ТР 2008/011/BY) будзе ўведзены ў дзеянне ў Беларусі з 1 студзеня 2010 года. Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў № 1855. Аўтабензін з метала- і аміназмяшчальнымі актанапавышальнымі прысадкамі, у тым ліку этыліраваны аўтамабільны бензін, не будзе дапускацца да размяшчэння на рынку. Для паляпшэння эксплуатацыйных паказчыкаў аўтабензіну і дызельнага паліва дапускаецца выкарыстанне вытворцам прысадак, якія не аказваюць негатыўнага ўздзеяння на рухавікі ўнутранага згарання тэхнікі.

■ У Віцебску за парушэнне парадку правядзення валютных аперацый затрыманыя два беспрацоўныя мясцовыя жыхары. У іх канфіскавана больш за 21 млн рублёў і 10 тыс. долараў ЗША.

■ Урад Туркменістана аб'явіў аб рашэнні прыбраць з тэксту нацыянальнага гімна радкі аб Туркменбашы, што нагадваюць пра першага прэзідэнта рэспублікі Сапармурата Ніязава. У гімне слова «Туркменбашы» — «Бацька ўсіх туркмен» — згадваецца 4 разы. Такое званне прыдумаў сам Ніязаў, які правіў краінай з 1990 года да сваёй смерці ў 2006 годзе. У гонар яго і членаў яго сям'і называліся аэрапорты, гарады, месяцы і дні. Па ўсёй краіне было ўзведзена шмат помнікаў першаму прэзідэнту. Рашэнне аб змяненні словаў нацыянальнага гімна было прынятае пасля шматлікіх зваротаў ад грамадзянаў краіны.

■ Паводле статыстыкі, розніца працягласці жыцця жанчын і мужчын у Літве — самая высокая сярод краін ЕС. Літоўскія мужчыны жывуць у сярэднім 65 гадоў, што на 12 гадоў менш, чым літоўскія жанчыны.

■ Знакаміты брытанскі выдавецкі дом Penguin перавыдаў дапаможнік 1941 года па вырошчванні на прысядзібных участках і ў кватэрах курэй і трусоў, каб дапамагчы брытанцам справіцца з сусветным крызісам. Кніга дапамагла галадаючым перажыць вайну, таму, лічаць выдаўцы, вопыт тых гадоў не зашкодзіць. У кнізе на 170 старонак расказваецца, як выкарыстоўваць рэшткі ежы для выкормлівання дробнай жывёлы, як падтрымліваць здароўе гадаванцаў, а таксама як разбіраць вырашчаную прадукцыю. Асаблівую ўвагу аўтары раяць звярнуць на трусоў. Кніга карыстаецца вялізным попытам, які ўсё ўзрастае.

■ Згодна з даследаваннямі амерыканскіх навукоўцаў, адчуванне шчасця можна заразіціца. Вучоныя сцвярджаюць: чалавек тым больш шчаслівы, чым большая колькасць шчаслівых людзей знаходзіцца побач з ім. Такія звесткі былі атрыманыя ў ходзе 60-гадовага даследавання, у якім узялі ўдзел 4700 чалавек. За імі вяліся назіранні з 1948 года, калі яны былі яшчэ дзецьмі. Затым кожнаму ўдзельніку было прапанавана прайсці тэст на вызначэнне стану шчасця. Выявілася, што людзі з вялікай колькасцю сацыяльных сувязяў (сябры, суседзі, радня) былі найбольш шчаслівымі. Таксама меў значэнне і стан задаволенасці такім акружэннем — кожны становіцца настроены чалавек, задаволены сваім жыццём, робіць нас больш шчаслівым. Пры гэтым шчасце дзейнічае, як інфекцыя, заражаючы тых, хто побач, пазітыўным светаадчуваннем. І наадварот: чым больш навокал незадаволеных людзей, тым горш і для вашай задаволенасці жыццём. Але адметна, што няшчасце не такое заразлівае, як шчасце.

Поўны абзац

■ 20-гадовая жыхарка Кітая была дастаўленая ў бальніцу з лопнутай барабаннай перапонкай у выніку аглушальнага гарачага пацалунку свайго каханага. У выніку дзяўчына поўнасцю аглухла на левае вуха. Па словах медыкаў, лячэнне ад наступстваў такога гарачага пацалунку зойме каля двух месяцаў. Гэты інцыдэнт падштурхнуў мясцовыя СМІ на ідэю апублікавання правілаў перасцярогі падчас пацалункаў.

■ На шматмесячную судовую спрэчку па доказу неправамоцнасці накладання штрафу ў 115 долараў за няправільную паркоўку пенсіянер з Нью-Ёрку патраціў ужо 7500 долараў. У 2006 годзе ён быў аштрафаваны за тое, што яго машына быццам бы перакрыла пад'езд да пажарнага гідранта. З той пары з-за пеняў сума штрафаў вырасла да 200 долараў, а судовыя выдаткі склалі 7300 долараў.

■ Жыхар горада Окленд у Новай Зеландыі выйграў у латарэю $4,2 млн, купіўшы білет пасля тыднёвага няцця сваёй жонкі. Напярэдадні жонка пілавала яго цэлы тыдзень, каб ён купіў ёй латарэйку. Праходзячы паўз шапік з надпісам «Лато», ён узгадаў пра просьбу жонкі і купіў білет за дзве хвіліны да спынення яе продажу. Назаўтра, зноў жа па просьбе жонкі, ён пайшоў у краму, каб купіць каўбасы. Грошай не хапіла, і мужчына вырашыў праверыць латарэйку. У выніку высветлілася, што ён выйграў астранамічную для сям'і суму — у іх якраз нядаўна нарадзілася дзіця і грошай хранічна не хапала.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛІДАРЫ ДЗЯРЖАЎ ПАЯСЫ НЕ ЗАЦЯГНУЦЬ?

Самым высокааплатным кіраўніком дзяржавы на сёння з'яўляецца прэм'ер-міністр Сінгапура Лі Сянь Лун, гадавы прыбытак якога ў залежнасці ад памеру дадатковых выплат можа вагацца ад 2 млн да 2,5 млн долараў, сцвярджае амерыканская кансалтынгавая кампанія Hay Group.

Увогуле, сінгапурскія чыноўнікі атрымліваюць самыя высокія ў свеце зарплаты — гэта тлумачыцца жаданнем выкараніць карупцыю і зрабіць дзяржслужбу прывабнай для таленавітых маладых людзей. Але ў наступным годзе бюджэт прэм'ера скароціцца прыкладна на 20 працэнтаў — так казна вырашыла адрэагаваць на бушуючы фінансавы крызіс.

Наступны пасля Сянь Лун — прэзідэнт ЗША, які зарабляе штогод 400 тыс. долараў. Калі ж улічыць усе выплаты, то ў год гаспадару Белага дома набягае 596 тыс. долараў.

Не нашмат менш атрымлівае канцлер ФРГ Анхела Меркель — яе гадавы прыбытак пасля выліку падаткаў складае 242 тыс. еўра. Крыху менш, прыкладна 231 тыс. еўра ў год, атрымлівае прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі. Трэцім у кампаніі лідараў краін ЕС апынуўся прэм'ер Брытаніі Гордан Браун, на банкаўскі рахунак якога з казны штогод паступае 187 тыс. фунтаў стэрлінгаў (216 тыс. еўра). Пасля выліку падаткаў заробкі Дзмітрыя Мядзведзева (7800 долараў.) і Уладзіміра Пуціна (6200 долараў.) моцна саступаюць не толькі прыбыткам іх калег з G-8, але і значнай часткі прадпрымальніцкага корпуса Расіі. Аднак на фоне шэрагу кіраўнікоў іншых краін СНД расійскае кіраўніцтва забяспечана нядрэнна: паводле Hay Group, менш атрымліваюць лідары Украіны, Беларусі і Малдовы.

У ЛІТВЕ АМЕРЫКАНСКІ САЛДАТ УРЭЗАЎСЯ Ў ПАХАВАЛЬНУЮ ПРАЦЭСІЮ



У Літве на аўтатрасе Вільнюс—Панявежыс адбылася аварыя: амерыканскі салдат урэзаўся ў пахавальную працэсію.

Паведамляецца, што ён з'яўляецца вайскоўцам сілаў НАТА. У выніку аварыі, па папярэдніх звестках, загінуў адзін удзельнік працэсіі, яшчэ адзін быў паранены.

РАСІЯ ЗНОЎ ЛІДАР ГОДА ПА ЎЗРОЎНІ КАРУПЦЫІ СЯРОД КРАІН-ЭКСПАРЦЁРАЎ

Расійскія бізнэс-структуры ізноў апынуліся лідарамі па ўзроўні карупцыі сярод 22 вядучых сусветных дзяржаў-экспарцёраў, паводле апублікаванага 9 снежня, у Міжнародны дзень барацьбы з карупцыяй, даклада няўрадавай арганізацыі Transparency International.

Найвышэйшыя месцы ў 2008 з паказчыкамі 8,8 з 10 магчымых балаў занялі Бельгія і Канада, трэцяе месца з аднакай у 8,7 бала — Нідэрланды. Замыкаюць спіс з найменшымі баламі Індыя (6,8), Мексіка (6,6), Кітай (6,5) і Расія. Індэкс быў заснаваны на апытанні 2742 кіраўнікоў буйных кампаній.

ЛАТВІІ БЕЗ МІЖНАРОДНАГА ФІНАНСАВАННЯ Ў НАСТУПНЫМ ГОДЗЕ ПАГРАЖАЕ ДЭФОЛТ

Мінфін Латвіі заяўляе аб магчымасці дэфолту ў краіне ў першым паўгоддзі 2009 года, калі рэспубліцы не атрымаецца прыцягнуць міжнароднае фінансаванне.

У 2009 годзе МВФ прагназуе паніжэнне ВУП Латвіі на 6 працэнтаў, паводле прагнозаў латвійскага ўрада, падзенне ВУП у наступным годзе дасягне 4,3 працэнта. У сваю чаргу, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця лічыць, што ВУП краіны ў 2009 годзе скароціцца на 0,9 працэнта, і гэта будзе найбольш слабым паказчыкам сярод краін Усходняй Еўропы і былога савецкага блока.

ПЕНСІЯНЕРКА ВЫЙГРАЛА СУД СУПРАЦЬ ПАСОЛЬСТВА РФ

Пенсіянерка Вера Часнакова, якая пражывае ў Рызе, выйграла суд супраць расійскага пасольства, паведамляе Mixnews.lv.

Суд абавязаў пасольства выплаціць кампенсацыю за тое, што яго супрацоўнік, які здымаў некалькі гадоў таму кватэру ў Часнаковай, забрудзіў памяшканне і паламаў мэблю.

У АБАРОЦЕ — УСПЛЁСК ФАЛЬШЫВАК

Напярэдадні навагодніх святаў назіраецца павелічэнне фактаў канфіскацыі з абароту падробленых банкнот. У першую чаргу, гаворка ідзе пра банкноты нацыянальнай валюты. Вось і ў гэтым месяцы ўжо ўдалося папярэдзіць паступленне ў грашовы зварот 160 падробленых банкнот наміналам 10 і 20 тысяч рублёў. Аднак найчасцей падробкі беларускіх рублёў выяўляюцца падчас інкасацыі грашовых сродкаў з гандлёвых арганізацый.

Органы аховы правапарадку заклікаюць насельніцтва быць уважлівым. Але з другога боку, як быць уважлівым, калі ў Гомельскай вобласці, напрыклад, былі выяўлены фальшывыя банкноты наміналам 200 еўра высокай якасці? Выявіць такія падробкі здольныя толькі спецыялісты. Прычым тут абывацельская ўважлівасць? Правільна, ні пры чым. Галоўнае — набываць валюту толькі ў афіцыйных пунктах абмену валют.

Зараз ва ўсіх рэгіёнах краіны назіраецца нязначнае перавышэнне скупкі замежных грошай у параўнанні са здачай у абменныя пункты. Бягучы попыт на тыя ж долары-еўра вырас дзесьці на 30 працэнтаў у параўнанні з вераснем. Паколькі абмежаванні на суму, якая можа быць рэалізавана кліенту, адсутнічаюць, то магчымы выпадкі, калі запас грошай у канкрэтным пункце продажу скончыцца. Гэтыя прычыны і справакавалі ажыўленне дзейнасці даўно забытых намі валютчыкаў.

Паводле слоў начальніка аддзела процідзеяння эканамічным злачынствам у крэдытна-фінансавай галіне галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрыя ХАНЦЭВІЧА, у лістападзе—снежні складзена 98 адміністрацыйных пратаколаў за парушэнні правілаў ажыццяўлення валютных аперацый. У валютчыкаў адабрана 68 тысяч долараў ЗША, 9 тысяч еўра, 353 тысячы расійскіх і 120 мільёнаў беларускіх рублёў, 1900 літ і 1800 грыўняў.

Як правіла, валютчыкі не ажыццяўляюць незаконныя валютныя аперацыі паблізу банкаўскіх абменных пунктаў і прадпрыемстваў гандлю. У асноўным яны маюць дачыненне да досыць вялікіх сумаў грошай і адпаведных кліентаў. У Гомельскай вобласці, напрыклад, затрыманы 46-гадовы мужчына, у якога адабрана 7 тысяч еўра, 12 мільёнаў беларускіх і 47 тысяч расійскіх рублёў. У Мінску падчас незаконнай здзелкі затрыманы 37-гадовы непрацуючы мінчанін, які набыў каля 3 тысяч долараў ва ўраджэнца Азербайджана. Падчас догляду ў «гандляра» і «пакупніка» было канфіскавана 28 тысяч долараў і звыш 6 мільёнаў беларускіх рублёў. Літаральна на мінулым тыдні ў Віцебску валютчык падчас затрымання наехаў на сваім аўтамабілі на супрацоўніка міліцыі. Зламыснік ўдалося затрымаць. Ім аказаўся непрацуючы 36-гадовы мясцовы жыхар, у якога канфіскавана 10 тысяч долараў і каля 22 мільёнаў беларускіх рублёў. На бягучы момант здароўю пацярпелага афіцэра нічога не пагражае.

Міністэрства ўнутраных спраў нагадвае, што парушэнне парадку правядзення валютных аперацый караецца штрафам у памеры да 10 мільёнаў рублёў з канфіскацыяй прадмета здзелкі. Указваецца і на тое, што пад выглядам валютчыкаў нярэдка дзейнічаюць махляры, якія ў працэсе абмену грашовых сродкаў збываюць грамадзянам фальшывыя грошы.

За апошнія пяць гадоў супрацоўнікі органаў унутраных спраў выявілі звыш 12 тысяч фактаў фальшывамanецтва. Сёлета зарэгістравана каля 1650 фактаў вырабу і збыту фальшывых банкнот. Падробкі больш-менш высокай якасці трапляюць у нашу краіну з-за мяжы. А нашы студэнты і школьнікі любяць капіраваць нацыянальную валюту з дапамогай прынтараў. Такія фальшыўкі маюць нізкую якасць, лёгка выяўляюцца візуальна і складаюць 90-95 працэнтаў ад падробленай беларускай валюты. Дарэчы, усе факты вырабу і збыту падробленых беларускіх рублёў раскрываюцца.

Другую групу валютчыкаў можна аднесці да прафесіяналаў, якія займаюцца вытворчасцю высакаякасных падробак замежнай валюты ў складзе міжнародных арганізаваных злачынных груп. Іх «прадукцыя» вырабляецца на прафесійным паліграфічным абсталяванні і адрозніць яе ад сапраўдных банкнот абывацелю практычна немагчыма.

Найбольшую цікавасць у прафесійных фальшываманетчыкаў выклікаюць амерыканскія 100-доларавыя купюры. У асноўным яны завозяцца на тэрыторыю нашай краіны асобамі, якія і не падазраюць аб падробцы. У 80 працэнтах выпадкаў яны выяўляюцца ў пунктах абмену валют.

Сёлета амаль у два разы павялічылася колькасць канфіскацыі падробленых грашовых знакаў Еўрасаюза. Найбольшую распаўсюджанасць атрымалі фальшывыя банкноты наміналам 50, 100 і 200 еўра. Амаль у два разы выраслі і колькасць расійскіх рублёў наміналам — 1 тысяча.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Уважаемые акционеры ОАО «Жабинковский сахарный завод»

19 декабря 2008 года

состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Жабинковский сахарный завод», расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина. Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О согласовании благотворительной (спонсорской) помощи.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник — пятница) начиная с 9 декабря 2008 г. по 18 декабря 2008 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 19 декабря 2008 г. — по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 19 декабря 2008 года в 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 9 декабря 2008 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 200037600

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Засульского сельисполкома Столбцовского района

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Засулье, ул. Социалистическая, д. 33, кадастровый номер 625482003601000210, площадь участка 0,2336 га, начальная цена – 260 730 рублей, задаток – 26 000 рублей, в непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, в сумме – 1 236 360 рублей. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.01.2009 г.** до 16.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Коллектив КУП «Минский областной центр учета недвижимости» выражает глубокие соболезнования сотруднику газеты «Звязда» ПОЗДНЯКОВУ Виктору Анатольевичу в связи со смертью самого дорогого человека — МАТЕРИ.

Былыя вучні Дараганаўскай сярэдняй школы Асіповіцкага раёна смуткуюць з прычыны смерці былой настаўніцы Ніны Антонаўны АРЛОВАЙ і выказваюць спачуванне сям'і нябожчыцы.

Парламенцкі дзённік

Невыпадковыя місіянеры

Прыток іншаземных святароў у Беларусь пільна кантралюецца

Рэлігія можа служыць збавенню і супакаенню, а можа стаць небяспечнай зброяй. Канфесійную сітуацыю ў Беларусі абмяркоўвалі ўчора на пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ. Недахоп каталіцкіх святароў-беларусаў — сёння адна з найбольш актуальных праблем у рэлігійнай сферы краіны. Навучанне ў адпаведных духоўных семінарыях (такіх у краіне дзве) доўжыцца шэсць гадоў, і працэс папаўнення кадраў рымска-каталіцкага кліру ідзе даволі марудна. «Даводзіцца запрашаць замежных грамадзян, на сёння гэта пераважна палякі», — паведаміла падчас пасяджэння Марына Цвілік, начальнік аддзела па справах рэлігій апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Сярод запрошаных святароў ёсць такія, што «ў недастатковай ступені валодаюць дзяржаўнымі мовамі, з'яўляюцца носьбітамі трохі іншай ментальнасці і — мы гаворым не пра ўсіх — не заўсёды праяўляюць разуменне да тых працэсаў, якія адбываюцца ў краіне». «Епархіі ў многім ідуць нам (апарату Упаўнаважанага — **Аўт.**) насустрач і ўсё ж такі актывізуюць дзейнасць па падрыхтоўцы кадраў унутры краіны».

Увогуле прыток замежных святароў у Беларусь кантралюецца дзяржавай. Прыезд іншаземных багасловаў узгадняецца з апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Таму сёння няма таго «бескантрольнага валу місіянераў, які быў у 1990-х гадах». Тыя патрабаванні, што прад'яўляе беларускае заканадаўства ў гэтай сферы, на думку Марыны Цвілік, сябе апраўдалі. «У нас працуюць кваліфікаваныя спецыялісты, а не выпадковыя гіпнатызёры, якія здольныя зал паваліць», — адзначыла спецыяліст.

Сучасная рэлігійная сітуацыя ў Беларусі застаецца кіруемай, устойлівай і прагназуемай. У краіне не фіксуецца выражаных канфесійных супярэчнасцяў. У адпаведнасці з вынікамі апошняга сацыялагічнага апытання праваслаўнымі лічаць сябе больш як 80 працэнтаў вернікаў, каталікамі — амаль 12 працэнтаў. Пазітыўна развіваюцца працэсы ў іудзейскіх і мусульманскіх аб'яднаннях.

Даволі распаўсюджаныя ў Беларусі пратэстанцкія плыні. У асобных раёнах краіны яны існуюць з пачатку мінулага стагоддзя. А вось крышнаіты ў нашай краіне не прыжыліся. Інтарэс да гэтай плыні ўзнікаў у асобных грамадзян у пару сацыяльнай нестабільнасці і быў прадыктаваны выключна цягай да «экзотыкі». Пры захаванні інтарэсу да ўсходняй культуры ўвогуле, істотнай падтрымкі ў іх няма. У імкненні падтрымаць міжканфесійную згоду адказныя структуры не перашкадж

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 снежня 2008 г. № 47 (150)

ЧАРКА «ВЫМЫВАЕ» КАДРЫ

П'янства ў вёсцы застаецца надзвычай вострай праблемай

Цяпер філіял «Купава-агра» — адзін з прызнаных лідараў сельскагаспадарчай вытворчасці ў Бярэзінскім раёне. Змены да лепшага адбыліся тут за апошнія чатыры гады, на працягу якіх гаспадарка з'яўляецца структурным падраздзяленнем сталічнага завода аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-Купава».

Першае, з чаго пачыналі інвестары, — навядзенне належнай дысцыпліны. Прычым даволі жорсткімі метадамі: давялося звольніць многіх, хто цесна «сябраваў» з чаркай. Цяпер заключана доўгатэрміновая дамова з медыцынскай установай — спецыялісты правяраюць работнікаў сельгаспрадпрыемства на ўтрыманне алкаголю. Аднак далёка не ўсіх нават такія меры стрымліваюць...

Як знайсці спецыяліста?

Неабходнасць абнаўлення калектыву — сітуацыя, з якой у свой час сутыкнулася большасць інвестараў. Паколькі з тымі кадрамі, якія засталіся «ў спадчыну», палепшыць становішча гаспадарак-банкрутаў было проста немагчыма. Не стала тут выключэннем і «Купава-агра». Васіль Траццякоў, які ўзначаліў рэфармаваную гаспадарку, па сутнасці стаў самым сапраўдным антыкрызісным менеджарам. Але з кім давялося падымаць «аўтсайдара»?

— Меры па навядзенні парадку на вытворчасці, якія прымаліся і прымаюцца, дазволілі палепшыць становішча, — заўважае кіраўнік «Купавы-агра». — Мы проста не трымаем людзей, якія парушаюць працоўную дысцыпліну. А як інакш? Удалося больш-менш укамплектаваць калектыў, аднак і сёння ў шэрагу выпадкаў застаюцца нявырашанымі пытанні па якасці кадраў.

Сучасная сельскагаспадарчая вытворчасць даволі складаная па тэхналогіі. Таму ледзьве не з кожным годам павялічваюцца патрабаванні да спецыялістаў, прычым на ўсіх узроўнях. Пасля рэфармавання гаспадарцы ўдалося значна абнавіць тэхпарк, аднак добрых механізатараў не хапае. Як заўважыў Васіль Траццякоў, застаецца адчувальны дэфіцыт па кадрах масавых прафесій. Не ўсе тыя, хто прыходзіць уладкоўвацца ў «Купаву-агра», адпавядаюць патрабаванням, што прад'яўляюцца да работнікаў. І наймальніка тут можна зразумець: далёка не кожнаму можна даверыць складаную сельскагаспадарчую тэхніку, якая каштуе вельмі шмат.

Таму падчас адбору патрэбных спецыялістаў нельга памыліцца. Такія «недарэчнасці» могуць прывесці да збояў у вытворчым працэсе і, як вынік, — да змяншэння аб'ёмаў, пагаршэння эканамічных паказчыкаў і г.д. Усё гэта добра разумеюць у філіяле «Купава-агра»: нават ва ўмовах вострага недахопу тых жа механізатараў набор адбываецца на конкурснай аснове. Адразу праводзіцца своеасаблівая «праверка на якасць», калі кандыдат пацвярджае сваё прафесійнае майстэрства. І толькі пасля такога «тэставання», а таксама выпрабавальнага тэрміну чалавек можа лічыцца паўнаважкім членам калектыву гаспадаркі. Далёка не ўсе вытрымліваюць напружаны рытм і даволі жорсткія патрабаванні да працоўнай дысцыпліны. Як з горыччу заўважыў Васіль Траццякоў, парушальнікаў даводзіцца звальняць, а іх месца пэўны час застаецца вакантным.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ!

НЕДАРМАВАЯ КАМУНАЛКА!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Магілёўскі мікрараён «Задняпроўе». Увечары каля адной са шматпавярховак збіраецца кампанія: мужчыны ў спяцоўках — электрыкі і сантэхнікі, інтэлігентныя жанчыны — супрацоўніцы разлікова-касавага цэнтра № 5. Разам яны накіроўваюцца праз двары да дома № 72 а па вуліцы Шміта — менавіта тут жыве шмат даўжнікоў па аплаце за камунальныя паслугі.

У дзверы адной з кватэр спецыялісту па камунальных разліках Ларысе Дзямідавай даводзіцца грукаць рукамі — электрычнасць тут даўно адключылі. Дзверы ўрэшце адчыняе хмурная маладая жанчына, якая кліча маці. «Калі будзем плаціць?» — строга пытаецца Ларыса. Запазычанасць складае 2 мільёны рублёў. Маці паводле судовага рашэння аддае з пенсіі 50 тысяч рублёў штомесяц, а дачка не працуе. Жанчыны звыкла скардзяцца на цяжкае жыццё і безграшоўе, але пакорна пагаджаюцца з адключэннем гарачай вады.

У іншай кватэры сям'я запазычыла такую ж суму, але адключыць ім святло і газ ніхто не можа: суседзі па «камуналцы» спраўна плацяць за сваю плошчу і паслугі, і пазбаўляць іх гарачай вады, газу і электрычнасці было б несправядліва. Тым больш, што ў сям'і неплацельшчыкаў — дзве маленькія дзяўчынкі, унучкі кватэранаймальніцы. Гісторыя сумная: адна дачка за кратамі, другая не працуе, а сама жанчына стала інвалідам у выніку няшчаснага выпадку на вытворчасці. Яна плануе пры атрыманні пенсіі вярнуць «тысяч 200 рублёў», але работнікі РКЦ не вельмі радуюцца абяцанкам.

— Вам запазычанасць ніхто не спіша! — папярэджвае намеснік начальніка РКЦ № 5 Таццяна Касірава. — Так што думайце, як разлічыцца!

Размовы з даўжнікамі вядуць жанчыны, а слесары і электрыкі займаюць месца ў ар'егардзе працэсіі. Мужчыны жартуюць: маўляў, вопытныя мы — ведаем, што гаспадары кватэры могуць праклён наслаць альбо пачаць махаць кулакамі.

— Чаго тут толькі ні здараецца! — пацвярджае Ларыса Дзямідава. — Буйныя даўжнікі мне аднойчы куртку парвалі, яйкамі кідаліся, а нашага электрыка піхнулі ў шчыток. У гэтым і суседніх дамах ёсць жыхары, якія запазычылі больш за 3 мільёны рублёў. Яны не працуюць, часта п'янствуюць, прыкрываюцца малымі дзецьмі... І што з такімі рабіць?

Часта хадзіць па кватэрах неплацельшчыкаў даводзіцца з міліцыяй, якая добра ведае «адмысловы кантынгент». Хоць, калі дзверы папросту не адчыняюць, праваахоўнікі не могуць дапамагчы камунальнікам увайсці на прыватную тэрыторыю грамадзян.

Супрацоўніца Цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм Кацярына Дзівакова — маладая мініяцюрная жанчына. Яна — вопытны спецыяліст па працы з даўжнікамі, настойлівы і ўпарты чалавек.

— Трэба з кожным чалавекам імкнуцца знайсці агульную мову, — лічыць Кацярына. — Бываюць і складаныя сітуацыі: напрыклад, у 2-пакаёвай кватэры жыве маці-адзіночка з чатырма малымі. Частку доўгу (у некалькі мільёнаў) яна гасіла толькі безнаяўнымі субсідыямі, бо даходаў няма. Мне гэтую жанчыну, якая трапіла ў складаную жыццёвую сітуацыю, па-чалавечы шкада. Але і ёй давялося адключыць гарачую воду. А ёсць пітушныя, з якімі размаўляць увогуле немагчыма. Апошнім разам пагражалі рыдлёўкай. Але гэта мая праца, і трэба быць гатовай да ўсяго.

Адключэнні гарачай вады і электрычнасці адбываюцца практычна штодня. Сума запазычанасці для такіх дзеянняў можа і не дасягаць мільённых вышыняў. Для таго, каб жыхарамі кватэры зацікавіліся ў РКЦ, дастаткова не заплаціць за два месяцы. Спачатку проста патэлефануюць і нагадаюць. Потым прыйдуць і папярэдзяць. Праз пяць месяцаў няплаты злосным парушальнікам адключаць камунальныя паслугі. Калі і гэта не дапамагае, то апошнія прыступкі — гэта суд і высяленне. Літаральна за паўгода можна пазбавіцца свайго жылля.

— Сёлета ў горадзе Магілёве выселена 5 сем'яў, летась — 3, — паведаміў дырэктар Цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм Аляксандр Селязнёў. — І яшчэ больш за 60 сем'яў стаяць у чарзе на высяленне. Як правіла, гэтыя людзі вядуць асацыяльны лад жыцця і ніякія ўгаворы на іх не дзейнічаюць. Іх перасяляюць далёка не ў камфортныя месцы: альбо ў старыя дамы з прыбіральняй на вуліцы, альбо ў пакоі ў інтэрнаце з агульным душам на паверсе.

Сёння ў Магілёве налічваецца 2237 сем'яў чалавек (спецыялісты гавораць — асабовых рахункаў), якія маюць агульную запазычанасць у 1 мільярд 784 мільёны рублёў. У цэнтры адзначаюць, што ў маштабах горада гэта не самая вялікая сума — штомесячныя налічэнні за камунальныя паслугі складаюць пад 7 мільярдаў рублёў. Але за гэтыя грошы можна зрабіць новыя дахі для дзясятка дамоў. Таму ў цэнтры робяць выснову: «Добрасумленныя плацельшчыкі пакутуюць ад даўжнікоў».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

АБ'ЕКТ ЗАКАНСЕРВАВАЦЬ? А ЯК ЖА ДЗЕЦІ?

Артыкул «Адваротны бок галоўнага стадыёна», апублікаваны ў № 38 за 8 верасня гэтага года (аб незавершаным добраўпарадкаванні тэрыторыі, якая прылягае да Віцебскага цэнтральнага спартыўнага комплексу), узрушыў работнікаў гэтай установы. Матэрыял быў абмеркаваны на пасяджэнні працоўнага калектыву. Аб выніках гэтага абмеркавання паведамляецца ў лісце, падпісаным дырэктарам Віцебскага ЦСК А.П. Сакаловым і іншымі работнікамі ўстановы.

«У сваім крытычным матэрыяле аўтар (А. Пукшанскі. — **Рэд.**) зрабіў акцэнт на ненależным добраўпарадкаванні прылеглай да ЦСК тэрыторыі. Прычым з сэнсу артыкула для чытача становіцца зразумела, што менавіта работнікі комплексу неналежна выконваюць свае абавязкі. Але гэта не так.

Будаўнічыя работы на стадыёне, які, дарэчы, афіцыйна не ўведзены ў эксплуатацыю, працягваюцца. Ідзе ўзвядзенне запаснога футбольнага поля, ролікадрома, рэканструкцыя залы бокса. Натуральна, пры такіх умовах нейкіх нязручнасцяў не пазбегнуць. Тым не менш рабіць упор на тое, што ЦСК не адпавядае міжнародным патрабаванням, па меншай меры некарэктна. І лепшым таму пацвярджэннем служыць атэстацыя стадыёна дэлегатамі УЕФА для правядзення міжнародных матчаў самага высокага ўзроўню. У нас у горадзе праводзіліся футбольныя матчы з удзелам нацыянальнай і моладзевай зборнай Беларусі. Прычым за іх арганізацыю ў адрас ЦСК паступіла падзяка ад прэзідэнта УЕФА Мішэля Платіні. Калі неадпаведнасць патрабаванням ёсць, то хіба такое магчыма? У спарткомплексе пастаянна праводзяцца міжнародныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па скачках на батуце, валейболе, баскетболе, футболе, лёгкай атлетыцы. І водгукі гасцей самыя высокія. Гэта лёгка можна праверыць, звярнуўшыся ў адпаведныя рэспубліканскія федэрацыі. Гэтыя словы пацвярджае і той факт, што тры гады запар ЦСК выходзіць пераможцам конкурсу, які праводзіцца пад эгідай Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, а таксама па выніках 2007 г. наша ўстанова занесена на абласную Дошку гонару.

У дачыненні да будаўніцтва адзначым, што комплекс пастаянна развіваецца, уводзяцца ў строй яго пускавыя комплексы. За мінулы час зроблена вельмі шмат. Узведзены стадыён для доўгіх лёгкаатлетычных кіданняў, сектары для скачкоў, пабудаваны штучны газон з падагрэвам, футбольнае запасное поле. Усё гэта робіцца для прыхільнікаў здаровага ладу жыцця, нашых дзяцей. Няўжо трэба закансерваваць аб'ект, а спартыўную інфраструктуру горада не развіваць? А як жа тады нашы дзеці, іх спартыўная будучыня? Бо ў Віцебску пастаянна расце лік прыхільнікаў актыўнага адпачынку. Пры ўсім гэтым мы часта кіруемся эканоміяй сродкаў. Так, не завяршыўшы рэканструкцыю той жа залы бокса, мы можам паставіць новыя дзверы, але ў што яны ператворацца за час будаўніцтва? Тады навошта набываць зноў новыя? Тое ж самае можна сказаць пра тры драўляныя дамы, размешчаныя побач з комплексам. Для іх зносу неабходна выдзеліць значныя сродкі і прадаставіць узамен шэсць кватэр.

Публікацыя нанесла ўрон іміджу ЦСК, перакрэсліла шматгадовую станоўчую работу калектыву стадыёна, нашкодзіла іх дзелавой рэпутацыі, некаторыя факты і выказванні тэндэнцыйныя.

Ствараецца ўражанне, што журналіст не валодае па сутнасці пытаннем, якое асвятляе.

З улікам выкладзенага, просім апублікаваць нашу думку на старонках газеты.

Дырэктар ДУ «Віцебскі цэнтральны спартыўны комплекс» А.П. САКАЛОЎ. Работнікі дзяржаўнай установы фізічнай культуры і спорту «Віцебскі цэнтральны спартыўны комплекс» (усяго 80 подпісаў).

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Калектыў Віцебскага «ЦСК» выказаў свае думкі наконт крытыкі, што прагучала ў артыкуле. Але, на жаль, з вырашэннем праблем добраўпарадкавання тэрыторыі ля віцебскага цэнтральнага спартыўнага комплексу па-ранейшаму не ўсё зразумела. Па каментарый я звярнуўся да выконваючага абавязкі начальніка аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Віцебскага гарвыканкама Вячаслава НЕДАСЕКАВА.

— Калі адзін чытач узняў праблему добраўпарадкавання вакол комплексу, безумоўна, гэта не значыць, што толькі ён і потым яшчэ карэспандэнт, як кажуць «знайшлі праблему». Ураджанні пасля наведвання тэрыторыі вакол комплексу і былі выказаны ў публікацыі. Можа, гэта і ўласныя, «суб'ектыўныя» думкі — як здалося незададоленым членам калектыву ЦСК. Але шмат гараджан, з якімі я гутарыў, якія часта бывалі каля ЦСК, скардзіліся таксама на будаўнічы бруд і іншыя недахопы, што літаральна кідаюцца ў вочы. І балельшчыкі, што хадзілі на матчы, выказвалі мне ў прыватных размовах крытычныя заўвагі.

— Зразумейце, і хай гэта ведаюць усе тыя, пра каго вы гаворыце — пакуль працягваецца рэканструкцыя (будаўніцтва) комплексу, нейкіх праблем не пазбегнуць... На базе былога стадыёна «Дынама» будаўніцтва комплексу пачалося ў 1998 годзе.

— І ўжо, выходзіць, прайшло 10 гадоў. А калі ўсё ж рэканструкцыя будзе завершана канчаткова?

— Усё залежыць ад фінансавання. Аб'ём работ вялікі, як і сумы грошай, неабходных для завяршэння ўсяго, што задумана. У прыватнасці, вядзецца праектаванне паўночных трыбун. Але хочацца адзначыць, што кожны год на працяг работ выдзяляецца каля 2 мільярдаў беларускіх рублёў.

— Выходзіць, УЕФА дало дазвол на правядзенне футбольных матчаў фактычна на незавершаным спартыўным аб'екце?

— Вось дакументальнае пацвярджэнне. У верасні 2005 года інспекцыя УЕФА дала заключэнне, што віцебскі ЦСК адпавядае крытэрыям ацэнкі УЕФА па дапушчальным мінімуме патрабаванняў для правядзення матчаў другога рангу...

— Атрымліваецца, гэта датычыцца менавіта футбольнага поля?

— УЕФА мае свае крытэрыі. Трыбуны футбольнага поля, як вы гэта назвалі, адначасова могуць умясціць 8100 гледачоў. Адпавядае міжнародным стандартам сучаснае пакрыццё...

— А табло, што не функцыянавала, аднавілі?

— Табло не функцыянавала толькі адну гульню. Фірма-пастаўшчык гэтага абсталявання была абавязана па гарантыі зрабіць усе неабходныя работы. І цяпер табло працуе.

— І зноў пра ўражанні людзей, далёкіх ад нюансаў акрэдытацыі УЕФА. Калі ўжо працягваецца будаўніцтва ЦСК, чаму нідзе няма адпаведных шыльдачак, што можна ўбачыць побач, бадай, з усімі аб'ектамі ў краіне, якія рэканструююцца, будуюцца?

— Безумоўна, гэтая заўвага слушная. Але шыльду (або пашпарт аб'екта) абавязаны ўстанавіць забудоўшчык. Як гэта робіцца звычайна пры будаўніцтве і рэканструкцыі.

— А той жа гадзіннік у выглядзе мяча? Яго плануюць прывесці ў парадак?

— Замест гадзінніка ўстаноўлена эмблема ЦСК з падсветкай, якая больш адпавядае архітэктурнаму абліччу комплексу...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЗЕНЬ САВЕТА

НА ШТО ЗДАТНЫ ПЯРВІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Бяларучскі сельсавет Лагойскага раёна мае сваю спецыфіку. Мясцовых жыхароў тут не так і шмат (947 чалавек у 18 населеных пунктах), аднак з-за блізкасці сталіцы ён вельмі прываблівае дачнікаў. Самы відавочны плюс месцаразмяшчэння Бяларучскага сельсавета — высокі попыт на зямельныя ўчасткі, што дае сельвыканкаму добры шанц папоўніць бюджэт.

На што расходуюцца зароблены грошы? Як у такім спецыфічным сельсавеце вядзецца добраўпарадкаванне і работа па рэалізацыі Указа № 21? На гэтыя і шматлікія іншыя пытанні сваім калегам расказвала старшыня Бяларучскага сельвыканкама Таіса Лявончык падчас выязнога Дня Савета, які прайшоў на гэтай тэрыторыі.

Спачатку госці наведалі найбольш значныя аб'екты сацыяльнай галіны, многім з якіх дапамог сельвыканкам. У тым ліку Сямкоўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы садок-школа, якому летась сельскі Савет выдаткаваў 80 мільёнаў на рамонт даху і на аднаўленне прышкольнага мемарыяла загінулым воінам; а таксама базавую школу імя Янкі Купалы ў Бяларучах, якая змагла правесці рамонт, дзякуючы падтрымцы сельвыканкама. Уразіў старшынь сельскіх Саветаў Лагойшчыны будынак бяларускага ФАПа, на рамонт якога Таіса Анатольеўна і яе дэпутацкі корпус выдаткавалі 58 мільёнаў. Амаль столькі ж пайшло на вонкавы рамонт сельскага Дома культуры ў Бяларучах. Заслугоўвалі ўвагі і мясцовыя могілкі, якія таксама былі прыведзены ў парадак за сродкі сельсавета. Бюджэт Бяларускага сельвыканкама на 2008 год склаў 69 мільёнаў рублёў, памер датацыі — 3 мільёны. Ільвіную долю ў фарміраванні даходаў склалі паступленні ад прыватызацыі зямельных участкаў. За гэты год на аўкцыёнах сельвыканкам зарабіў 653 мільёны рублёў. 191 мільён пайшоў на бягучы рамонт аб'ектаў сацыяльнай галіны, 138 мільёнаў перадалі на падтрымку ўстаноў культуры, 201 мільён расходавалі на рамонт будынка сельскага Савета.

Падчас экскурсіі па тэрыторыі старшыня Лагойскага раённага Савета дэпутатаў, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Свеце Рэспублікі Іван Карповіч звярнуў увагу на адсутнасць на вуліцах бытавога смецця, што нярэдка яшчэ сустракаецца ў асобных сельсаветах Лагойшчыны. Таіса Антонаўна патлумачыла, што тут значную падтрымку аказваюць мясцовыя школы, пры якіх створаны «Зялёныя патрулі». Раз у месяц дзеці праходзяць па населеных пунктах з аднаразовымі пакетамі і збіраюць дробнае смецце.

* * *

Выступаючы ў ролі экскурсавода, Таіса Антонаўна не магла абмінуць увагай аб'ект, які ўжо сёння, пакуль будаўніцтва яшчэ не завершана, прыцягвае да сябе шмат увагі, а пасля здачы можа стаць візіткай сельсавета, яго галоўнай адметнасцю. Гэта так званы «экалагічны дом».

Аднапавярховая круглая пабудова плошчай у 72 квадратныя метры, разлічана на пражыванне сям'і з трох чалавек. Дом плануецца цалкам незалежным ад цэнтралізаваных электрасетак і будзе адпавядаць міжнароднаму стандарту нулявога энергаспажывання. Забяспечваць сябе энергіяй ён павінен самастойна — за кошт альтэрнатыўных крыніц. На даху ўстаноўлены вятрак, фотаэлектрычныя панэлі і сонечны калектар (між іншым, усё — беларускай вытворчасці, а, значыць, недарагое). Паводле слоў аўтара праекта і будучага гаспадара экалагічнага дома, кіраўніка Мінскага гарадскога аддзялення Міжнароднага грамадскага таварыства эколагаў Яўгена Шырокава, комплексная сістэма выкарыстання альтэрнатыўных энергакрыніц зможа цалкам закрыць пытанне асвятлення дома, расходаў на работу тэлевізара і камп'ютара. На той выпадак, калі спатрэбіцца ўключыць прас ці пыласос, у доме будзе стаяць кілаватны генератар.

Дом будуецца выключна з натуральных прыродных мясцовых матэрыялаў: дрэва, саломы, гліны, што робіць яго танным. Калі прадаваць «экалагічны дом» як камерцыйны праект, ён «пацягне» не больш, чым палова аднакаёвай кватэры.

Сцены робяцца саламяныя, з абодвух бакоў затынкаваныя глінай напапалам з драўнінным попелам. «Мы адналяем традыцыйныя беларускія тэхналогіі будаўніцтва, на сёння ў асноўным забытыя», — адзначыў гаспадар. Тоўстыя сцены (больш за 50 см) і сама форма дома робяць страты цяпла мінімальнымі. Так, для ацяплення ўсяго жытла будзе расходавацца менеей за 20 кілават/гадзін на квадратны метар, пры тым што паводле дзеючых нормаў гэта 120 кілават/гадзін. Цэнтральным аб'ектам дома з'яўляецца печ. Расход цэглы на яе будаўніцтва ўтрая меншы, чым на рускую, а паказчыкі камфортнасці і эфектыўнасці ў яе значна вышэйшыя. У доме будуць лазня, душ, прыбіральня, некалькі асобных пакояў.

— У мяне 12-гадовы вопыт будаўніцтва «саламяных дамоў», — прызнаўся Яўген Шырокаў. — Пачынаў я з дамоў для чарнобыльскіх перасяленцаў, сумесна з нямецкімі калегамі. Менавіта немцы правялі даследаванні, якія паказалі, што ў саламяных дамах хворыя дзеткі выздараўліваюць значна хутчэй, чым у драўляных, цагляных і тым больш панэльных. Саламянае жыллё мае высокія экалагічныя і эканамічныя паказчыкі. А з улікам таго, што мы трапляем у новую энергетычную сітуацыю, калі газ нам Расія будзе прадаваць па еўрапейскіх цэнах, думаю, «экалагічныя дамы» (а іх можна рабіць і шматпавярховымі) будуць запатрабаваныя.

У планах Шырокава і яго калег з Мінскага гарадскога аддзялення — стварыць у Бяларучах дэманстрацыйны экалагічны пасёлак з 15-20 саламяных дамоў, цалкам энергааўтаномны, дзе будуць выкарыстоўвацца альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Акрамя таго, ён ўжо атрымаў тры заказы на «экалагічныя дамы» для аграэкатурызму.

* * *

Яшчэ некалькі гадоў таму адной з самых складаных праблем на тэрыторыі Бяларучскага сельсавета было водазабеспячэнне. Якасць вады, стан водаправодаў, воданапорных вежаў выклікалі шмат нараканняў і скаргаў з боку мясцовых жыхароў. З прыходам новага старшыні сельвыканкама многае змянілася. Разам з Лагойскімі камунальнымі службамі мясцовая ўлада правяла каласальную работу па выпраўленні сітуацыі. За сродкі, атрыманыя на аўкцыёнах, Савет набыў новыя трубы, часткова замяніў водаправоды ў населеных пунктах, устанавіў 6 частотных пераўтваральнікаў, якія значна паляпшаюць якасць вады. Толькі сёлета за сродкі сельвыканкама былі пачышчаны і добраўпарадкаваны 27 грамадскіх шахтавых калодзежаў.

Тым не менш пакуль яшчэ ў сельсавеце ёсць праблемы, з якімі не атрымліваецца справіцца нават энергічнаму і рупліваму старшыні. Напрыклад, ёсць пытанне з будаўніцтвам новых ліній электраперадач. У 90-я гады зямельныя ўчасткі выдзяляліся грамадзянам без наяўнасці інжынерных і транспартных камунікацый, тады гэта не было абавязковай умовай, — патлумачыла Таіса Лявончык. А сёння, калі людзі збіраюцца ўвесці новы дом у эксплуатацыю, адпаведныя камісіі жыллё не прымаюць. Пакуль мясцовая ўлада звяртаецца ў розныя інстанцыі, жыхары вырашаюць пытанне сваімі сіламі.Так, у Маркаўшчыне і Мачанах людзі «скінуліся», заказалі праектна-кашторысную дакументацыю і правялі сабе новыя лініі электраперадач.

Ёсць нараканні і на якасць абслугоўвання дарог, за якія на тэрыторыі сельсавета адказвае ДРБУ-165. Аналіз дзейнасці ўпраўлення паказаў, што за апошнія два гады намецілася тэндэнцыя да скарачэння аб'ёмаў дарожных работ. І на гэта ёсць свае прычыны: машынна-трактарны парк ДРБУ састарэў, не хапае спецтэхнікі для абкосу пустазелля ў палосах адводу, часам не стае паліва. Вуліцы і праезды ўнутры сельскіх населеных пунктаў да гэтага часу не перададзены на баланс спецыялізаваных арганізацый. «З улікам таго, што на тэрыторыі сельсавета няма моцнай СВК, нам па дапамогу даводзіцца звяртацца ў арганізацыі Мінскага раёна, што больш затратна», — адзначыла старшыня.

Падводзячы вынікі Дня Савета, праведзенага на базе Бяларускага сельсавета, Іван Карповіч адзначыў, што работа мясцовай улады тут пастаўлена на высокім узроўні. А значыць, што многія (хай і не ўсе) пытанні жыццядзейнасці грамадзян можна вырашыць на пярвічным узроўні.

Інга МІНДАЛЁВА, *Лагойскі раён.*

ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Але ўвогуле дысцыпліна расце, — лічыць Аляксандр Селязнёў. — У параўнанні з мінулымі гадамі працэнт збору грашовых сродкаў павялічваецца. Яшчэ некалькі гадоў таму збіралі толькі 97-98 працэнтаў, а сёння — больш за 100. Гэта значыць, мы спаганяем грошы, якія жыльцы завінавацілі ў мінулыя гады. Частка людзей, асабліва калі яны з'язджаюць надоўга, плацяць наперад.

Самыя акуратныя плацельшчыкі за камунальныя паслугі — пенсіянеры. Тут спрацоўвае карысная савецкая звычка — у першую чаргу разлічыцца за кватэру.

Усе добрасумленныя плацельшчыкі аўтаматычна бяруць удзел у штогадовым гарадскім конкурсе «Самы дысцыплінаваны плацельшчык камунальных паслуг». Сёлетні прызавы фонд тут перавысіць 4 мільёны рублёў. Некалькі дзясяткаў чалавек, якія выйграюць, атрымаюць грошы на свой асабовы рахунак і будуць меней плаціць за кватэру.

У ліку неплацельшчыкаў ёсць проста лянівыя грамадзяне, якія забываюцца своечасова плаціць. Такім спецыялісты РКЦ рэкамендуюць напісаць заяву на працы: няхай плацяжы своечасова робіць бухгалтэрыя.

Большасць жа неплацельшчыкаў — гэта людзі, якія злоўжываюць алкаголем. П'яніца забываецца з цягам часу на ўсё, акрамя бутэлькі. Аляксандр Селязнёў, дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў, шукае сродкі для барацьбы з п'янствам, якое лічыць галоўным злом.

— Аднак і п'яніцам нашы супрацоўнікі імкнуцца дапамагчы, — зазначыў ён. — Ім шукаюць працу і даюць магчымасць памяняць кватэру. У нас створана дачынае прадпрыемства «Рыэлтінфармцэнтр»: там рыэлтары, якіх часта называюць сацыяльнымі, працуюць сумленна і дакладна. Яны нікога не падмануць, а размяняюць жыллё такім чынам, каб за кошт грашовай розніцы пагасіць запазычанасць. Сёлета 5 сем'яў перасялілі. Зразумела, з такім кантынгентам цяжка дамовіцца, але і яны ўрэшце разумеюць, што лепей выгадна памяняць жыллё, чым увогуле яго страціць. І калі няма сродкаў утрымліваць 3-пакаёвую кватэру, лепей пачаць жыццё ў 2-пакаёвай з чыстым асабовым рахункам.

Калі чалавек працуе, то скарга за няплату на прадпрыемства з'яўляецца дзейсным метадам. І справа тут не толькі ў сораме перад калегамі. Чалавеку, магчыма, патрабуецца матэрыяльная дапамога і ўвогуле падтрымка ў цяжкай сітуацыі. Бо здараецца, што перастаюць плаціць за кватэру і цалкам прыстойныя людзі.

Хто не мае грошай, таму ў РКЦ параяць звярнуцца па безнаяўную жыллёвую субсідыю на аплату камунальных паслуг. Шматдзетным сем'ям могуць паставіць бясплатна лічыльнікі, што дае магчымасць значна зэканоміць.

З'яўляюцца і новыя тэхналогіі аплаты камунальных паслуг, якія дазваляюць зэканоміць час і не рабіць лішніх рухаў. Новыя магчымасці прадастаўляе інтэрнэт. Сёння кожны магіляўчанін праз сайт гарвыканкама можа паглядзець свой асабовы рахунак. Заплаціць вэб-грашыма пакуль складана, але гэта толькі часовыя цяжкасці — прагрэс спыніць нельга.

Як і штогод, паводле даўняй традыцыі, людзі спяшаюцца вярнуць усе даўгі да наступлення Новага года — у снежні ў Магілёве змяншаюцца запазычанасці за камунальныя паслугі.

Аляксандр Селязнёў дзякуе і жадае ўсяго лепшага ў Новым годзе добрасумленным плацельшчыкам. І паралельна вывучае нядаўні ўкраінскі вопыт. У Запарожжы навучыліся кропкава перакрываць каналізацыю ў шматкватэрных дамах. Паводле паведамлення ў інтэрнэце, за пяць дзён там атрымалі 90 працэнтаў шматгадовай запазычанасці. Ці магчыма падобнае ў нас? Будучыня пакажа, але ў Магілёўскім цэнтры гарадскіх інфармацыйных сістэм упэўнены, што жыць у грамадстве на дармаўшчыну нікому не ўдасца.

Ілона ІВАНОВА.

ЧАРКА «ВЫМЫВАЕ» КАДРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Балючая тэма

Між тым «Купава-агра» — даволі прывабнае працоўнае месца. Перш за ўсё з-за памераў заработнай платы. Узровень заробкаў тут адзін з самых высокіх у раёне: па вынікаў дзесяці месяцаў гэтага года сярэдні памер аплаты працы склаў амаль 300 долараў. У галоўных спецыялістаў «набягае» каля мільёна рублёў.

— На жаль, сустракаюцца і такія, для якіх чарка даражэй за ўсё, — кажа Васіль Траццякоў. — І даволі цяжка дакладна адказаць, чаму людзі п'юць. Вядома ж, цяпер гэта не такая масавая з'ява, як было раней, але ж праблема застаецца даволі актуальнай. Здаецца, і грошы прыстойныя можна зарабіць, і ўмовы працы створаны добрыя, аднак асобныя работнікі не мінаюць спакусы перакуліць кілішак.

Зразумела, што для кіраўніка гаспадаркі гэта балючая тэма. І калі б не жорсткія меры, з дапамогай якіх наводзілі парадак, наўрад ці «Купава-агра» аказалася б сярод лідараў. Аднак факт неаспрэчны: пасля рэфармавання аб'ёмы вытворчасці збожжа павялічыліся ў 2,5 раза, малака — амаль удвая. Пасля таго, як прыйшоў інвестар, сваю спецыялізацыю гаспадарка не змяніла. Зразумела, дапамаглі значныя ўкладанні — на развіццё сельскагаспадарчага філіяла завод выдаткаваў каля 10 мільярдаў рублёў. Такія інвестыцыі дазволілі ўзмацніць вытворчую базу, удасканаліць парк тэхнікі. Пры гэтым змяніліся ўмовы вытворчасці: удалося адысці ад цяжкай ручной працы — цяпер многія працэсы (як у раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі) аўтаматызаваныя. У такім разе веды, прафесійны ўзровень работнікаў належным чынам ацэньваюцца падчас налічэння заробкаў.

— Колькі зрабіў — за тое атрымаеш. Гэта галоўны прынцып, — адзначае Васіль Траццякоў. — Але ж сістэма аплаты працы скіравана не толькі ўласна на канкрэтны вынік, але і на тое, каб заахвоціць работніка працаваць з большай самааддачай. Таму штомесяц налічваюцца прэміяльныя, дадатковыя грошы людзі атрымліваюць па вынікаў правядзення балансавых камісій. Мы дакладна адсочваем, як чалавек спрацаваў, лепшых заўсёды адзначаем — не шкадуем на гэта грошай.

Ільготы для маладых

Працоўны калектыў філіяла «Купава-агра» адносна невялікі — сёння тут 107 работнікаў. Сярэдні ўзрост не надта «юнацкі», аднак моладзь у гаспадарку ўсё ж прыходзіць. Некалькі месяцаў таму ўладкаваўся малады заатэхнік, а дагэтуль узялі некалькіх спецыялістаў агратэхнічнага профілю.

— У гаспадарцы маладым спецыялістам прадастаўляюцца ўсе тыя льготы, якія вызначаны ў адпаведнасці з заканадаўствам, — кажа Васіль Траццякоў. — На працягу першых двух гадоў працы ім дадаткова выплачваецца своеасаблівая прыбаўка да заробку — дзве базавыя велічыні (цяпер гэта 70 тысяч рублёў). Таксама адразу пасля ўладкавання маладыя спецыялісты атрымліваюць «пад'ёмныя» — тры базавыя велічыні.

Без усялякіх цяжкасцяў гаспадарка вырашае жыллёвае пытанне сваіх работнікаў. Тым, хто пакуль яшчэ не паспеў стварыць сям'ю, адразу прадастаўляецца месца ў інтэрнаце. Гэта самая сапраўдная камфартабельная гасцініца, дзе створаны належныя ўмовы для добрага адпачынку. Тут ёсць усё неабходнае — кухня, гарачая вада, у пакоях — тэлевізары і бытавая тэхніка. Нічым не горш, чым ва ўласнай кватэры. Такім чынам абуладкаваныя тры нумары на дзевяць месяцаў, дзе цяпер жывуць чатыры спецыялісты.

Сямейным гаспадарка імкнецца праз непрацяглы тэрмін прадаставіць асобнае жыллё. У свой час былі пабудаваны чатыры сучасныя катэджы з усімі гарадскімі выгодамі. У гэтых дамах ёсць індывідуальныя катлы для ацяплення, а таксама спецыяльныя бойлеры для падагрэву вады. Газ, праўда, завазны — у балонах. Прыродны, магчыма, падвядуць праз пэўны час. (Гэта праблема ўсяго Бярэзінскага раёна, масавая газіфікацыя якога пачалася толькі сёлета.)

Будаваць новыя катэджы плануюць налета — будуць абуладкаваныя дзве сядзібы для работнікаў гаспадаркі. У асноўным жа вырашаць жыллёвае пытанне мяркуюць за кошт другаснага рынку нерухомасці — у навакольных вёсках нярэдка можна сустрэць «пустыя» дамы. Як заўважае Васіль Траццякоў, пасля добрага рамонту гэтыя будынкі па сваіх спажывецкіх якасцях практычна не будуць саступаць новабудоўлям. Пры гэтым кошт жылля будзе значна меншы.

Цэнтральная сядзіба філіяла «Купава-агра» — вёска Любушаны — у 2005 годзе стала першым на Бярэзіншчыне аграгарадком. Сацыяльная сфера тут на ўзроўні: ёсць лазнева-пральны камбінат, Дом культуры, камбінат бытавога абслугоўвання, крамы, школа і дзіцячы садок, фельчарска-акушэрскі пункт. Так што для любушанцаў, а таксама жыхароў навакольных вёсак увесь належны сэрвіс, што называецца, на месцы. Гэты аграгарадок дагэтуль правамерна лічыца адным з лепшых у раёне. Вельмі паказальны момант, паколькі важна не толькі стварыць для людзей усе належныя ўмовы, але і ўвесь час іх падтрымліваць.

— Каб прыцягнуць у сельскую гаспадарку кадры, неабходна кардынальна перагледзець рэжым працы і адпачынку вяскоўцаў, — упэўнены Васіль Траццякоў. — Тая традыцыйная сістэма, калі чалавек заняты ад цямна да цямна, не адпавядае сённяшнім патрабаванням. Трэба такім чынам арганізаваць працу, каб вытрымліваўся нармальны графік — са святочнымі днямі, выхаднымі. У людзей гарантавана павінен быць паўнаважкі адпачынак. Гэта дазволіць зрабіць сельскагаспадарчую вытворчасць больш прывабнай, у першую чаргу для моладзі.

Дарэчы, у рэфармаванай гаспадарцы захаваліся добрыя партнёрскія адносіны з мясцовай школай. Па праўдзе сказаць, выпускнікі не надта ахвотна звязваюць сваю будучыню з вёскай. Але асобныя з іх усё ж робяць свой выбар на карысць аграпрамысловага комплексу. Па накіраванні ад гаспадаркі адзін хлопец вучыцца ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, а дзве дзяўчыны — у Смілавіцкім сельгаскаледжы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Бярэзінскі раён.

ЗДАРОЎЕ ЯК ПРАДМЕТ ВЫВУЧЭННЯ

Сістэмай сацыяльна-гігіенічнага маніторынгу «Здароўе і фізічнае развіццё дзяцей Мінска» будуць ахоплены ў гэтым годзе таксама і выхаванцы дашкольных сталічных устаноў.

Галоўная мэта праекта — сістэматычны збор, апрацоўка і аналіз дадзеных аб стане здароўя дзяцей і падлеткаў з мэтай своечасовага выяўлення фактараў рызыкі і прафілактыкі магчымых захворванняў. Летась было абследавана 140 тысяч навучэнцаў з 228 мінскіх школ. Ацэнка давалася па 16 паказчыках здароўя і фізічнага развіцця і па 9 паказчыках фізічнай падрыхтаванасці. Адначасова з гэтым аналізаваўся стан унутрышкольнага асяроддзя (арганізацыя харчавання, вучэбныя нагрузкі, асвятленне, абсталяванне рабочых вучнёўскіх месцаў). У выніку праведзенага маніторынгу было ўстаноўлена, што 9,2 працэнта мінскіх школьнікаў маюць залішнюю вагу, а 1,2 працэнта — дэфіцыт масы цела. У больш як 40 працэнтаў — нетрэніраваная сардэчна-сасудзістая сістэма. А гарманічнае фізічнае развіццё маюць 63,3 працэнта сталічных вучняў.

Па рашэнні гарадскіх уладаў маніторынг будзе праводзіцца ў сталічных школах штогод. Да таго ж тэсты на здароўе здадуць у гэтым годзе і малыя дзіцячых садкоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

УТЕПЛЕНИЕ БУДЕТ

Обработка — по необходимости

В № 39 «Местного самоуправления» за 15 октября этого года была опубликована критическая статья «Зона бедствуй на Парниковай». В ней говорилось о нарушениях и дефектах, допущенных при строительстве дома № 11 по ул. Парниковой в г. Минске. В результате в квартирах на первом этаже создались ненормальные условия для проживания людей.

Редакция уже опубликовала реагирование на статью администрации Первомайского района г. Минска и УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», а также свой комментарий к нему (12.11.08). Сегодня мы помещаем ответ ПО «Минское городское жилищное хозяйство», подписанный заместителем главного директора С.Б. ПУШКОВЫМ.

«Согласно рекомендациям технического заключения о причинах возникновения сырости, разработанных РУП «Институт «Белжилпроект» и Институтом микробиологии Национальной академии наук Беларуси, УП ЖРЭО Первомайского района выполнены ремонтно-строительные работы по устранению причин появления сырости в квартирах 65, 66, 68, 140 и восстановлению поврежденных материалов отделки в квартирах 65, 66, 68. Ремонтные работы по восстановлению пострадавших мест в квартире 140 будут выполнены при обеспечении доступа в квартиру.

В ходе неоднократных комиссионных обследований (с участием представителей Минжилкомхоза, ГО «Минское городское жилищное хозяйство», РУП «Институт «Белжилпроект», Института микробиологии НАК Беларуси, центра гигиены и эпидемиологии Первомайского района) недостатков конструктивных элементов жилого дома, способствующих появлению сырости, не выявлено. Подвальное помещение жилого дома находится в надлежащем санитарном состоянии. Инструментальные замеры показали, что в квартирах 65, 66, 68 и 140 температурно-влажностный режим соответствует действующим нормам.

Для приведения технических характеристик жилого дома № 11 по ул. Парниковой в соответствие со Строительными нормами Республики Беларусь Минским городским исполнительным комитетом принято решение от 11 июля 2008 года № 1585 о выполнении работ по тепловой модернизации дома. В настоящее время специализированной организацией в соответствии с проектно-сметной документацией ведутся работы по наружному утеплению дома, которые планируется завершить в декабре текущего года.

Одновременно сообщаем, что по информации Института микробиологии Национальной академии наук Республики Беларусь, антисептическую обработку следует проводить только при наличии необходимости, так как плесневые грибы способны достаточно быстро адаптироваться к токсическому действию биоцидов, их бесконтрольное применение приводит к появлению устойчивых штаммов (штамм у микроорганизмов — это то же, что сорт у растений). Комбинация таких простых методов, как частое проветривание, более высокие стандарты уборки, уменьшение количества комнатных растений, способны привести к существенному уменьшению концентрации спор в воздухе».

ПРАВЕРЫЎ ТАКСАФОН

7 снежня ў 21 гадзіну невядомы паведаміў у міліцыю пра замініраванне школы ў вёсцы Масток Магілёўскага раёна. Увесь комплекс неабходных мераў не пацвердзіў знаходжання ў школе чагосьці выбухованебяспечнага.

На наступны дзень Магілёўскі РАУС распачаў крымінальную справу аб загадзя несапраўдным паведамленні. У выніку праверкі знайшоўся і вінаўнік пярэпалаху: 17-гадовы магіляўчанін, навучэнец аднаго з прафтэхліцэяў. Гэты бязглузды ўчынак нябожнагадовага магіляўчаніна яго сям'і абыдзецца нятанна.

Алена КАЗЛОВА.

ШЛЮБАЎ БОЛЬШ, НЕМАЎЛЯТ МЕНШ

Колькасць шлюбаў у Першамайскім раёне сталіцы змяншаецца, а колькасць нованароджаных расце

Сёлета за 11 месяцаў у ЗАГСе гэтага раёна зарэгістравана 1475 шлюбаў, у той час як за аналагічны перыяд мінулага года заручальнымі пярсцёнкамі абмяняліся 1512 пар, паведаміла начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Першамайскага раёна Станіслава Макарэвіч.

— Відаць, адбіўся высакосны год, — лічыць Станіслава Макарэвіч. — На снежань пададзена ўсяго каля 40 заяў.

А вось пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей у студзені—лістападзе гэтага года ў ЗАГСе выдалі 2047. Гэта на 137 больш, чым за 11 месяцаў мінулага года. Мамамі большасці малых (1394) сталі жанчыны ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў. 615 немаўлят нарадзілася ў гараджанак 31—40 гадоў. Што ж датычыцца імёнаў, то па выніках гэтага года ў дзяўчатак лідзіруюць Настасся, Марыя, Дар'я (63, 61, 56 нованароджаных адпаведна), у хлопчыкаў — Уладзіслаў, Максім, Аляксей (62, 56, 52).

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ПРЫБАЎКА ДА СЯМЕЙНАГА БЮДЖЭТУ

ЛЁГКА НЕ ДАЕЦЦА

Паводле звестак выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, у трэцім квартале гэтага года прадукцыя з асабістых падворкаў дадавала ў бюджэт сярэдняй вясковай сям'і каля 105 тысяч рублёў у месяц. Прычым варта заўважыць, што гэта лічба агульная. І часта прыватныя ўчасткі прыносяць грошы, цалкам параўнальныя з пенсіяй ці зарплатай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Знайсці сваё

530 падворкаў, каля 1400 жыхароў — нават па палескіх мерках прыгарадную вёску Ляскавічы можна назваць вялікай. Аднак яе адметнасць не толькі ў памерах. Шмат дзесяцігоддзяў Ляскавічы лічацца «сунічным краем». Гэтай ягадай тут займаюцца ці не ў кожнай гаспадарцы, а агульная плошча прыватных сунічных палеткаў дасягае 18 гектараў.

— Садовымі суніцамі займалася яшчэ мая маці, напэўна, і таму, што сур'ёзна разлічваць на добры ўраджай чаго-небудзь іншага ў нас складана, — распавядае жыхарка Ляскавічаў Алена Масюк. — Агароды знаходзяцца ў нізіне, бульба вымакае, а з ягадай — амаль ніякіх праблем. Апроч таго, нам дапамагае прырода. У Іванаўскім раёне суніцы выспяваюць недзе на два тыдні раней, чым у Цэнтральнай Беларусі. А гэта — бясспрэчная перавага на рынку.

Праўда, нельга не заўважыць — любой перавагай трэба ўмець скарыстацца. Сунічныя палеткі Алены Масюк займаюць практычна 20 сотак. Праца цяжкая. У чэрвеньскі «сезон» вольнага часу няма ўвогуле, на працягу гэтага месяца неабходна правесці пяць збораў. Плюс да таго, ягаду трэба падкарміць, пазмагацца са шкоднікамі, прапалоць, абрэзаць «вусы», аднавіць недзе на 4-5 сотках штогод, абгарнуць на зіму саломай. І практычна ўсё гэта — уручную. Адно, што міжрадкоўі апрацоўваюцца канём.

Калі трэба падкарміць — аказваецца да месца звычайны каравяк, калі трэба абараніць ад насякомых — рыхтуецца раствор з ёду, варыцца часнок і палын. Прычым «старыя» тэхналогіі маюць як мінімум дзве перавагі. Па-першае, ягада атрымліваецца чыстай і буйной. А па-другое, знікаюцца «вытворчыя выдаткі».

— Галоўнае, не ленавацца, і праблем не будзе, — працягвае Алена Масюк. — Скажам, тымі ж саджанцамі можна абмяняцца з суседзямі, можна купіць у Іванаве. Што ж да магчымасцяў прадаць, то тут усе, хто мае свой транспарт, імкнуцца патрапіць у Мінск на Камароўку, а астатнія здаюць у спажывецкую кааперацыю. І абодва гэтыя варыянты прымальныя. Бо асаблівых цяжкасцяў з месцамі на рынку ў сталіцы няма, а кааператары апошнім часам за добрую ягаду сталі прапаноўваць нармальныя цэны — не ніжэйшыя, чым прыватнікі.

Словам, аказваецца выгадна. У добры, ураджайны год толькі за садовыя суніцы Марыя Масюк можа атрымаць суму, эквівалентную 5-6 сваім сярэднім зарплатам у сельгаспрадпрыемстве.

Малочны рэбус

Крыху іншая сітуацыя з традыцыйнымі яблыкамі і бульбай. На думку многіх вяскоўцаў, закупачныя цэны на іх застаюцца нізкімі. Прычына відавочная — з-за невысокай якасці гэта прадукцыя прыдатная ў асноўным толькі для перапрацоўкі. Зрэшты, тут таксама можна зарабіць. Быў і застаецца актуальным і яшчэ адзін артыкул даходаў — малако. Сумы тут могуць атрымацца розныя: у адных па 80-100 тысяч, у іншых — больш за мільён штомесяц.

Горш тое, што прыватны статак працягвае імкліва скарачацца. Сёння на больш чым 13 тысяч асабістых падворкаў раёна прыпадае 3,6 тысячы кароў — амаль на трэць менш, чым яшчэ пяць гадоў таму.

— Каб трымаць карову, трэба мець сілы, — адзначае старшыня Іванаўскага райсавета Святлана Маісейчык. — Тым часам вёска пакрысе старэе, колькасць пенсіянераў павялічваецца, тады як моладзь лічаць, што прасцей схадзіць па малочныя прадукты ў краму — вялікіх праблем з завозамі не бывае. І ўсё ж нельга не прызнаць: змяншэнне статку тлумачыцца не толькі гэтым.

Намер пашырыць крэдытаванне прыватных падсобных гаспадарак на набыццё жывёлы, насення і інвентару — справа добрая. Ёсць зрухі і па датацыях на ўтрыманне кароў у залежнасці ад аб'ёмаў здадзенага малака — вызначэнне новай, больш высокай «планкі» надбавак у рэшце рэшт павінна адыграць сваю ролю. Аднак праблемы застаюцца. Як паказвае практыка, сама па сабе сістэма аплаты за малако для большасці вяскоўцаў застаецца заблытанай і незразумелай. Няма адказу на пытанне, якім чынам аказваць прыватнікам ветэрынарныя паслугі? Асобная гаворка — аб малаказборшчыках. Не сакрэт, што ад іх работы не ў апошнюю чаргу залежаць канчатковыя аб'ёмы нарыхтовак. Аднак заробкі малаказборшчыка невялікія. Пры гэтым, каб мець стаўку, трэба сабраць малако прыкладна з 70 кароў, інакш кажучы ў некаторых выпадках неабходна аб'ехаць ці не палову сельсавета.

— Хтосьці можа і не пагадзіцца, але я пераканана — настаў час пазбаўляцца ад пасрэднікаў у выглядзе сельскіх Саветаў і змяніць звыклыя падыходы да збору малака, — працягвае Святлана Маісейчык. — На мой погляд, гэтым павінны займацца перапрацоўчыя прадпрыемствы. Бо там, у адрозненне ад многіх Саветаў, ёсць добры транспарт, ёсць помпы для малака, прыборы вымярэння тлустасці. А ўсё гэта разам дасць аператыўнасць і якасць — рэчы, неабходныя ва ўмовах больш жорсткага стаўлення да беларускай малочнай прадукцыі ў Расіі.

Нарэшце, нельга абмінуць тэму мяса. Закупачныя цэны камерсантаў на яго значна вышэйшыя, прычым у выніку прадукцыя вяскоўцаў далёка не заўсёды аказваецца ў беларускіх перапрацоўшчыкаў. Каб выправіць становішча і накіраваць збыт у «афіцыйнае» рэчышча, у раёне вызначаны пэўныя льготы — па забеспячэнні саломай, сенам, пашай, сенажаццю. Льготы прадастаўляюцца праз сельгаскааператывы. Вось толькі хто ў гэтым выпадку павінен кампенсаваць затраты саміх гаспадарак — таксама невядома.

Хто дапаможа прыватніку?

Па насельніцтву Дружылавіцкі сельсавет — адзін з самых маленькіх у раёне. На «апошнім» месцы ён знаходзіцца і яшчэ па адным паказчыку — колькасці «прыватных» коней. На ўвесь сельсавет іх усяго пяць. Дзеля справядлівасці, гэтага фактычна дастаткова — амаль усю работу на вясковых падворках узяў на сябе мясцовы сельгаскааператыў «Дружылавічы». Вяскоўцам апрацоўваюць «соткі», выдзяляюць пашу і сенажаць, дастаўляюць «на дом» сена і салому. Прычым, як правіла, плаціць за гэта даводзіцца па сабекошце.

— Напэўна, з пункту гледжання чыстай эканомікі гэта не зусім правільна, да таго ж «лішніх» грошай у сельскай гаспадарцы ніколі не бывае, — заўважае кіраўнік «Дружылавічаў» Іван Бушкевіч. — Але я лічу, што ў механізатара, які працуе ў полі, не павінна балець галава аб хатняй гаспадарцы. А настаўнік, які вучыць нашых дзяцей, не павінен адрознівацца ад таго ж механізатара.

Прыклад СВК «Дружылавічы» — пасапраўднаму адметны. Але не тыповы. Бо зразумела, што першая і асноўная задача любой гаспадаркі — гэта выканаць дзяржзаказ на малако, мясе, збожжы. Да таго ж нельга не прызнаць: нават пры ўсім жаданні аказаць поўны «набор» паслуг вяскоўцам зможа далёка не кожнае сельгаспрадпрыемства. І тут ужо да месца іншы шлях — камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы пры сельвыканкамах. Прычым першы КУП у Іванаўскім раёне на тэрыторыі Псышчаўскага сельсавета быў зарэгістраваны ўсяго год таму.

— Мы маем на мэце ахапіць дапамогай усе без выключэння катэгорыі вяскоўцаў, — распавядае старшыня сельскага Савета Сяргей Мельнік. — Але ці не галоўнае заключаецца ў тым, што КУП можа праводзіць гнуткую палітыку цэнаў. У прыватнасці, свядома зніжаць тарыфы на найбольш запатрабаваныя паслугі, скажам, на апрацоўку сотак, і адначасова кампенсаваць выдаткі за кошт іншых напрамкаў.

Каб было «поле для манеўраў», напрамкаў работы павінна быць шмат. У Псышчаўскім КУПе набылі ўласны міні-трактар, увесь камплект абсталявання да яго, невялікі пагрузчык для вывазу смецця, аўтавышку для зносу аварыйных дрэў, стужкавую пілараму, зварачныя апараты. А ў перспектыве тут будуць працаваць уласныя электрык і пячнік.

— Безумоўна, без дапамогі было б цяжка, — адзначае Сяргей Мельнік. — Мы маем ільготы па падатку на прыбытак, на нерухомасць, падатку на дабаўленую вартасць. Акрамя таго, КУП атрымаў 150 млн рублёў на стварэнне новых працоўных месцаў. Аднак казаць, што на заканадаўчым узроўні тут усё вырашана да канца, усё ж нельга. Маленькі прыклад. Калі мы пачалі займацца нарыхтоўкай малака, то высветлілася: у адрозненне ад таго ж сельвыканкама, для КУПа гэта класіфікуецца як гандлёва-закупачная дзейнасць. З адпаведным падаткаабкладаннем. Малако «забрала» 10 мільёнаў рублёў прыбытку — сродкаў, неабходных для развіцця новых паслуг і, магчыма, адкрыцця філіялаў у іншых сельсаветах.

Сяргей ГРЫБ.

Іванаўскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

Кватэрнае пытанне

ВЫБРАЦЬ ТРЭБА НЕШТА АДНО

Мы жывём у прыватызаванай і застрахаванай кватэры, але праблемы свае вырашыць не можам. З-за вільготнасці ў нас пачарнелі столь і сцены (здараецца, што вада па іх цячэ раўчукамі), а камунальнікі толькі абяцаюць нешта зрабіць.

Хацелася б ведаць, калі яны ўсё ж зробяць рамонт, ці выплацяць нам страхоўку?

Д. К., *Гомельская вобл.*

У адпаведнасці з заканадаўствам кантроль за тэхнічным станам і своечасовым ажыццяўленнем рамонту прыватызаваных жылых памяшканняў ажыццяўляецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама спецыяльна ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Адказнасць за стан канструктыўных элементаў дома, інжынерных сістэм і абсталявання ў прыватызаванай кватэры павінна несці жыллёва-эксплуатацыйная арганізацыя, якая абслугоўвае дом, у адпаведнасці з заключаным дагаворам на тэхнічнае абслугоўванне. Яна ж павінна забяспечыць і своечасовую ліквідацыю выяўленых дэфектаў.

У адпаведнасці з Тэхнічным кодэксам наяўнай практыкі ТКП 45-1.04-14-2005 (02250) «Тэхнічная эксплуатацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў. Парадак правядзення» ў жылых будынках (акрамя забяспечаных цэнтралізаваным кіраваннем тэхнічным станам інжынерных сістэм і абсталявання) дыспетчарскія службы павінны прымаць заяўкі ад насельніцтва на ліквідацыю няспраўнасцяў.

Заяўкі павінны разглядацца ў дзень паступлення, а дэфекты ліквідавацца, як правіла, не пазней, чым на наступны дзень. У выпадках немагчымасці аператыўнай ліквідацыі няспраўнасцяў, звязаных з пагрозай небяспекі, пашкоджання маёмасці, эксплуатацыйныя арганізацыі абавязаны:

прыняць неадкладныя меры па прадухіленні пагрозы абрушвання канструктыўных элементаў, затаплення ніжэйшых паверхаў;

праінфармаваць зацікаўленых асобаў аб прынятых рашэннях і меркаваных тэрмінах ліквідацыі няспраўнасцяў.

Названым нарматыўным дакументам вызначныя, у прыватнасці, наступныя гранічныя тэрміны ліквідацыі няспраўнасцяў элементаў будынкаў, з моманту іх выяўлення (у сутках):

працякання даху — 1;

няспраўнасці ў сістэме арганізаванага водаадводу (унутранага вадасцёку — 2, вонкавага вадасцёку — 5);

прамярзанне сценаў — у тэхнічна магчымыя тэрміны;

працяканне вокнаў, стыкаў сценавых панэляў — 7;

адслаенне тынкоўкі столі або верхняй часткі сценаў, якое пагражае яе абрушванню, — 5 (з неадкладным прыняццем мераў бяспекі).

У выпадку непрыняцця жыллёва-эксплуатацыйнай арганізацыяй неабходных захадаў, трэба звярнуцца ў адпаведны мясцовы выканаўчы або распарадчы орган і, пры неабходнасці, у суд.

Што датычыцца добраахвотнага страхавання кватэры, то пры прызнанні заяўленага выпадку страхавым і выплаце грамадзяніну страхавой кампенсацыі да страхоўшчыка (страхавой арганізацыі) пераходзіць у межах выплачанай сумы права патрабавання, якое грамадзянін мае да арганізацыі, якая ажыццяўляе абслугоўванне і эксплуатацыю гэтага шматкватэрнага жылога дома.

Правіламі № 33 добраахвотнага страхавання жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах (узгодненымі Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2007 г. № 16, са зменамі і дапаўненнямі ад 28 красавіка 2008 г. № 337) вызначана таксама (пункт 55), што грамадзянін застрахаваны абавязаны вярнуць страхавой арганізацыі атрыманую суму страхавой выплаты, калі высветліцца, у прыватнасці, што ён атрымаў адпаведную кампенсацыю ўрону ад арганізацыі, якая ажыццяўляе абслугоўванне і эксплуатацыю гэтага шматкватэрнага жылога дома і адказнай за нанясенне ўрону.

Віктар САВІЦКІ.

Будні аховы

І канваяванне грузу на мяжу, і парадак на плошчы Цырыманіялаў

Пра будні і святы службы і яе людзей сённяшняя размова з **начальнікам Брэсцкага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Беларусі Аркадзем КАСЦЮЧЫКАМ.**

— Аркадзь Сцяпанавіч, зайшоўшы ў памяшканне ўпраўлення, адразу звярнула ўвагу, што стэнд са спартыўнымі і іншымі ўзнагародамі распрасціраецца на ўсю сцяну. Выходзіць, шмат спартсменаў, артыстаў са зброяй у руках нясуць вахту па ахове асабістай, калектыўнай, дзяржаўнай уласнасці і грамадскага парадку...

— Узнагароды сведчаць яшчэ аб перамогах на конкурсах прафесійнага майстэрства. Сёлета, напрыклад, наша каманда стала першай на 8-м міжнародным конкурсе прафесійнага майстэрства сярод дзесяці камандаў. І ў мастацкай самадзейнасці мы выглядаем не горш. Летась з рэспубліканскага агляду прывезлі першы прыз, а сёлета — другі. Але, сапраўды, найбольш узнагарод — вось гэтых прыгожых кубкаў, прывозяць са спаборніцтваў супрацоўнікі «Аховы», якія займаюцца спортам на аматарскай або паўпрафесійнай аснове. У нас служаць майстры спорту міжнароднага класа, чэмпіёны па рукапашным боі, па лёгкай атлетыцы, ёсць нават удзельнікі Алімпійскіх гульняў. Першыя, што прыходзяць на памяць прозвішчы — Сафановіч, Троцкі, Федзюкоў, Байдук, Чырук, Слядкоў, Цямчык, — і гэта далёка не поўны пералік нашых найлепшых спартсменаў. Вядома, мы ганарымся сваімі калегамі, усебакова развітымі людзьмі, якія і заспяваць хораша ўмеюць, і спартыўны рэкорд паставіць. У абласным упраўленні мы не толькі збіраем прыгожыя ўзнагароды, вядзём статыстыку перамог на конкурсах і спаборніцтвах, але і робім многае для таго самага ўсебаковага развіцця, прафесійнай адукацыі, фізічнага ўдасканалення. У памяшканні абласной службы ёсць сучасныя спартыўная і трэнажорная залы, калі патрэбна, арандуем басейн. Такія ж умовы стараемся стварацъ у падраздзяленнях. Сістэма прафесійнага навучання і падрыхтоўкі даўно адпрацаваная, і як бачна, дае свае вынікі. Лічу, што дасягнутыя поспехі ў нейкай ступені і заканамерныя, і лагічныя.

— Як і поспехі ў службе?

— Сапраўды так. Відаць, поспехам можна лічыць і той факт, што ні сёлета, ні летась з 16 тысяч аб'ектаў, якія мы ахоўваем, не здзейснена ніводнага крадзяжу. Ужо з пачатку гэтага года было ажыццёўлена 114 спробаў пажывіцца, але супрацоўнікі аховы крадзяжы папярэдзілі. У 75 выпадках зламыснікі затрыманы, яны адказваюць у адпаведнасці з законам. І ўсё болей людзей прыходзіць да высновы, што карыстацца нашымі паслугамі ў справе захавання сваёй маёмасці, выгадна. Гэта датычыцца і ўласнага жылля. Цяпер абаненцкая плата за ахову кватэры ў агульным шэрагу камунальных і іншых плацяжоў выглядае даволі сціпла. А чалавек заўсёды можа быць спакойны, нават калі трэба ад'ехаць у іншы горад. Эфектыўна працуе старая добрая «Алеся», распрацаваная, дарэчы, упершыню брэсцкімі спецыялістамі. Названая аўтаматычная сістэма ахоўнай сігналізацыі цяпер надзейна служыць ва ўсіх абласцях краіны і ў блізкім замежжы. А наша тэхнічнае падраздзяленне распрацоўвае асобныя элементы ўдакладненне сістэмы.

— Ахову якіх аб'ектаў вы назвалі б асаблівай ці спецыфічнай?

— Апошнія паняцці крыху адрозніваюцца паміж сабой. Асабліваю можна назваць ахову тых устаноў, якія афіцыйна прызнаныя асабліва важнымі. Гэта найперш банкі, аб'екты забеспячэння электраэнергіяй, газам, вадой, выбухова- і пажаранебяспечныя аб'екты, установы з вялікімі каштоўнасцямі, такія, як, скажам, музеі. Зразумела, што на іх вядзецца ўзмоцненая ахова. А вось спецыфічным аб'ектам я назваў бы Брэсцкую крэпасць. На тэрыторыі мемарыяльнага комплексу нашым супрацоўнікам увесь час даводзіцца сутыкацца з нестандартнымі сітуацыямі, выходзячы з якіх прымаць рашэнне на месцы. Бывалі выпадкі, калі трэба было прымаць меры для бяспекі людзей, бо раптам аднекуль «вылазілі» астаткі мінулай вайны ў выглядзе снарадаў ці іншых боепрыпасаў. А затрымліваць усялякага роду хуліганаў выпадае даволі часта. Не ўсе ж, на вялікі жаль, едуць ці ідуць паглядзець на цытадэль як славутасць. Асобныя індывідуумы спрабуюць намаляваць на манументах і скульптурах свастыкі. Былі аматары пасмажыць рыбу на Вечным агні. Здараюцца і такія агідныя правапарушэнні, якія на мове пратакола называюць хуліганскімі дзеяннямі ў дачыненні да старшакласнікаў з Паста №1. Усіх гэтых аматараў «экстрэмальных» паводзінаў на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу затрымлівалі нашы міліцыянеры.

— Відаць, ёсць сэнс сказаць і пра асаблівасці службы, звязаныя з мяжой.

— Мяжа для нас — гэта перш за ўсё канваяванне каштоўных грузаў. Сёлета, напрыклад, мы ажыццявілі суправаджэнне 15 179 адзінак транспарту з грузам. Гэта сотні кіламетраў бяспекі тавараў на сотні мільёнаў долараў. З кожным годам усё болей перавозчыкаў аддаюць перавагу нашаму ваенізаванаму ўзводу суправаджэння. Па жаданні заказчыка мы вядзём яго ад мяжы, напрыклад, Расійскай Федэрацыі да мяжы з Польшчай або Украінай і наадварот. І перавозчыкі ацанілі перавагі такой формы аховы перад грамадзянскай.

— Будні вашай службы — гэта не толькі ахова кватэр, прадпрыемстваў, устаноў, розных аб'ектаў, гэта ахова грамадскага парадку.

— Так, у 17 падраздзяленнях абласнога ўпраўлення штодня заступае на службу больш за 70 груп затрымання. Гэтыя групы, па сутнасці, адзіныя міліцэйскія нарады, якія вядуць патруляванне ў начны час. Населеныя пункты падзелены на зоны адказнасці для названых груп. Яны на працягу некалькіх хвілін прыбываюць на месца па выкліку трывожнай кнопкі або супрацоўкі сігналізацыі. Група затрымання рэагуе таксама на любыя праяўленні хуліганства, злачыннасці або яўнага парушэння правапарадку. Тут мы працуем у поўным кантакце з органамі ўнутраных спраў гарадоў і раёнаў.

— І ў сямейныя скандалы ўмешваецца група затрымання?

— Сямейныя скандалы — гэта работа ўчастковага інспектара. Але здараецца ўсялякае. І калі ў міліцыю, скажам, ноччу тэлефануюць, што п'яны дэбашыр крыўдзіць, б'е сваіх сямейнікаў, то нарады, якія знаходзяцца паблізу, умешваюцца і парадак усталёўваюць. Часта ў зводках аператыўнай інфармацыі можна прачытаць, да прыкладу: «Злодзей, што выхапіў сумачку з рук жанчыны, затрыманы па гарачых слядах». Часцей за ўсё гэта работа груп затрымання. Нярэдка яны дзейнічаюць пры дапамозе службова-пошукавых сабак.

— У сабачы гадавальнік вашай службы, напэўна, я ведаю, экскурсіі водзяць.

— Найбольш цікавяцца сабакамі дзеці-школьнікі. Ну мы і не адмаўляем, супрацоўнікі гадавальніка праводзяць экскурсіі, расказваюць пра асаблівасці ўтрымання, дрэсіроўкі чатырохногіх памочнікаў. Гадавальнік па вуліцы Янкі Купалы служыць яшчэ метадычным, навучальным цэнтрам. Тут знаходзіцца паўтары сотні сабак, з імі працуюць вопытныя міліцыянеры-кінолагі. І супрацоўнікі з усіх раёнаў, усіх падраздзяленняў праходзяць стажыроўку па рабоце са службова-пошукавымі сабакамі ў абласным цэнтры.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Курбан-Байрам для дзяцей-сірот

У гэтыя дні, з 8 па 11 снежня, мусульмане ўсяго свету, у тым ліку і ў Беларусі, святкуюць сваё галоўнае свята — Курбан-Байрам. Традыцыя прыносіць у гэты дзень у ахвяру жывёлу бярэ свой пачатак у гісторыі, якую добра ведаюць і мусульмане, і хрысціяне, і іудзеі. Згодна з Каранам, Анёл Джабраіл (Гаўрыіл) з'явіўся Ібрагіму (Аўрааму) у сне і перадаў яму загад ад Алага прынесці ў ахвяру свайго першынца Ісмаіла. Ібрагім адправіўся ў даліну Міна да таго месца, дзе сёння знаходзіцца горад Мека, і пачаў рыхтавацца да ахвярапрынашэння. Але Алаг выпрабоўваў Ібрагіма, і калі той гатовы быў выканаць волю Усявышняга, ахвяра сынам была заменена на ахвяру ягнём. Свята сімвалізуе міласэрнасць Бога і тое, што вера — лепшая ахвяра.

Маці-выхавальніцы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу Ірына МІХАЛЁВА (Дзяржынск) і Марына БУРДЫКА (Барысаўскі раён) са сваімі дзецьмі на святочным абедзе ў гонар Курбан-Байрама ў «Краўн Плаза».

Святкаваць мусульмане пачынаюць з раніцы, яны наведваюць мячэць, здзяйсняюць святочную малітву, раздаюць міласціну (садака), наведваюць родных і сяброў, просяць адзін у аднаго даравання, узгадваюць памерлых.

Учора адукацыйна-культурная ўстанова «Дастлук» («Сяброўства»), мэта якога — развіццё сяброўскіх, культурных і інтэграцыйных сувязяў паміж беларускім і турэцкім народамі, наладзіла святочны абед у гонар Курбан-Байрама ў гатэлі «Краўн-Плаза». На абед былі запрошаны турэцкія сем'і, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі і беларускія госці, у тым ліку каля 50 дзяцей з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

— Я ўзяла чатырох самых старэйшых, — расказвае Галіна ЖЫЛА, маці-выхавальніца з сямейнага дзіцячага дому ў Асіповічах. — Таню, Олю, Сашу і Наташу. Двое малодшых засталіся дома. Думаю, дзеці запомняць гэты абед: тут усё на самым высокім узроўні — і інтэр'ер, і кухня, і абслугоўванне. Разам з тыма добрая, амаль сямейная атмасфера. І гэта нягледзячы на тое, што частка гасцей размаўляе толькі на турэцкай мове, а частка — толькі на рускай.

Былі і тыя, хто размаўляе, нават спявае, на абедзвюх мовах. І тое, што такіх людзей становіцца ўсё больш — заслуга «Дастлук», які сярод іншага, арганізоўвае моўныя курсы. Сёлета толькі на платных курсах турэцкай мове навучаецца каля 100 беларусаў (у асноўным беларускі). Акрамя таго, існуюць бясплатныя курсы ў мінскай гімназіі № 12 і за сімвалічную плату — у БДУ. Падчас абеду гасцей забаўлялі вучаніцы мінскіх гімназій — удзельніцы міжнародных алімпіяд па турэцкай мове.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Хто на новенькага?

Некалі ў так званы аксамітны сезон выдзелілі мне пуцёўку на чарнаморскі курорт. Без прыгод даехаў да месца прызначэння, там, пры афармленні папер, пазнаёміўся з маладымі мужчынамі (адзін — запарожскі металург, другі — варонежскі эканаміст). І рашылі мы з імі пасяліцца разам, утраіх...

Але ж пакой быў на чатыры ложкі. «Значыць некага падселяць», — падумалі мы. І, бачачы досыць сталых людзей навокал, узяліся прасіць адміністратарку, каб хоць не каго старога... Мы, маўляў, маладыя, у нас свае інтарэсы, захапленні...»

Жанчына паабяцала; мы накіраваліся ў нумар. Толькі выбралі сабе ложкі, толькі кінулі рэчы, — чуем стукае хтось, бачым — адчыняе дзверы малады хлапец. Просіць:

— Калі ласка, прыміце мяне да сябе.

— А ў чым праблема? — здзіўляемся мы.

— Дык адміністратарка адмаўляе. Я папарасіў, каб пасяліла з кім маладзейшым, яна кажа, што гэткія ёсць, ды дзядоў у кампанію браць не хочуць.

— А ты тут пры чым? — не зразумелі мае суседзі.

— Дык прозвішча ў мяне такое — Дзядоў.

Мы ў рогат... Пасля якога, зразумела ж, згадзіліся ўзяць хлапца ў пакой. Аб чым потым ні разу не пашкадавалі. Бо чалавек з пенсіянерскім прозвішчам аказаўся выдатным чалавекам і сапраўднай душой кампаніі.

Рыгор НАФТОЛІН, *г. Гомель*

Ведаю па сабе

Не вам казаць, бывае — выпадкова ляпне хтось слоўка ці два і яны потым доўга жывуць... Ну як вось гэтыя.

За савецкім часам слава пра наш калгас грымела па ўсёй краіне і нават далей, дэлегацыі ледзь не штодня прыязджалі — глядзелі новыя фермы, новую канюшню, слухалі расказы пра вопыт...

Быў ён — без сумненняў, але ж і без хлусні мы не можам: прыехаў нехта, — расказваем, як выгадна, як добра, што ўкаранілі штучнае асемяненне! А як госці паехалі, то каровак — і з калгаснага статка, і з падворкаў — пускаем да бычка.

Стаялі яны ў новай прыгожай канюшні...

І значыць неяк нашы вяскоўцы Васіль з Маняю прыводзяць да яе рагульку.

Справа далей — вядомая і лішніх вачэй не любіць: жонка рашыла па канюшні прайсціся, паглядзець, што там ды як, час прабавіць.

Колькі там яго прайшло, — выходзіць. І добрым часам якраз: чуе — конюх гаворыць, што ўсё, маўляў, забірайце сваю «барышню».

Мужык давай кароўку ад плоту адвязваць.

— А бычок пайшоў? — удакладняе жонка.

— Пайшоў, — адказвае гаспадар. — Два разы.

— Прывязвай назад! — загадвае Маня. — Два — па сабе ведаю, мала будзе!..

Гэтыя словы ў нас доўга жылі. Ды і цяпер вяскоўцы іх помняць — па сабе ведаю.

В.І. ШУСЦЕР,
в. Вясея, Слуцкі раён.

Дзядзькава навука

Кемлівы ў нас народ! А ўжо, што не дурны...

Пра дзядзьку аднаго раскажу. Той некалі з базару пехам ішоў і дужа ж стаміўся. Дай, думае, зайду да знаёмых, хоць пасяджу крыху. А там мо і падсілкавацца нечым дадуць?

Пашчасціла — гаспадыня дома была. Сустрэла без асаблівай радасці, але ж у хату ўпусціла, за стол пасадзіла, нешта нават з кухні нясе. Ставіць госцю пад нос, нагінаецца, падымае з падлогі лыжку і... у міску яму.

Падарожнік з той пасудзіны есці не стаў. Хлебам падсілкаваўся, вады кубак выпіў. Потым падняўся, падзякаваў, дастаў з міскі лыжку і... палажыў яе пад стол, туды, дзе была.

— Што гэта вы робіце? — спытала гаспадыня.

— Дык, кумачка, ведаю — у кожнай хаце свае парадкі. Вось я лыжку і палажыў туды, дзе была.

...Не ведаю, як вы, а я проста ўпэўнены, што пасля гэтага ёй іншае месца ў хаце знайшлося.

К.С. КАРНЯЛЮК, *г. Віцебск*

Урок

...Ну нарэшце холадна стала. А то ўжо так пякло, так пякло — хоць ты з хаты не выходзь. Добра маладым у гэтых міні-шорціках-спаднічках. А чалавеку сталаму як?.. Шчасце яшчэ, што хоць вечарам можна было расслабіцца, дома ў сподніх пахадзіць.

Рызыкаваў... Болей, мусіць, не буду, бо знаёмы расказваў, што з гэтага атрымацца можа.

Значыць, сеў ён неяк. У трусах. А жонка, як муха, «лётае» вакол і гудзіць: «Я люстру за 200 тысяч купіла, сама дамоў валакла... Другі месяц на шафе ляжыць, табе, акаяннаму, часу няма. Мне што электрыка наймаць, каб павесіў...»

Воўк, як вядома, сабак не баіцца, але ж звягі не любіць. Надаела мужыку слухаць жончыны «песні». Прынёс ён з кухні стол, паставіў на яго табурэтку — люстру на кручок прычапіў. Засталося правады злучыць.

— Ізаленту падай, — жонцы загадаў.

Тая галаву задрала, працягнула і, як на тое ліха, згледзела, што з сямейнікаў нешта вытыркаецца. Пажартаваць рашыла і пстрычкаю р-раз.

Балюча... А галоўнае думаў мужык, што токам, спалохаўся і аб падлогу як бразнецца...

Чым гісторыя скончылася? Тым, што зламаў ён руку і табурэтку, пабіў бок і люстру за 200 тысяч рублёў. Але ж высновы зрабіў — усім цяпер кажа, каб ніколі не хадзілі ў «неглежэ». Нават на хаце.

Віктар ФЕДАРАКА, *г. Скідаль*

На гарачым?

У пяцідзясятыя гады, калі ў калгасах, лічы, не плацілі (а мо і раней — калі днём немцы прыходзілі, а ноччу партызаны?), кінуліся людзі гнаць самагонку... Уладыслаў, як вядома, скрозь пальцы на гэта не глядзелі, міліцыя ў шапку не спала...

Нашаму ўчастковаму неяк удача ўсміхнулася: нарэшце, на гарачым (з брагай!) злавіў ён злоснага самагоншчыка. Рады быў — не перадаць! Для большай пераканаснасці рашыў злачынцу разам з дакозам віны у райаддзел даставіць. Загадаў запрэгчы каня, пагрузіць бочку. Селі, паехалі.

А да райцэнтра вёрстаў 20, відаць — праз палі, праз лясы, праз вёскі. І людзі ж там, вядома, цікаўныя — вітаюцца з абаімі, пытаюць, і куды яны едуць, і што вязуць? Міліцыянер стаў выхаваўчую работу заадно праводзіць — усім расказваць, чым справы такія канчаюцца, усім паказваць, што будзе і вам тое ж самае: рана ці позна міліцыя ўсё роўна зловіць.

— Малайцы вы, от малайцы! — пахваліў міліцыянераў адзін з вяскоўцаў. — Дзень і ноч, ведаю, працуеце — адпачыць няма калі, скарынку хлеба ў рот укінуць...

І праз паўзу:

— То, можа, зойдзеце ў хату, можа перакусіце чым Бог паслаў?

Ехаць было яшчэ досыць далёка, каня не пагоніш, згадзіўся ўчастковы, пайшоў. Гаспадыня там у міг вока нешта на стол паставіла, гаспадар, штось сыну шапнуў і «казёнкі» пляшку выцягнуў. Выпілі — пакрысе, зразумела ж, пасядзелі, паехаў участковы далей, злачынцу павёз...

У райаддзеле, прыехаўшы, адразу ж падаўся да начальніка, далажыў, як і належыць, каго злавіў, з чым прывёз.

Начальнік (раз такая сур'ёзная справа) з кабінета выйшаў, падышоў да воза, зазірнуў у бочку.

Таму, што ўбачыў, — тлумачэння спярша не было: з бочкі на ўвесь двор запахла... квашанай капустай...

Ужо потым, атрымаўшы добры наганяй, участковы зразумеў, што бочку, відаць, падмянілі, пакуль ён перакусваць хадзіў. Але доказаў таму ў яго не было.

У.К. ЛАБКО,
в. Дзераўная, Слонімскі раён

Прыгоды немца ў Беларусі

У армянскага радыё некалі спыталі, як адрозніць нашага чалавека ад немца, калі яны выходзяць з прыбіральні? Яно ж (ну тое радыё) і адказала, што наш чалавек, выходзячы, будзе прарэх зашпільваць...

Доля праўды ў гэтым назіранні ёсць. Але ж я аднойчы на свае вочы бачыў, як тым самым... немец грашыў.

А было так. У сярэдзіне пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя нас, дваіх навучэнцаў Навапольскага сельгастэхнікума, накіравалі на практыку ў Вілейскую МТС — машына-трактарную станцыю. Гучала гэта, згадзіцеся, гучна, але ж тэхнікі там было з гулькін нос: збажыну касілі косамі, а найбольш — жанчыны жалі сярпамі, вязалі ў снапы, якія потым звозілі ў такі і малацілі. Для гэтага на МТС падчас нашай практыкі нямецкія малацілкі прывезлі. А следам — нямецкія інжынеры прыехалі, каб дапамагчы іх асвоіць: паказвалі ўсё нашым механізатарам, тлумачылі праз перакладчыкаў... Жылі — на кватэрах, харчаваліся ў эмтээсаўскай сталоўцы. Там жа (справа жыццёвая) хадзілі ў прыбіральню — з дошчак скалочаную, на дзве кабінкі разбітую. Літар «М» і «Ж» на дзвярах ніхто не пісаў. Напэўна, з мэтай эканоміі — каб менш прастояў было.

Дык вось. Неяк пасля абеду накіраваліся мы з сябрам да гэтай будынінкі. Ён наперадзе ідзе, я — ззаду, пра нешта гаворым. Ён адчыняе дзверы, заходзіць. Я «свае» тузануў — знутры зачынена. Адышоўся далей — чакаю. А сябар жа гэтага не бачыць — ён далей гамініць. Чую, пытае штось — ціха, потым гучней, гучней... Чаго маўчыш, маўляў?! І з мацюкамі... І кулаком у перагародку як садане!..

У той жа момант — насцеж дзверы суседняй кабінкі... І немец адтуль — можна сказаць, без штаноў, куляй, белы, ну як палатно...

Не ведаю, што ён думаў тады? Але ж прыгоду гэту, відаць, запомніў? Як помню я, хоць столькі часу прайшло.

Дзяніс Альбінавіч БАРЭЙКА,
в. Юркаўшчына, Докшыцкі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

На слыху

ДЗВЕ ЖЫХАРКІ БАБРУЙСКА ЗАГІНУЛІ Ў АЎТААВАРЫІ Ў СМАЛЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

8 снежня каля 15 гадзін на аўтадарозе «Мінск—Масква» ў ДТЗ трапіў аўтобус «Setra», зарэгістраваны ў Бабруйску. Ва ўмовах снегападу 30-гадовы вадзіцель пайшоў на абгон, але не справіўся з кіраваннем. Аўтобус з'ехаў у кювет і перакуліўся.

У салоне знаходзіліся другі вадзіцель і 16 пасажыраў. У выніку аварыі дзве жанчыны, 40 і 44 гадоў, ад атрыманых траўмаў загінулі на месцы. А вадзіцель і 8 пасажыраў (усе яны жыхары Магілёва і Бабруйска) з цялеснымі пашкоджаннямі рознай ступені цяжкасці шпіталізаваныя ў бальніцу горада Гагарын Смаленскай вобласці.

Алена КАЗЛОВА.

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

Супрацоўнікі спецыяльнага практычнага падраздзялення крымінальнага вышуку УУС Гродзенскага аблвыканкама не дазволілі пазбегнуць пакарання чалавеку, які ў 1994 годзе здзейсніў цяжкае злачынства ў абласным цэнтры, а ў апошні час пражываў у Мінску.

14 гадоў таму ён, самавольна пакінуўшы размяшчэнне вайсковай часці, у гродзенскім лясным масіве Пышкі згвалціў няпоўнагадовую дзяўчыну і забраў у яе залатыя завушніцы. Аднак па «гарачых слядах» гвалтаўніка не выявілі, ён быў асуджаны толькі за дэзерцірства, захоўванне зброі і крадзеж. Але, як кажуць, колькі вяровачцы ні віцца... Прыгавор суда Ленінскага раёна г. Гродна — 13 гадоў пазбаўлення волі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У АВАРЫІ ЗАГІНУЛІ НЯПОЎНАГАДОВЫЯ

За мінулыя выхадныя на дарогах краіны ў дарожна-транспартных здарэннях загінулі сямёра, а яшчэ 37 чалавек атрымалі траўмы, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС. У адным са здарэнняў загінулі і пацярпелі няпоўнагадовыя.

На жаль, канстатуюць у ДАІ, сталі нярэдкімі выпадкі, калі за руль аўтамабіля садзіцца моладзь, якая не мае вадзіцельскага пасведчання. На мінулыя выхадныя паблізу вёскі Храпкава Хойніцкага раёна зафіксаваны менавіта такі выпадак. Тут каля а паловы дванаццатай ночы 15-гадовы хлопец, кіруючы аўтамабілем «Рэно», з'ехаў у кювет, дзе машына перакулілася. У выніку вадзіцель і яго аднагодка загінулі, а яшчэ два пасажыры — 15-гадовы і 16-гадовы — былі змешчаны ў бальніцу.

Як падкрэсліваюць у дзяржаўтаінспекцыі, практыка паказвае, што няпоўнагадовыя вадзіцелі неапраўдана рызыкуюць на дарозе. Таму бацькам, якія часам маўкліва аддаюць ключы ад аўто сваім дзецям, лепш устрымацца ад падобнага неабачлівага кроку. Да таго ж, трэба заўважыць, што кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання ім, а таксама перадача кіравання асобе, якая не мае вадзіцельскага пасведчання, цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 175 тысяч да 700 тысяч рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

РАЗЛІЧЫЛАСЯ

За праведзены рамонт жыхарка Баранавічаў разлічылася долярамі. Жанчына, якая атрымала іх, пайшла абмяняць на рублі. Тут і высветлілася, што долары фальшывыя.

Міліцыя выйшла на жанчыну, якая аплаціла рамонт, і знайшла ў яе яшчэ 21 фальшывую купюру па 100 долараў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АЎТАМАБІЛЬ — «УСМЯТКУ», ЛЮДЗІ — НА БАЛЬНІЧНЫМ ЛОЖКУ

Такія вынікі амаль што лабавога сутыкнення двух аўтамабіляў на дарозе «Магілёў —Шклоў», якое адбылося ў суботу 6 снежня, каля 17 гадзін.

Паблізу вёскі Купёлы 26-гадовы вадзіцель аўтамабіля ВАЗ не справіўся з кіраваннем, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з «Аўдзі». Удар быў не вельмі моцны: 23-гадовы жыхар Бабруйска, які кіраваў «Аўдзі», і пасажыры не пацярпелі. Затое «Жыгулі» шостай мадэлі практычна не падлягаюць аднаўленню, а вадзіцель і 29-гадовы пасажыр шпіталізаваны з цялеснымі пашкоджаннямі ў цяжкім стане.

Алена КАЗЛОВА.

СТУКНУЎСЯ АБ ПАДЛОГУ

У гардэробе аднаго баранавіцкага прадпрыемства знайшлі труп мужчыны, у якога была разбітая галава.

Было ўстаноўлена, што нябожчыка па твары ўдарыў п'яны. Мужчына ўпаў і стукнуўся патыліцай аб падлогу. Пракуратура праводзіць праверку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РЫБНАЕ МЕСЦА

На складзе па вул. Лермантава, што ў Баранавічах, аператыўнікі знайшлі 1700 кілаграмаў рыбы. Дакументы на прадукцыю ў індывідуальнай прадпрымальніцы адсутнічалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВОСЬ ГЭТА БЫЎ ВЫБУХ!

Як вядома, Жлобінскі раён у час Вялікай Айчыннай вайны, як і наогул уся Гомельшчына, быў арэнай вялікіх ваенных дзеянняў. Нават і сёння тутэйшая зямля захоўвае нямала ўзбраення, якое не-не ды і выяўляецца. Месца гэтым небяспечным рэчам — адно: вывезці ў поле і знішчыць.

Так было і на гэты раз, калі супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і вайсковай часці 5525 удалечыні ад населеных пунктаў Жлобінскага раёна ўзарвалі 45 мінамётных мін, 8 гранат Ф-1 і 3 процітанкавыя гранаты РПГ-40, 10 нямецкіх гранат GG-P-40, 2 артылерыйскія снарады калібру 75 мм, 15 артылерыйскіх узрывальнікаў, адну процітанкавую чатырохсотграмовую шашку і 12 ручных гранат РГВ. Вось гэта быў выбух!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ВЫКРАЎ... АЎТОБУС

Супрацоўнікі ДАІ затрымалі выкрадальніка на тэрыторыі Гродзенскага аўтобуснага парка № 1. Ім аказаўся 28-гадовы жыхар абласнога цэнтра, які раней працаваў на гэтым прадпрыемстве зваршчыкам.

У суботу вечарам малады чалавек прыйшоў у аўтапарк да сваіх знаёмых і затрымаўся там да паловы другой ночы. А на развітанне, будучы нападпітку, захацеў пакатацца на маршрутным аўтобусе МАЗ, які знаходзіўся на стаянцы з адчыненымі дзвярыма і ключом у замку запальвання. У выніку былі пашкоджаны не толькі гэты транспартны сродак, але і прыпаркаваны аўтобус «Радзіміч», а таксама смеццевыя бакі. Ахоўнікі аўтапарка выклікалі міліцыю. Узбуджана крымінальная справа.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗНАЙШЛІ Ў ЛЕСЕ

Супрацоўнікі Драгічынскага РАУС сумесна з памежнікамі ў лесе каля в. Сварынь знайшлі 39 мяхоў з трыкатажнымі вырабамі.

Цяпер высвятляюць, хто прыхаваў тавар на 90 мільёнаў рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АДЗІН І БЕЗ ЗБРОІ...

У паляўнічых угоддзях паблізу вёскі Міхаліна Верхнядзвінскага раёна быў знойдзены легкавы аўтамабіль «Ніва», у багажніку якога знаходзіўся чахол ад паляўнічага ружжа.

Дзяржінспектары пайшлі па слядах двух чалавек і знайшлі тушу дзіка. Каля яе была арганізавана засада. Калі да тушы падышоў чалавек і пачаў яе разбіраць, грамадзяніна, як высветлілася, непрацуючага, затрымалі. Зброі ў яго не было. Цяпер устанаўліваецца асоба другога паляўнічага, якому належаў аўтамабіль, і які, як мяркуецца, здабыў дзіка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СМЕРТАНОСНАЯ ГАЛІНА

Каля в. Бабровічы Іванцэвіцкага раёна валілі лес. У час работы на 73-гадовага пенсіянера з в. Выганішчы звалілася галіна і цяжка траўмавала чалавека. Ён памёр па дарозе ў бальніцу.

ДА ЗІМЫ РЫХТАВАЛІСЯ?

З дома па вул. Меліярацыйнай у Драгічыне нехта праз акно выкраў 3 коўдры, пакрывала, куртку....

Падчас разбору аператыўнікі выйшлі на ліцэіста з в. Нагор'е і беспрацоўнага з в. Перкавічы, якіх і затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб фактычным **месцы знаходжання Уладзіміра Аркадзьевіча ПАЛІТЫКА,** 29 верасня 1968 года нараджэння,

200 новых аўтобусаў і 300 тралейбусаў на мінскіх вуліцах

Працэс інтэнсіўнага абнаўлення пасажырскага камунальнага транспарту ў сталіцы завяршаецца. З наступнага года будзе адбывацца толькі планавае абнаўленне рухомага саставу. За апошнія два гады парк гарадскіх аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў абнавіўся ў сярэднім на чвэрць. Як паведаміў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў, толькі сёлета набытыя 200 новых аўтобусаў, 35 трамвайных вагонаў, а колькасць новых тралейбусаў да канца снежня прыблізіцца да 300.

2009 год упершыню за шмат гадоў сталічныя транспартнікі сустрэнуць без старых рыжскіх трамваяў і, верагодна, без тралейбусаў ЗІУ. Не ўдалося сёлета закупіць толькі 29 вагонаў для метрапалітэна. Паводле слоў Валерыя Шкуратава, новыя вагоны набудуць у I квартале наступнага года. Ужо з красавіка, як мяркуецца, на другой лініі падземкі будуць хадзіць пяцівагонныя саставы.

Магда КРЭПАК, «Мінск—Навіны».

Твары гісторыі

Што за чалавек быў гэты князь Януш Радзівіл? Гэта ж па яго волі з'явіўся такі неверагодны для XVII стагоддзя партрэт, які дзівіць нават сучасных мастацтвазнаўцаў. Не толькі тым, што гэта двайны партрэт, дзе намаляваны дзве жанчыны — Катажына і Марыя Радзівіл. Здаецца, нічога дзіўнага, для нас, калі на фотаздымку можна бачыць колькі хочаш чалавек. І нічога дзіўнага для нас, што абедзве жанчыны на партрэце — жонкі князя. Не, ён не быў дваяжонцам. Мала таго, жанчына ў чорным на момант стварэння партрэта ўжо памерла. Але князь так кахаў сваю першую жонку Кацярыну Патоцкую, якая ў свой час лічылася прыгажуняй, што хацеў бачыць яе выяву побач з другой... не менш каханай жонкай. Малдаванка Марыя Лупу так уразіла князя, што ён пайшоў на ўсё, каб узяць з ёй шлюб, хоць гэта было не проста. Дазволу на шлюб дачкі малдаўскага князя трэба было прасіць у турэцкага султана, былі перамовы, напэўна, вялікія і багатыя паднашэнні... А потым пышнае вяселле ў Варшаве. Марыя перажыла князя, была шчырай праваслаўнай верніцай і ўласніцай Слуцку. Пасля сваёй смерці ўсю маёмасць яна хацела аддаць манастырам, школам. Канешне, жанчына вартая не аднаго партрэта. Незвычайная жанчына, бо пагадзілася на партрэце стаяць побач з нябожчыцай. «Мадэрнісцкі партрэт», жартам называюць яго мастацтвазнаўцы. Зрэшты, такі незвычайны твор у калекцыях беларускіх магнатаў напэўна быў не адзін.

А цяпер 47 партрэтаў, якія захоўваюцца ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея, выстаўлены ў новай экспазіцыі. 23 з іх ўпершыню ўключаны ў пастаянную экспазіцію. Аснова ўсяго збору гістарычнага партрэтнага жывапісу музея фарміравалася ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі паступалі творы з калекцыі палацаў і манастыроў. Такім чынам у музеі апынулася знакамітая калекцыя Радзівілаў. Пасля вайны частка твораў гэтай калекцыі, якія былі вывезены, усё-такі вярнуліся на Радзіму. Але ў 1950-м годзе 87 партрэтаў нясвіжскага і гродзенскага збораў былі перададзены ў Польшчу. Таму тое, што засталося, мае асаблівую каштоўнасць. Вядома, да ўсіх гэтых твораў і стаўленне асаблівае. За кожным партрэтам не толькі асоба, але час і адносіны людзей да яго імклівасці.

Пра гэта сведчыць яшчэ адзін твор, які быццам бы не зусім партрэтны, таму што ён ствараўся як алтарны абраз. Выява Святой Канстанцыі. Яна павінна была вісець у Нясвіжскім касцёле. Яе замовіў бацька князёўны Канстанцыі, якая памерла маладой. Ён паставіў ёй надмагілле. Уладзіслаў Сыракомля піша, што ніхто не ведаў, як выглядала святая Канстанцыя, таму абраз атрымаўся свецкі. З-за гэтага яго не захацелі павесіць у касцёле. Вісіць на гэтым месцы цяпер святы Антоній Падуанскі.

Але сярод твораў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея ёсць партрэты сапраўдных каралеўскіх асобаў. Напрыклад, партрэт Марыі Казіміры Сабескай, жонкі караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага. Ці яшчэ твор Маркуса Герартса 1618 года, на якім выява Елізаветы Сцюарт. На выставе насуперак яе вісіць яшчэ адзін партрэт «Цвярскі князь Міхаіл Барысавіч»? Менавіта з пытальнікам. Але навукоўцы кажуць, што сёння можна сцвярджаць, што гэта дакладна не цвярскі князь. Хто — яшчэ адна таямніца.

Таямніцы партрэтаў разгадвалі і разгадваюць супрацоўнікі музея. А разгадаўшы — ведаюць сапраўдны кошт гэтым творам. Усе яны патрабуюць пэўнага рэжыму захоўвання, час ад часу — рукі рэстаўратара і, відаць, толькі ў музеі могуць адчуваць сябе абароненымі. Ёсць і пацвярджэнне гэтай думкі: шэсць партрэтаў з музея пераехалі ў Нясвіж. Два з іх прыйшлося тэрмінова вяртаць: яны не вытрымалі мясцовых умоў і цяпер, патрабуюць рэстаўрацыі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ДЗЕНЬ ПАЭТА,

альбо Сеанс творчага псіхааналізу асобы Максіма Багдановіча

Яго прапануе правесці Ларыса Сімаковіч, кіраўнік фольк-тэатра «Госьціца», якая славіцца сваімі творчымі эксперыментамі і жаданнем паказаць, што няма нічога больш сучаснага, чым архаічны беларускі фальклор, няма нічога больш вечнага, жывога і трапяткога, чым слова народа, якое магло загарэцца іскрынкай у адным чалавеку, а магло і шугануць полымем у душы некаторых, нараджаючы палымяныя творы. Пра велічнасць слова і вечнасць Паэта будуць разважаць удзельнікі сучаснай містэрыі «Дзень Максіма Багдановіча», прэм'ера і адзіны паказ якой адбудзецца сёння на сцэне вялікай залы Белдзяржфілармоніі. Наколькі неардынарны эксперымент нас чакае, заўважна ўжо па тым, што ўвасабляць Багдановіча на сцэне будзе актрыса Святлана Зелянкоўсая. Чаму? З гэтага пачалася наша размова з Ларысай Сімаковіч:

— **Вы збіраецеся ў спектаклі-містэрыі аб'яднаць тое, што звычайна аб'яднаць немагчыма. У вас, акрамя фальклору, будзе гучаць музыка розных жанраў.**

— Гэта дзень Максіма Багдановіча, мы з гэтага выходзім. Дзень не як час сутак, а як іншая катэгорыя — урачыстасць і сцвярджэнне нечага светлага, жывога. Да таго ж гэта яшчэ і сённяшні дзень, сучасны момант. Мая задача была паглядзець на тое, што значыць сённяшні дзень Максіма Багдановіча. 9 снежня быў яго дзень нараджэння. А сёння у філармоніі адбудзецца наш спектакль, дзе сапраўды задзейнічаны самыя розныя калектывы і субкультуры, нават «НРМ» і хлопчыкі-рэперы. Яны таксама засведчаць сваё сённяшняе стаўленне да Багдановіча. Разважаюць тым самым не толькі пра яго...

— **Калі вы ўзялі гэтую постаць, то напэўна таму, што ваша душа адчувае еднасць з яго словамі?**

— Не задумвалася пра гэта, але для сябе адзначыла яго кангеніяльнасць з Моцартам. Нездарма ў нас ёсць і такія персанажы, як Моцарт і Сальеры. Багдановіч таксама распрацоўваў гэтую тэму. Яму цікава было вырашыць гэтую праблему. Дарэчы, ён палемізуе з Пушкіным у сваім вершы «Моцарты і Сальеры» (іншымі словамі геніі і прафесіяналы), па-іншаму вырашае гэтае пытанне.

Для мяне Максім Багдановіч сёння — цікавая асоба, таму што ягоныя думкі пра культуру, пра мову, пра тое, чым ёсць наш народ, наконт узаемадзеяння такіх катэгорый як «моцарты» і «сальеры» усё яшчэ вельмі актуальныя. Мы проста мала чытаем, давайце ў гэтым прызнаемся. Даўно сказана: няма прарока ў Айчыне сваёй. А варта прачытаць тое, што напісаў Багдановіч у свой час, на пачатку XX стагоддзя, і мы ўбачым, наколькі гэта актуальна сёння. Мы ўбачым, што гэта наш прарок. Нам не трэба даверліва хадзіць глядзець на іншых прарокаў, як сёння робіць наш народ, калі збіраецца на якісьці канцэрт і плаціць шалёныя грошы за квіткі. Няхай яны жывуць і гадуюцца недзе ў сябе. Але ў нас ёсць сваё. У нас ёсць чым ганарыцца. Я лічу, што прарокі могуць вярнуцца ў сваю Айчыну. Для гэтага патрэбна свая зямля, некалькі стагоддзяў і наша абуджэнне. І яны вяртаюцца.

— **Такая постаць як Багдановіч, здаецца, і не сыходзіла, яна проста растворана ў людзях. Кожны так ці інакш гэтыя думкі разумее, адчувае. Іншая справа: не кожны можа акрэсліць, што гэта належыць яму. Вы збіраецеся дапамагчы гэта зразумець, але з дапамогай эксперымента...**

— Так, абралі жанр сучаснай містэрыі. Містэрыя — гэта лепшая тэрыторыя існавання для прарока. Гэта прыдумана не мной, а ідзе яшчэ з часоў Сярэднявечча. У спектаклі 9 містэрый, 9 трансфармацый, пераўтварэнняў. 9 мантаў, праз якія праходзіць Багдановіч па сваім жыцці. Плюс сучаснасць: што значыць сёння Багдановіч — не помнік, а жывая істота.

У кожнай з містэрый ёсць пэўныя сімвалы. Ёсць крыж, таму што паэт не можа быць не на крыжы. Шлях паэта — гэта шлях да Галгофы. Вы зірніце на яго жыццё — там самота. Яму ж тады казалі: чаму ты выдумляеш свой край, якога няма? Ты жывеш у Яраслаўлі і можаш паступіць у Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт. Максім Горкі раіў: ды жыві ты спакойна, чаго выдумляеш? Аднак юнак, якому было трошкі больш за дваццаць гадоў, стварае нацыянальную літаратуру. Напэўна, на той момант ён сам не разумеў, што ён робіць. Варта ўзгадаць яго крытычныя артыкулы. А як ён мову беларускую падымае! Безумоўна, Гасподзь стварае для генія такія ўмовы, каб ён быў самотным, каб ён адзін найлепшым чынам спраўдзіў тое, што хацеў спраўдзіць на гэтай зямлі. Але чалавек не заўсёды пра гэта ведае. Безумоўна, не зусім ён усведамляў, што ўзыходзіць на сваю Галгофу. Хоць у яго быў пакутлівы шлях... У творцы нішага не бывае. У сапраўднага творцы не бывае лаўраў, прызнання пры жыцці, апладысментаў і кветак. Ідзеш па вуліцы, носіш у сабе цэлы сусвет, а ніхто не заўважае...

Адна з містэрый прысвечана каханню, ёсць дуэт кахання. Містэрыю з удзелам «НРМ» я для сябе назвала «Гэта было». Гэта як пасланне, заклік на тое, каб паглядзець на ўсё, што ёсць сёння з вышыні нашай будучыні. Куды мы можам прыйсці? Яшчэ адзін маладзёжны калектыў «Inserch for» выканае чатыры новыя песні на вершы Багдановіча. У гэтую містэрыю ўведзена постаць рэжысёра Мікалая Пінігіна. Самога яго не ўсё яшчэ вельмі актуальныя. Мы проста мала чытаем, давайце ў гэтым прызнаемся. Даўно сказана: няма прарока ў Айчыне сваёй. А варта прачытаць тое, што напісаў Багдановіч у свой час, на пачатку XX стагоддзя, і мы ўбачым, наколькі гэта актуальна сёння. Мы ўбачым, што гэта наш прарок. Нам не трэба даверліва хадзіць глядзець на іншых прарокаў, як сёння робіць наш народ, калі збіраецца на якісьці канцэрт і плаціць шалёныя грошы за квіткі. Няхай яны жывуць і гадуюцца недзе ў сябе. Але ў нас ёсць сваё. У нас ёсць чым ганарыцца. Я лічу, што прарокі могуць вярнуцца ў сваю Айчыну. Для гэтага патрэбна свая зямля, некалькі стагоддзяў і наша абуджэнне. І яны вяртаюцца.

— **Такая постаць як Багдановіч, здаецца, і не сыходзіла, яна проста растворана ў людзях. Кожны так ці інакш гэтыя думкі разумее, адчувае. Іншая справа: не кожны можа акрэсліць, што гэта належыць яму. Вы збіраецеся дапамагчы гэта зразумець, але з дапамогай эксперымента...**

— Так, абралі жанр сучаснай містэрыі. Містэрыя — гэта лепшая тэрыторыя існавання для прарока. Гэта прыдумана не мной, а ідзе яшчэ з часоў Сярэднявечча. У спектаклі 9 містэрый, 9 трансфармацый, пераўтварэнняў. 9 мантаў, праз якія праходзіць Багдановіч па сваім жыцці. Плюс сучаснасць: што значыць сёння Багдановіч — не помнік, а жывая істота.

У кожнай з містэрый ёсць пэўныя сімвалы. Ёсць крыж, таму што паэт не можа быць не на крыжы. Шлях паэта — гэта шлях да Галгофы. Вы зірніце на яго жыццё — там самота. Яму ж тады казалі: чаму ты выдумляеш свой край, якога няма? Ты жывеш у Яраслаўлі і можаш паступіць у Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт. Максім Горкі раіў: ды жыві ты спакойна, чаго выдумляеш? Аднак юнак, якому было трошкі больш за дваццаць гадоў, стварае нацыянальную літаратуру. Напэўна, на той момант ён сам не разумеў, што ён робіць. Варта ўзгадаць яго крытычныя артыкулы. А як ён мову беларускую падымае! Безумоўна, Гасподзь стварае для генія такія ўмовы, каб ён быў самотным, каб ён адзін найлепшым чынам спраўдзіў тое, што хацеў спраўдзіць на гэтай зямлі. Але чалавек не заўсёды пра гэта ведае. Безумоўна, не зусім ён усведамляў, што ўзыходзіць на сваю Галгофу. Хоць у яго быў пакутлівы шлях... У творцы нішага не бывае. У сапраўднага творцы не бывае лаўраў, прызнання пры жыцці, апладысментаў і кветак. Ідзеш па вуліцы, носіш у сабе цэлы сусвет, а ніхто не заўважае...

Адна з містэрый прысвечана каханню, ёсць дуэт кахання. Містэрыю з удзелам «НРМ» я для сябе назвала «Гэта было». Гэта як пасланне, заклік на тое, каб паглядзець на ўсё, што ёсць сёння з вышыні нашай будучыні. Куды мы можам прыйсці? Яшчэ адзін маладзёжны калектыў «Inserch for» выканае чатыры новыя песні на вершы Багдановіча. У гэтую містэрыю ўведзена постаць рэжысёра Мікалая Пінігіна. Самога яго не

— **Багдановіч у вас адзін з любімых паэтаў?**

— Я не магу адказаць на гэтае пытанне. Таму што кожная эпоха — гэта пэўны кантэкст. А кантэкст нараджае персоны. Сістэма параўнання тут не працуе. Я ўзялася за «Сымона-музыку» Якуба Коласа, адчула, якая гэта паэзія! Для таго, каб народ быў, рос і адчуваў сябе самадастатковым і проста народам, такая паэзія павінна гучаць, адточваць чалавека ледзь не паўсядзённа. Яна павінна быць з ім, нават на ўзроўні непрыкметнасці прысутнічаць. А Купала! Якая велічнасць і Боскасць!.. А вершы Багдановіча?.. А іх з намі штодня няма. Што вакол нас: у метро, у аўтобусе, што мы чуем?.. З якімі словамі мы ідзём па жыцці? Якая музыка грае ў нашых сэрцах? Хіба кожны з нас сёння носіць у сэрцы імя сваёй радзімы?

Мяне глыбока ўразіў учынак літоўскага кампазітара Дварыёнаса, які ў 41 год, даволі позна для прафесіі, стаў дырыжорам. Ён меў магчымасць выязджаць з дырыжорскай прафесіяй у розныя краіны, каб, акрамя шэдэўраў сусветнай музыкі, везці 3-4 творы літоўскіх кампазітараў. Для мяне дзіва, як гэтая традыцыя, якую ён заклаў, і сёння працуе. Ні адзін літоўскі музыкант не прыедзе без сваёй праграмы, без кавалка сваёй зямлі... У такія моманты ты ўспамінаеш, па якой зямлі ходзіш. Сярод нябачнага, нематэрыяльнага, духоўнага, што стварылі Купала, Колас, Багдановіч. Ды і беларускія кампазітары адметныя, таму што на мастака, на асобу ўплывае адчуванне ландшафту, клімат, асяроддзе.

— **Аднак жа беларускі калектыў «Госьціца» і вы асабіста за межамі прадстаўляеце нашу краіну. Як вас там прымаюць тыя, хто не разумее тых высокіх кантэкстаў, пра якія мы размаўлялі?**

— За межамі нас прымаюць нават лепш, чым дома. Дома мы нікому не патрэбныя. Без даху, без базы, без заробку, без памяшкання. Ёсць харошы чалавек Валянцін Дудкевіч, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца. Ён дае нам некалькі гадзін для таго, каб мы рэпеціравалі, трымалі форму. Ёсць сярод нас і беспрацоўныя, ёсць тыя, хто займаецца не сваёй справай, як я — займаюся вычыткай памылак з канцэртных праграмак у філармоніі на палову стаўкі. За гэта я атрымліваю грошы. Гэта ацэнка мяне дома. Хоць мае творы «Класік-авангард» вазіў у Варшаву на «Варшаўскую восень». Неаднаразова была запрошана на гэты фестываль у якасці ганаровай госці, не кожны з беларускіх кампазітараў меў такую магчымасць. Сіламі варшаўскіх кінематаграфістаў створаны ў Польшчы фільм пра «Госьціцу» і пра мяне... Мы ў нечым едныя з Багдановічам... Колькі ты можаш вытрымаць, ты вытрымаеш, калі ведаеш, дзеля чаго.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Камп'ютарнай мышы споўнілася 45 гадоў

Усе мы, карыстальнікі ПК, не можам абысціся без камп'ютарнай мышы. І калі яна функцыянуе нармальна, нават не заўважаем яе прысутнасці. Затое, калі яна не працуе, адчуваем сябе, як без рук (дакладней, без мышы!).

Мыш трывала ўвайшла ў камп'ютарны фальклор. Напрыклад, калі хочуць падкрэсліць лёгкасць выканання (або той, якую даручаюць) працы, кажуць: «З гэтым справіцца нават камп'ютарная мыш!» або «Гэта робіцца за два клікі мышы!».

А пачыналася ўсё з таго, што пяцьдзесят гадоў таму група канадскіх інжынераў з Таронта ператварыла звычайны шар для боўлінга ў адзін з самых папулярных аксэсуараў для камп'ютараў. Трэкбол, створаны інжынерамі, быў першым прататыпам звычайнай камп'ютарнай мышы, без якой цяпер шматлікія карыстальнікі не ўяўляюць сабе працу за кампэютарам.

Сістэме, над якой працавалі інжынеры, патрабавалася прылада, з дапамогай якой аператар мог паказаць на кропку на экране. Сістэма, якая была створана канадскімі спецыялістамі, уключала адзін з першых у свеце графічных інтэрфейсаў, і ім была неабходна нейкая прылада, каб кіраваць «жуком» (bug — так у той час называлі курсор) на экране. Для прылады было вырашана выкарыстаць шар з гладкай паверхняй, і першым, што трапілася інжынерам, быў шар для боўлінга.

Канадскія спецыялісты тады працавалі на ваенна-марскі флот Канады. Аднак распрацоўка трэкбола, будучы неацэненай нікім, неўпрыкмет выйшла з вайсковых структур. Не звярнуўшы на сябе ўвагі, трэкбол некалькі гадоў праваляўся «на паліцы», бо тады не было ніякай неабходнасці ў такога кшталту прыладзе. Аб ім узгадалі, толькі калі развіццё камп'ютарнай тэхнікі прывяло да неабходнасці стварэння прылады для кіравання і пазіцыянавання курсора. Як заявіў Том Крэнстон, адзін са стваральнікаў прататыпа камп'ютарнай мышы, «праблема была ў тым, што трэкбол быў створаны занадта рана». Інжынеры нават не запатэнтавалі тэхналогію з прычыны засакрэчанасці праекта. У наступныя гады распрацоўшчыкі ў шматлікіх краінах свету стваралі ўласныя прылады для пазіцыянавання.

Афіцыйна камп'ютарная мыш, яна ж індыкатар пазіцый х і у, яна ж камп'ютарны маніпулятар, яна жа маніпулятар тыпу мыш, «нарадзілася» ў 1964 г. Яе вынайшаў Дуглас Карл Энгельбарт са Стэнфардскага даследчага інстытута. Для камп'ютарных тэрміналаў, распрацоўшчыкам было неабходна стварыць прыладу для кіравання курсорам на дысплеі. Прататып прылады ўяўляў сабой невялікую драўляную скрыначку з двума дыскамі. Адзін з дыскаў паварочваўся, калі прыладай рухалі наперад, другі адказваў за рух мышы направа і налева. Энгельбарт кажа, што ён назваў прыладу мышшу з-за яе невялікага памеру і провада, падобнага на хвост. 9 снежня 1968 г. адбылася першая публічная дэманстрацыя сістэмы NLS і, разам з ёй, прататыпа мышы. А у 1970 г. Энгельбарт атрымаў патэнт на «індыкатар кардынат х і у для дысплейнай сістэмы». Мыш мела тры кнопкі аднолькавага памеру. «Я змог змясціць толькі тры, хоць мне хацелася, каб прылада мела пяць кнопак, па адной на кожны палец рукі», — гаворыць Энгельбарт.

Наступны «мышыны крок» быў зроблены ў 1972 г. у даследчым цэнтры Xerox PARC у Апала-Альта (зноў Сіліконавая Даліна!). Палепшаная версія мышы: два вялікія колы былі заменены адным падшыпнікам, перасоўванні якога фіксаваліся пры дапамозе двух ролікаў усярэдзіне мышы. Дызайн корпуса стаў больш нагадваць сучасную мыш.

У 1968 г. Энгельбарт атрымаў за сваё вынаходства чэк на $10 тысяч і ўвесь ганарар унёс у якасці першага ўклада за сціплы загарадны домік...

1 снежня 2000 г. Энгельбарт за ўсе свае вынаходствы, уключна вынаходства камп'ютарнай мышы, быў узнагароджаны Нацыянальным Медалём тэхналогій — адной з найвышэйшых узнагарод ЗША для навукоўцаў за дасягненні ў ІТ-сферы.

Цяпер Дуглас Энгельбарт мог бы быць і больш багатым, і больш знакамітым, чым Біл Гейтс, але — у адрозненне ад апошняга! — ён не па-амерыканску сціплы: свядома «сышоў у цень», і аб ім мала хто ўспамінае.

Да пачатку 80-х гадоў XX ст. мыш усё яшчэ заставалася экзатычнай прыладай.

Мыш у тыя часы каштавала нятанна. Напрыклад, мышы кампаніі The Mouse House, каштавалі каля $400 (плюс каля $300 за інтэрфейсную плату, да якой падключалася мыш). Гэта тлумачылася тым, што мыш мела досыць складаную (і не вельмі надзейную!) механічную будову.

Пазней даследчыкі кампаніі Xerox змянілі канструкцыю мышы, зрабіўшы яе больш зручнай для масавага выкарыстання. Камп'ютарная мыш набыла выгляд, падобны да выгляду канструкцый сучасных прылад. Два дыскі, якія распрацаваў Энгельбарт, былі заменены невялікім шарам і ролікамі, так што новая канструкцыя стала падобная на трэкбол, створаны ў пачатку 60-х канадскімі інжынерамі. Кампанія Xerox упершыню прадставіла мыш як частку персанальнага камп'ютара Alto ў пачатку 70-х. Тады ўпершыню камп'ютарная мыш стала даступная звычайным карыстальнікам.

Наступнае развіццё камп'ютарнай мышы адбывалася ў кампаніі Apple. Тады распрацоўшчыкі яшчэ больш наблізілі канструкцыю мышы да яе сучаснага выгляду, у прыватнасці, зрабіўшы яе разборнай, для таго каб можна было выняць шарык і ачышчаць унутраныя часткі ад бруду. Акрамя таго, з мэтай спрашчэння канструкцыі новай мышы пакінулі толькі адну кнопку, да вялікага незадавальнення Энгельбарта. Вынаходнік камп'ютарнай мышы кажа, што «гэта ўсё роўна, што адсекчы чалавеку тры пальцы па той прычыне, што яны непатрэбныя».

Сягоння камп'ютарныя мышы выкарыстоўваюцца паўсюдна, стаўшы неад'емнай часткай персанальнага камп'ютара. Альтэрнатыўныя распрацоўкі, у тым ліку і сістэмы, якія адсочваюць рух галавы і вачэй карыстальніка, дагэтуль знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі. Камп'ютарная мыш працягвае развівацца: з'явіліся аптычныя і бесправадныя мышы, воданепранікальныя мышы і шматлікія іншыя цікавыя распрацоўкі.

КАМП'ЮТАРНАЯ МЫШ МОЖА ПРЫГАТАВАЦЬ КАВУ

Дацкі дызайнер Луіза Клінкер, якая цяпер працуе ў Каралеўскім каледжы мастацтваў, сумясціла кубак для кавы і камп'ютарную мыш. У выніку атрымалася MugMouse.

Калі прылада напоўнена кавай, у якасці мышы яна працуе нашмат павольней, ды і кнопак з колцам няма, але затое з яго можна піць.

MugMouse — гэта частка больш маштабнага праекту SLOWEB, у рамках якога Клінкер прыдумляе новыя спосабы ўзаемадзеяння людзей з камп'ютарам і «ўводзіць няспешнасць у жыццё неспакойных людзей».

ЖЫЦЦЁ Ў РЫТМЕ РУМБЫ

Сярод усіх танцаў Аня аддае перавагу румбе. Пад чароўную музыку, у якой чуецца і шум прыбою, і трэск нажных цыкад, і хруст каралавага пяску пад нагамі дваіх закаханых, рукі і плечы незаўважна для яе самой пачынаюць рухацца ў такт вытанчанаму рытму. Толькі ногі застаюцца нерухомымі.

Ганна Гарчакова — чэмпіён свету па спартыўных танцах на калясках.

Фігура першая: рэверанс сябрам дзяцінства

«Як было б добра ніколі не вырастаць», — марыла маленькая Аня. На яе наводзіла жах адна толькі думка, што калісьці давядзецца ўвесь час знаходзіцца сярод дарослых, якія так надакучылі ёй сваімі шкадаваннямі.

З дзецьмі было куды прасцей: нягледзячы на цяжкі дыягназ дзяўчынкі — пашкоджанне спіннога мозгу ў паяснічным аддзеле — не па гадах кемлівую Аню любіў увесь іх барысаўскі двор. А калі надвор'е было такім, што носу з дому не высунеш, гэтая вясёлая і гаманлівая кампанія збіралася ў кватэры яе бацькоў. Праводзячы дачку ў інтэрнат, тата нават крыху парадаваўся, што нарэшце зможа адпачыць ад гасцей.

— Якімі б жорсткімі ні былі дзеці, у іх ёсць адна бясспрэчная вартасць — яны ўспрымаюць усё як ёсць, — разважае Аня. — Не можаш ты ўдзельнічаць у рухомых гульнях — не трэба, галоўнае — каб з табой было цікава.

У адрозненне ад дзяцей, дарослыя мысляць стэрэатыпна: калі ў чалавека нелады са здароўем, ён абавязкова павінен быць нешчаслівым і ні на што не вартым, адпаведна і патрабаванні да яго куды меншыя.

— Я заўсёды абуралася, калі ў мяне пыталіся: «А што ты ўмееш рабіць? Сама посуд мыеш? Якая малайчына!» У такія хвіліны, навесіўшы на твар прыветлівую ўсмешку, думала: «Я вам яшчэ пакажу, хто будзе ўсё жыццё посуд мыць, а хто — працаваць».

Фігура другая: 120 крокаў да самастойнасці

Першы крок да будучай прафесіі Аня зрабіла яшчэ ў падлеткавым узросце, калі аб'явіла аб сваім жаданні працягнуць вучобу ў школе-інтэрнаце ў Івянцы: на дом выкладчыкі прыходзілі без ахвоты, а без хіміі і замежнай мовы ва ўніверсітэт не патрапіш.

Але нават лепей, чым нямецкую мову, яна засвоіла ўрокі самастойнасці.

— Адзінае, што я не адолею без дапамогі, — прыступкі. А так і падлогу мыю, і вокны, і абед гатую, і машыну з ручным кіраваннем ваджу...

На сваю самастойнасць Аня і напірала, калі ўгаворвала матулю адпусціць яе вучыцца ў Мінск. Дарэмна тая пераконвала яе, што з першай групай інваліднасці лепш займацца завочна. Аня была непахіснай, і ў хуткім часе яна ўжо трымала ў руках запаветны студэнцкі білет з надпісам «Дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, факультэт псіхалогіі, дзённае навучанне».

— Я абрала псіхалогію, бо гэтая навука адносна маладая і не вельмі добра распрацаваная. І ў мяне яшчэ ёсць шанц зрабіць сваё адкрыццё.

Праграмныя дысцыпліны даваліся студэнтцы куды лягчэй, чым дарога да ўніверсітэта, хоць трэба аддаць належнае дэканату факультэта, які дапамог дзяўчыне атрымаць месца ў самым бліжэйшым да вучэбнага корпуса інтэрнаце. Але зімой нават гэтая невялікая дыстанцыя здавалася марафонам. Выручаў грамадскі транспарт, у які Аня навучылася залазіць разам з мыліцамі.

— Я думаю аб тым, каб зноў перайсці на мыліцы, — гаворыць мая суразмоўца, якая ўжо не першы год аддае перавагу калясцы. — Але гэта вельмі пакутная фізічная праца. Вось колькі прыступак вядзе на чацвёрты паверх? Сто дваццаць. Гэта значыць, што мне, каб трапіць у сваю кватэру, трэба зрабіць сто дваццаць «адцісканняў». Ва ўніверсітэцкія гады я мела такія мускулы, што мог пазайдросціць любы мужчына. Але як толькі перасела ў каляску — мышцы сышлі.

І сапраўды, на здымках з выпускнога Аню, апранутую ў блузу 48-га памеру супраць цяперашняга 44-га, не пазнаць.

Яна вучылася выдатна, але ад чырвонага дыплома яе аддзяліў толькі адзін экзамен.

Аднак гэта не вельмі засмуціла дзяўчыну: на той момант яна ўжо была з галавой у танцах.

Фігура трэцяя: паварот, узмах рукой — усё, як у звычайным танцы

Беларускі танцавальна-аздараўленчы цэнтр — адзіная ў Еўропе ўстанова такога тыпу. У іншых краінах танцы на калясках развіваюцца пры школах, спортклубах, а ў адным нямецкім універсітэце гэта праца цэлай кафедры.

Зрэшты, гэта цяпер у беларускай нацыянальнай зборнай 14 чалавек, а ў далёкім 1997 годзе, ад якога Аня вядзе свой творчы адлік, тут была толькі адна пара. Справа ў тым, што рух «дуо» (калі абодва партнёры — з абмежаванымі магчымасцямі) толькі пачаў развівацца, а здаровыя танцоры (у танцах такія змешаныя дуэты называюць «комбі») не спяшаліся станавіцца ў пару да калясачнікаў. Гэтую прадузятасць Аня ў значнай ступені адчула на сабе: кіраўнік цэнтра Валерый Каламеец шукаў ёй першага напарніка дзевяць месяцаў!

— За гэты час можна было дзіця вынасіць! — смяецца Аня.

Яе цяперашні партнёр Ігар Кісялёў — выпускнік інстытута культуры, прафесійны харэограф — ужо трэці па ліку. Кожны з трох гадоў сумеснай работы дадаваў дуэту па гучнаму тытулу. Летась яны перамаглі на чэмпіянаце Еўропы, а сёлета сталі першымі ў еўрапейскай праграме на чэмпіянаце свету па спартыўных танцах на калясках, які прайшоў у Мінску. І хоць на спаборніцтва з'ехаліся лепшыя пары з розных куткоў планеты, Аня не глядзела ніводнага выступлення:

— Я бяру прыклад толькі са здаровых танцораў, — напэўна, гэта і ёсць галоўны прафесійны сакрэт Ганны Гарчаковай.

Такія танцы сапраўды мала чым адрозніваюцца ад звычайных: адзінае, што не дазваляе рабіць каляска, гэта рухацца бокам. Аня вельмі рада, што навучылася кіраваць сваім «транспартам» адной рукой — гэта дало магчымасць вызваліць другую, цяпер яна таксама ўдзельнічае ў танцы. А паварот вакол сваёй восі чэмпіёнка і ўвогуле робіць адным тулавам: добра, што сучасныя каляскі, прызначаныя для выступленняў, дазваляюць круціцца на месцы.

Дарэчы, такая «тэхніка» — не з танных, за яе трэба аддаць каля 3000 еўра. Пасля апошняга чэмпіянату сусветная федэрацыя танцаў на калясках вырашыла крыху «падрэзаць крылы» славянскім дуэтам, якія заўсёды ў лідарах: яны змянілі патрабаванні да «транспарту». Новаўвядзенні, здаецца, нязначныя: яны датычацца маленькіх калёсікаў, што дапамагаюць танцорам утрымліваць раўнавагу пры прагінанні назад, але каляскі давядзецца набываць новыя. Многім парам зрабіць гэта не пад сілу.

— Нават не ведаю, як мы выкруцімся, — прызнаецца Аня. — Я буду вельмі ўдзячная, калі знойдзецца добры чалавек, які падорыць мне магчымасць працягнуць творчую кар'еру.

У мінулы раз спонсара знайшоў не партнёр Ігар. Ён ніколі не шкадуе свайго часу і сілаў на Аню, якая за тры з паловай гады стала для яго амаль што сястрой.

— У мяне з Ігарам нават болей фотаздымкаў, чым з мужам, — усміхаецца мая суразмоўца.

Фігура чацвёртая: насустрач шчасцю і каханню

Аня выйшла замуж шэсць гадоў таму. У адрозненне ад яе, Аляксей не быў хворым з дзяцінства: 17-гадовым юнаком ён разбіўся на матацыкле.

— Я думаю, што тым, хто перасеў у каляску ў больш познім узросце, лягчэй уладкавацца ў жыцці. Людзі, якія маюць прыроджанае захворванне, з дзяцінства прывыклі шкадаваць сябе, лічыць, што яны ні на што не здатныя. А чалавек, які атрымаў траўму ў 20 гадоў, ужо сфарміраваны як асоба. Праўда, некаторыя так і не могуць зжыцца з думкай, што хадзіць яны ўжо не будуць, і становяцца абыякавымі да жыцця і да сябе, пачынаюць піць.

Аня ўпершыню ўбачыла Аляксея ў танцавальна-аздараўленчым цэнтры, калі пасля аварыі прайшло толькі два гады і малады чалавек яшчэ не паспеў страціць надзею і апусціць рукі. Ён таксама танцаваў, адзін час нават разам з Аняй, і па запрашэнні маскоўскай кінастудыі іх дуэт зняўся ў серыяле «Маладыя і шчаслівыя». На чэмпіянатах Лёша традыцыйна займаў высокія месцы, але не прызавыя, і вырашыўшы, што на танцы ён траціць грошай болей, чым атрымлівае, стаў шукаць іншую работу. Аднак доўгі час ён яшчэ заставаўся пры цэнтры: кіраўніцтва не хацела губляць такога «рукастага» работніка, які ўсё адрамантуе, усюды даедзе.

Машыну на ручным кіраванні Лёша водзіць выдатна. Таму ў сваёй барысаўскай цешчы ён бывае куды часцей, чым яна ў іх. А цесць любіць пахваліцца суседзям: «Да мяне сёння зяць прыедзе, дроў наколе!» — Лёшу сапраўды пад сілу любая фізічная работа.

У іх двухпакаёвай кватэры (маладая сям'я жыве ў «сацыяльным» доме, пабудаваным спецыяльна для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі) гаспадарыць таксама ён: Аляксей вядзе ўсю хатнюю бухгалтэрыю, часта стаіць ля пліты. А рабіць галубцы ўвогуле нікога не падпускае — яны ў яго атрымліваюцца не горш, чым у рэстаране.

— Бяда нашых жанчын у тым, што яны адразу

Гучная справа

СУТЭНЁРШЫ «ПЛАНЕТАРНАГА» МАШТАБУ

Тройка «мамачак» за некалькі гадоў кантролю работы прастытутак у мінскай гасцініцы «Планета» зарабіла не менш за 60 тысяч долараў.

Такая з'ява як прастытуцыя ёсць у кожнай краіне, толькі ў адных яна легалізаваная, а ў іншых, у тым ліку і ў нашай, існуе па-за законам. Прычым у некаторых выпадках закон гэты досыць жорсткі. Так, начным матылькам, якія прадаюць каханне, што называецца, без пасрэднікаў, у выпадку затрымання органамі правапарадку пагражае адміністрацыйнае пакаранне. Калі ж гаворка ідзе пра арганізаваную групу, злачынны бізнэс, які жыве і развіваецца пад кіраўніцтвам так званых «мамачак», у сілу ўступае Крымінальны кодэкс.

Паводле слоў намесніка начальніка галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрыя ДАНІЛЬЧЫКА, на працягу пяці гадоў у мінскай гасцініцы «Планета» ажыццяўлялі свой злачынны бізнэс спадарыня Клыш (імёны і прозвішчы зменены) па мянушцы «Катушка» і спадарыня Бачарова. Дамы не вынаходзілі веласіпед, і арганізавалі сабе заробак шляхам адладжанага продажу сэксуальных паслуг з дапамогай «нанятых» дзяўчынак у асобна ўзятай гасцініцы. Яны вербавалі жанчын для заняцця прастытуцыяй у гасцінічных нумарах, кантралявалі іх дзейнасць, садзейнічалі ажыццяўленню сэксуальных дзеянняў за ўзнагароджанне і адбіралі частку атрыманага ў кліентаў узнагароджання.

У нейкі момант «дуэт» папоўніўся трэцяй напарніцай, Саціенкай, якая сумяшчала некалькі абавязкаў — сама «гандлявала» каханнем і кантралявала работу іншых прастытутак, перадавала частку зароблена імі «мамачкам». Акрамя таго, Саціенка «прымала на працу» чарговых работніц, колькасць якіх вагалася ў розныя моманты ад 10 да 20, тлумачыла навічкам умовы працы. А яны былі нескладанымі.

Прадпрымальныя зводніцы распрацавалі даступную схему работы сваіх паднаглядных. Напрыклад, у адным з начных бараў «Смак ночы», што на другім паверсе гасцініцы «Планета», арыентаваным на замежных пастаяльцаў, у дзяўчат было сваё працоўнае месца — столік, за якім адбывалася «паляванне» на кліента. Кошт паслуг складаў 120 долараў за гадзіну. З гэтай сумы прастытутка павінна была 15 долараў заплаціць швейцарам за пропуск у нумары гасцініцы і парушэнне прапускнога рэжыму. Вядома, што ў бары, размешчаныя на першым і другім паверхах, а таксама ў рэстаран, што на другім паверсе, уваход свабодны. Для гасцей жыхароў гасцініцы выпісваюцца аднаразовыя пропускі. Наведванне пастаяльцаў дазваляецца з 8 да 23 гадзін.

Палову заробку дзяўчаты перадавалі «Катушцы» і Бачаровай, якія забяспечвалі «спакойны» рытм работы, браліся гасіць магчымыя канфлікты з адміністрацыяй гасцініцы і кліентамі.

Паводле паказанняў Ганны Саціенкі, якая на працягу дзесяці гадоў жыла ў Мінску і нідзе не працавала, яна зарабляла на жыццё платнымі сустрэчамі з мужчынамі. Месцам для сустрэч былі арэндаваныя кватэры. Кліенты адшукваліся па аб'явах, размешчаных у газетах. Аднойчы Ганна пазнаёмілася з Інай Клыш, якая распісала ўсе перавагі работы ў гасцініцы «Планета», маўляў, за ноч можна зарабіць асабіста сабе мінімум 100 долараў, у дадатак да якіх кліенты нярэдка робяць дарагія падарункі. Разам з тым Клыш расказала пра бяспеку, аб тым, што сама можа абараніць «дзяўчын», і, нарэшце, патлумачыла падрабязнасці работы ў бары.

Дзяўчына павінна знаходзіцца ў бары і чакаць, пакуль хто-небудзь падыдзе да яе, або падысці самой. Пасля перамоў адносна аплаты мужчына ідзе ў нумар, а хвілін праз дзесяць да яго падымаецца і дзяўчына. Адразу адбываецца разлік: грошы наперад. Калі мужчына не плаціць, дзяўчына пакідае нумар. Гэту сітуацыю дакладна адсочваюць матэрыяльна зацікаўленыя швейцары. Так, калі дзяўчына заставалася ў нумары даўжэй за дзесяць хвілін, значыць, яна працавала, і павінна была заплаціць швейцару за праход на паверх. За тое, што «заплюшчваў вочы», апошні атрымліваў 10-15 долараў, пакаёўка — каля 5-ці.

Часам жыхары гасцініцы самі прасілі знайсці прастытутку і пакідалі нумары сваіх тэлефонаў. У такім выпадку лічылася, што кліента знайшоў швейцар, і за гэта яму даплачвалася 10 долараў. З той сумы, што заставалася, палову неабходна было аддаваць «мамкам». Грошы Клыш і Бачарова дзялілі пароўну.

Склад «начных матылёў» не быў пастаянным, паколькі дзяўчыны нярэдка паддаваліся спакусе ўзяць з кліента паболей, а перадаць «босам» пменей. Факты падману высвятляліся са слоў кліентаў або дзяўчаты самі здавалі адна адну. Клыш называла гэта «пацукоўствам» і загадвала падманшчыцам «на два кіламетры не падыходзіць да гасцініцы». Самі «мамкі» інтымных паслуг, вядома ж, не аказвалі. Дзяўчат хадзіць на працу не прымушалі, але часам маглі і сказаць, што трэба выйсці.

Ні Клыш, ні Бачарова, ні Саціенка віну сваю не прызналі. Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска прысудзіў усіх траіх грамадзянак да 8 гадоў пазбаўлення волі, двух швейцараў — да 3 гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на 2 гады.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Уражанне наўздагон

ПРАФЕСАР КАЛІГРАФІІ

Яшчэ на маёй памяці той час, калі ў пачатковай школе быў такі патрэбны і такі нелюбімы многімі школьнікамі прадмет, як чыстапісанне. Ён даваў не адно культуру самога пісьма, але і вучыў паважаць, я сказаў бы любіць не толькі сам працэс пісання, але і літару, слова, сказ — як своеасаблівы каліграфічны твор. На жаль, прадмет знік, а разам з гэтым не павысілася каліграфічная культура, не пабольшала цікавасці да літаранапісання як нацыянальнага працэсу, бо, на мой погляд, справа стварэння нацыянальнага шрыфту (у тым ліку для паліграфістаў, для камп'ютара) у нас неапраўдана зацягнулася.

Гэткі зачын спатрэбіўся мне, каб сказаць словы ўражання ад выставы «Мелодыяграфія» мастака-каліграфіста Паўла Апанасавіча Семчанкі, якая вельмі натуральна знайшла прыстанішча ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прысвечанае кнізе і павінна быць поруч з кнігай. Але маё ўражанне не толькі ад выставы, але і ад усёй падзвіжніцкай дзейнасці мастака на гэтым мала араным полі, дзе ён — настойлівы і ўмелы аратай-адзіночка.

Мне здаецца, што варта назваць прозвішча Семчанкі, і кожны, хто мае дачыненне да мастацтва, да кнігі, да пісьма, здагадаецца пра каго і пра што пойдзе гаворка. Бо Павел Апанасавіч даўно і вельмі трывала, я сказаў бы — заслужана трывала заняў сваё належнае месца ў такім нялёгкім напрамку творчай дзейнасці, якім з'яўляецца мастакоўская праца з лініяй, з літарай. Гэта як у сапраўднага кампазітара — патрэба з сямі простых нот стварыць шматгранны поліфанічны твор для ўсіх магчымых музычных інструментаў. Мо таму і выставу сваю аўтар таксама назваў з музычным падтэкстам — «Мелодыяграфія»? Сапраўды, і выстава, і альбом-каталог да яе з такой жа назвай — гэта мелодыя лініі і літары, нашай беларускай літары. Мелодыя, якая складае сапраўдную сімфонію адчуванняў, пачуццяў, настрояў, эмоцый. Адно што — гэтую мелодыю можна не толькі чуць, але і бачыць, чытаць, слухаць кожны сваім эмацыйным слыхам.

У гэткай сваёй абранасці аднаасобнік Паўла Семчанка і творца, і нявольнік адначасова. Творца высокага сэнсу, які знайшоў сябе і сваё адметнае месца ў мастацтве, які бачыць сапраўдную паэзію, чуе сапраўдную мелодыю ў лініях, літарах, словах, і гэта цешыць і натхняе яго. Нявольнік ім жа самім выбранай вышыні творчай планкі, мастакоўскай патрабавальнасці. Тое, што робіць Павел Апанасавіч, нібыта знешне проста, аднак так эстэтычна прыгожа, што, убачыўшы аднойчы, захочаш сустракацца зноў і зноў з загадкавымі ўзорамі, што сатканы рукой майстра, будзеш намагацца дарэшты разгадаць сэнс і змест укладзенага ў працу паслання да нас, гледачоў. Аўтар прызнаецца, што «мне Бог не даў ні голасу, ні слыху, але падараваў здольнасць тварыць лінію».

Удала тварыць, дадам я. У ягоныя хітраспляценні ліній і літар вельмі часта натуральна ўпісаны самі літаратурныя творы. Чужыя — «Зорка Венера», «Перапіс-чык» і «Слуцкія ткачыхі» Максіма Багдановіча, «Явар ды каліна» Янкі Купалы, іншыя паэтычныя і празаічныя радкі. А часам і створаныя ім самім. Як, напрыклад, змешчанае ў альбоме-каталогу прысвячэнне (з гумаркom) і сабе, юбіляру, і свайму жыццю:

Зашчэміць іншы раз сэрца,
што не трыццаць,
Але цешыць душу, што
толькі сем дзясяткаў маю.
Я яшчэ ў снах лятаю, у туманах кружаю,
Кагосьці ў жыта нясу, а потым сцяжынку шукаю.
А раніцай на каленях ціха ў
Нябёснага пытаю:
«Навошта пакуты? Я кропку кахаю!»

А альбом-каталог дапоўнены цікавымі афарыстычнымі выказваннямі мастака «Маё сэрца падказвае мне...», дзе шчырасць слоў і прызнанняў напоўнена жыццёвай мудрасцю (якніяк Паўлу Апанасавічу семдзесят і сам ён нагадвае сівабародага мудраца са старажытных выяў, якога заўсёды слухалі і слухаліся). Зрэшты, ён умее нават назвы твораў рабіць такімі, што нагадваюць невялічкія афарызмы, філасафічныя выказванні. Ды і ў сваіх героях, каму прысвячае мастацкія творы, ён удала, па-свойму заўважае самае характэрнае і адметнае, што найбольш выразна і адэкватна сведчыць пра гэтыя выбітныя асобы айчыннай і замежнай культуры, а нас змушае зірнуць на іх з іншага, невядомага нам боку. І яшчэ адна адметнасць сэнсу ягоных літаратурных словатварэнняў: яны амаль заўсёды павучальна-выхаваўчыя, але, бадай, ніколі не дыдактычна-маралізатарскія.



Павел Семчанка — сапраўдны маэстра мелодыяграфіі, апантаны творца каліграфічнага мастацтва, майстар-чараўнік стыхіі ліній і літар. Яна, гэтая стыхія, не бязмежна анархічная, а арганізаваная творчай воляй аўтара, ягоным непаўторным талентам, і жыве яна (стыхія) у ім, а сам ён жыве ў ёй, пачуваецца свабодна і нязмушана, творча разняволена. Аднак разняволенасць не пераходзіць межы мастацкай эстэтыкі, не ператвараецца ў нейкае нечытэльнае (ні з мастацкага, ні з літаратурнага боку) практыкаванне. Сам аўтар так вызначыў ролю лініі ў ягоным творчым жыцці: «Только ёй, Величеству Линии, дано соединить внешнее и внутреннее, конечное и бесконечное, изобразительное и выразительное».

У творчасці Паўла Семчанкі свае — высокія і знітаваныя ўнутранай логікай і патрабавальнасцю крытэрыі і прынцыпы мастацкасці, густоўнасці. Я сказаў бы, што Павел Апанасавіч — мастак унутранай сканцэнтраванасці, нацыянальнай скіраванасці і познавальнай творчай адметнасці. Па ягоных працах замежнікі могуць спазнаваць нацыянальны характар беларуса, актыўна далучацца да беларускага прыгожага пісьменства. Але ж у ягонай творчасці вельмі шмат звароту да высокага мастацтва розных народаў, розных краін. І ў гэтым не паказная павага да чужога, а натуральны зварот да блізкага, дарагога, зразумелага, гэта тое, што лягло на душу, што спрыяе і нам станавіцца актыўнымі грамадзянамі сваёй краіны.

Пушкін, Шаўчэнка, Міцкевіч, Гогаль, Бах, Моцарт, Бетховен... Хіба не з гэтага раду імёны? Дарэчы, у мастацкіх музычных цыклах «Моцарт», «Бах», «Бетховен», створаных у апошнія гады, мастак пашырыў дыяпазон сваіх здольнасцяў за кошт выкарыстання металу і змешанай тэхнікі, што запатрабавала яшчэ большага напружання і выключнай дасканаласці. Мастак вытрымаў гэтыя патрабаванні з гонарам. Павел Семчанка прыхільнік класічнага не толькі ў чужой творчасці, але і ў сваёй уласнай, ён удала звяртаецца, напрыклад, да шрыфту Статута Вялікага Княства Літоўскага.

Як на маё меркаванне, то ўмельства прафесара Паўла Семчанкі (ён дваццаць два гады выкладаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў) валодаць лініяй, чуць яе мелодыю не мае роўных у нашым беларускім мастацтве. Яго, былога токара Мінскага радыёзавода, і сапраўды можна назваць прафесарам каліграфіі. З простага лініі ён здольны, умее і робіць цуды, вытварае (у добрым сэнсе гэтага слова) усё, што хоча, на што падштурхне няўрымслівая душа. Пад ягонай рукой звыклыя лініі здольны ператварацца ў сімфонію сэнсу, зместу, дакладнай мастацкай формы. Гэтая чароўнасць ператварэння — найпершая адметнасць творчай манеры Паўла Семчанкі. Да таго ж у гэтым каліграфапісанні прысутнічае высокая і сапраўдная шляхетнасць, выкшталцонасць, культура, дасканаласць. Думаю, што для Паўла Апанасавіча творчае жыццё — гэта магчымасць ва ўсёй паўнаце выявіць бязмежныя магчымасці проста лініі і літар. А колькі гэта каштуе, ведае толькі ён сам. Нездарма Павел Семчанка — Асоба ў нашым мастацтве.

Дык мо нам варта зноў вярнуцца да чыстапісання? Вядома ж, такое не адбудзецца. Таму давайце будзем напоўніцу чэрпаць эмоцыі і ўражанні са шчодрага на сапраўдныя падарункі мастацкага куфэрка маэстра каліграфічнай мелодыяграфіі Паўла Апанасавіча Семчанкі.

Анатоль БУТЭВІЧ.

Крымінал

РАКАВАЯ СПРЭЧКА

Спрэчка, што ўзнікла паміж роднымі братамі ў вёсцы Мінканцы Воранаўскага раёна, для абодвух яе ўдзельнікаў стала фатальнай.

Здарэнне адбылося ў ноч на чацвер: 52-гадовы вясковец у сябе дома пасля застолля, паспрачаўшыся з 48-гадовым братам, накінуўся на апошняга з кулакамі. Пацярпелы, якому добра дасталося, сканаў на месцы здарэння. Калі ж старэйшы брат зразумеў, што нарабіў, наклаў на сябе рукі — павесіўся. Абодва браты працавалі ў сельгасвытворчым кааператыве.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЯРБОЎШЧЫК ПАД СЛЕДСТВАМ

У дачыненні да 34-гадовага жыхара Слуцка папярэднім расследаваннем мясцовага РАУС узбуджана крымінальная справа: гэты непрацуючы мужчына падазраецца ў гандлі жывым таварам.

У прыватнасці, як мяркуецца, ён мае дачыненне да вярбоўкі і вывазу ў Польшчу для сэксуальнай эксплуатацыі дзвюх сваіх зямлячак. У чэрвені 2003 года падазронаму ўдалося схіліць дзвюх 19-гадовых беларусак, якія нідзе не працавалі, да замежнага ваяжу.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ЮНЫ ХУЛІГАН З ПІСТАЛЕТАМ

Ленінскі РАУС горада Магілёва распачаў крымінальную справу ў дачыненні да 16-гадовага навучэнца прафесійна-тэхнічнага ліцэя. Ён абвінавачваецца ў хуліганстве.

Увечары на бульвары Леніна ў цэнтры Магілёва хлопец двойчы стрэліў з пнеўматычнага пісталета ў навучэнца іншага ліцэя. Прычым малодшы страляў у старэйшага, 18-гадовага. Малады чалавек, паведамілі ў прэс-цэнтры УУС Магілёўскага аблвыканкама, атрымаў цялесныя пашкоджанні.

Алена КАЗЛОВА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПЕРШЫНСТВО МОЛАДЗІ

Раней мы інфармавалі вас, што званні чэмпіёнаў краіны па шашках-100 сярод моладзі ўзросам да 20 гадоў атрымалі сталічныя нацыянальны майстар Вольга Федаровіч (у турніры юнакоў) і яе сястра-блізня Дар'я — міжнародны майстар па рускіх шашках (у групе дзяўчынак). На другім—трэцім прызавых месцах — кандыдаты ў майстры спорту Я. Маеўскі з Гродна, мінчане Д. Фадзееў (юніёры), М. Храмцова і другаразрадніца В. Хвашчынская з Бабруйска (юніёркі).

Прайшло таксама першынство моладзі па шашках-64. Тут вызначаліся Д. Федаровіч, кандыдат у майстры з Брэста В. Эйсмант і Я. Маеўскі (юнакі), В. Хвашчынская, В. Федаровіч і кандыдат у майстры Г. Крашко са Слоніма (дзяўчынкі).

РАЗВЯЖЫ, КАЛІ ДУЖЫ

Вашу сілу гульні ў вашы дапамогуць праверыць чарговыя заданні аўтарскага конкурсу — шостага па ліку, гэтым разам майстра ФМЖД Віктара Шульгі (Мінск) і на яго прызы:



№ 3. БЕЛЫЯ: a1, a5, b2, c1, e3, f4, g1, h2, h4 (9). ЧОРНЫЯ: a3, b8, c3, c5, d4, d8, e7, f2, f6 (9).

№ 4. БЕЛЫЯ: b4, c7, d6, e7, g3, h4, h6 (7). ЧОРНЫЯ: a3, a5, b2, b8, c3, d2, e3, h8 (8).

У абедзвюх камбінацыях белыя пачынаюць і выйграюць.

А ў рамках бліца-42/4, пераможца якога таксама будзе адзначаны, развяжыце міні-праблему майстра практычнай гульні мінчаніна Віталя Варушылы:



БЕЛЫЯ: b2, b4, f6, g7 (4). ЧОРНЫЯ: a5, d2, d6, f2, f4, h8 (6). Пашукайце перавагу за белых.

Тэрмін для адказаў звычайны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

САМАЯ ЛЕПШАЯ

У мінулым выпуску мы паведамілі аб выніках другога чэмпіянату свету па шашачнай кампазіцыі, у якім перамог наш зямляк Уладзімір Матус (ён зараз жыве і працуе ў Маскве). Аднак суддзямі Яапам Бюсам (Германія), Мікалаем Грушэўскім (Беларусь) і Яўграфам Зубавым (Расія) самай лепшай прызнана мініяцюра Аляксандра Маісеева з ЗША (80 ачкоў), але па сукупнасці ўсіх твораў ён заваяваў сярэбраны медаль. Вам будзе прыемна пазнаёміцца з ёю:

БЕЛЫЯ: 11, 20, 21, 28, 31, 40, 48 (7). ЧОРНЫЯ: 6, 10, 12, 18, 19, 29, 39 (7).

17, 15, 4 (26) 11, 2 (23 A, 41Ba) 43, 34, 36x. A (34) 29 (23) 19 і далей, як у варыянце B (34) 29 (41 b) 193 (44) 43 (50 B1, C) 39, 46x. B1 (49) 23, 46x. C (47) 38, 49x. A (42, 43) 8 (33) 2 (38) 8x. b (44) 43 (50 b1) 39x. b1 (49) 193x.

Дарэчы, экс-масквіч А. Маісееў вядомы і як практычны ігрок: ён стаў чэмпіёнам першых Усесветных інтэлектуальных гульняў у Пекіне па амерыканскіх шашках (чэкерсе). Хутка мы апублікуем адну з яго партый у чэкерс з растлумачэннем правілаў гэтай самай папулярнай у Амерыцы настольнай гульні.

СУД УЛІЧЫЎ УСЁ

Толькі судом Калінкавіцкага раёна і толькі за апошні час вынесены шэраг прысудаў браканьерам за здабычу рыбы забароненымі прыладамі рыбалоўства.

У прыватнасці, аднаму з парушальнікаў было прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год і шэсць месяцаў з выпрабавальным тэрмінам на адзін год. Адначасова яму трэба пакрыць нанесены ўрон у памеры больш за 4,2 мільёна рублёў. Яшчэ тры браканьеры пазбаўленыя волі тэрмінам на два гады кожны з выпрабавальным тэрмінам на адзін год і пакрыццём у салідарным парадку нанесенага ўрону ў памеры амаль на 4 мільёны рублёў. Іншыя двое грамадзян атрымалі такое ж пакаранне, а на пакрыццё ўрону ім давядзецца выкласці разам больш за 1,8 мільёна рублёў. Па два гады ўмоўна кожнаму атрымала за браканьерскія справы яшчэ адна тройца «бывалых». А на пакрыццё ўрону ім разам патрэбна будзе ўзяць з сямейнага бюджэту больш за 5,7 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У АРХІЎ НЕ ЗДАЕЦЦА!

«Звязда» летам 1942 і з зімы 1943 года выходзіла на акупаванай ворагам тэрыторыі Беларусі. Памяць аб неардынарных падзеях таго трывожнага часу застаецца жывою і сёння.

Пры актыўным удзеле рэдакцыі ў сталіцы ўстаноўлена стэла, прысвечаная Уладзіміру Сцяпанавічу Амельянюку — першаму рэдактару і выдаўцу «Звязды» ў Мінску ва ўмовах жорсткага нямецкага акупацыйнага рэжыму. Помнік атрымаў прапіску на тым месцы, дзе ў маі 1942 г. Амельянюк загінуў у перастрэлцы з варожай паліцыяй. Новыя надрукаваныя гісторыкамі матэрыяламі сведчаць аб наступным. Незадоўга да трагедыі Амельянюк накіраваў у Крэмль на імя Сталіна патрыятычнае пісьмо. Некаторыя даследчыкі доўгі перыяд сцвярджалі, што яно, быццам бы трапіўшы ў нямецкія карныя органы, стала пачаткам шэрагу арыштаў. Усё гэта не адпавядае праўдзе. Адзначаны ліст знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у справаводстве аднаго з партызанскіх атрадаў.

У «Звяздзе» ваеннага часу змешчана паведамленне аб страшнай трагедыі беларускага народа — смерці народнага паэта Янкі Купалы. З аднаго боку, перад намі, безумоўна, жалобная вестка, а з другога — пацвярджанне сувязі з Вялікай зямлёй не толькі газеты, але і ўсяго падполля ў цэлым. За гэтым стаіць прызнанне мінскага антыфашысцкага руху ў якасці важнага фактару Вялікай Айчыннай вайны.

Цяжка пераацаніць значэнне дзейнасці «Звязды» па ўвекавечанні памяці Івана Кірылавіча Кавалёва як арганізатара і кіраўніка Мінскага антыфашысцкага падполля, незаслужана абыгнанага ў час вайны па неправераных звестках. Дзясяткі артыкулаў прысвечаны гэтаму вельмі важнаму пытанню. Першы з іх пад назвай «І.К. Кавалёў — сакратар Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б» надрукаваны 09.05.1990. Пад ім стаяць подпісы членаў спецыяльнай камісіі па дадатковым вывучэнні актуальных праблем гісторыі Мінскага партыйнага падполля і ролі ў ім І.К. Кавалёва, сярод якіх: А.Я. Андрэеў, А.М. Літвін, І.С. Лысакоўскі і аўтар гэтых радкоў. Матэрыял выйшаў амаль адразу пасля рэабілітацыі І.К. Кавалёва як падпольшчыка, кіраўніка падполля і грамадзяніна. Артыкулу адведзена цэлая паласа, упершыню змешчана і фота І.К. Кавалёва, зробленае летам 1939 г. падчас заканчэння вучобы ў Мінску ў Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школе Беларусі. Першымі чытачамі гэтага нумара сталі жонка Матрона Кузьмінічна і дзеці падпольшчыка, якія чакалі гэтага паведамлення амаль 50 гадоў. «Звязда» — першая ў Беларусі газета, якая паведаміла грамадскасці скарочанае апісанне жыцця і дзейнасці І.К. Кавалёва. (аўтары В.Дз. Селяменеў і аўтар гэтых радкоў). На свае публікацыі рэдакцыя атрымала шмат станоўчых водгукаў, у тым ліку ад былога мінскага падпольшчыка У.І. Борсука. Ён шчыра падзякаваў рэдакцыю, папрасіў прадоўжыць публікацыю матэрыялаў аб перыпетыях гісторыі не толькі Кавалёва, але і ўсяго падполля ў цэлым.

У сталіцы ўстаноўлена стэла, прысвечаная Уладзіміру Сцяпанавічу Амельянюку — першаму рэдактару і выдаўцу «Звязды» ў Мінску ва ўмовах жорсткага нямецкага акупацыйнага рэжыму.

Аб укладзе «Звязды» ў шматгранную ваенную тэму сведчыць адзін толькі пералік змешчаных у ёй артыкулаў: «Тайна «Звязды» разгадавалася ў Маскве» (07.06.1997), «Ён быў сапраўдным патрыётам. А прызнанне прыйшло праз 50 гадоў» (19.07.1997), «Белае і чорнае» (07.07.2000), «Як нямецкая крымінальная паліцыя расследавала забойства генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ» (02.10.2001), «Сакрэты мінскага падпольнага цэнтра» (06.11.2001), «Вяртанне праўды» (10.09.2003), «Алёна Мазанік — імя легендарнае» (06.04.2004), «Народны герой» (10.08.2008) і інш.

Газета пастаянна знаёміла чытача з новымі дакументамі. Адзін з іх расказвае аб засадзе партызан супраць Кубэ ў Налібоцкай пушчы зімою 1943 г. («Звязда» ад 28.05.2002). У той аперацыі было ліквідавана амаль усё кіраўніцтва нямецкай акругі. Самога Кубэ ў абозе не аказалася. Кіраўнік бою легендарны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны К. Арлоўскі ў ходзе сутычкі атрымаў цяжкае раненне, у выніку якога яму прыйшлося ампутаваць кісці абедзвюх рук. Дакумент захоўваецца ў рукапісных матэрыялах да кнігі Л.Ф. Цанава «Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков» (1941 — 1944). Яго публікацыя ў «Звяздзе» была першай у гісторыі.

Летапіс «Звязды» адводзіць шмат месца і асвятленню гісторыі Мінскага гета. Няшчасныя людзі не толькі змагаліся за жыццё, але і ўдзельнічалі ў антыфашысцкім супраціўленні. Болей за 1500 з іх выратаваліся з палону, значная частка ўлілася ў партызанскія і падпольныя фарміраванні. Гета ўзнікае летам 1941 г. і трагічна гіне восенню 1943 г. Шмат артыкулаў прысвяціў гэтаму пытанню доктар гістарычных навук, прафесар Э. Іофэ. Газета разам з іншымі калектывамі ўдзельнічала ў абмеркаванні праекта стварэння мемарыяла ахвяр ліквідацыі намесніка Гітлера ў Беларусі Вільгельма Кубэ чакалі вылету на Вялікую зямлю Алёна Мазанік і Марыя Осіпава. Унікальнасць сітуацыі і ў сустрэчы ў гэтым месцы чатырох Герояў Савецкага Саюза, якія пачыналі і завяршылі «паляванне» на гаўляйтара. Прапанова газеты аднавіць домік Вярбіцкіх (разбураны ў 1984 г.) засталася непачутай. У выніку да гэтага часу не рэалізавана ўнікальная магчымасць мемарыялізацыі адной з гераічных старонак мінскага антыфашысцкага падполля.

Газета, яе калектыў у розных формах аддае належнае І.Ф. Клімаву, К.Ш. Дамараду, І.М. Ігнаценку, А.А. Філімонаву, А.Ф. Хацкевічу, І.М. Цімчуку, В.Ф. Мацюшка, С.К. Ляшчыне, Я.М. Савіцкай, іншым вучоным, грамадскім дзеячам, ветэранам вайны, што ўнеслі значны ўклад у аднаўленне праўдзівай гісторыі Мінскага падполля, у вяртанне добрага імя дзясяткаў незаслужана абыгланых і забытых людзей. Прызнаннем вялікіх заслуг «Звязды» ў ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі, у тым ліку і на матэрыялах знакамітага падполля, стала прысваенне адной з вуліц Мінска назвы «Праспект газеты «Звязда» (16.06.2005).

У заключэнне хацелася б адзначыць наступнае. На старонках газеты змешчаны розныя артыкулы. Іх аўтары, незалежна ад узросту, стажу навуковай працы, перадаючы ў «Звязду» свае матэрыялы, як правіла, адчуваюць пэўныя хваляванні. Гэта аб'ектыўна, бо яны разумеюць: іх творы атрымоўваюць доступ у газету, якая брала ўдзел у ваенных дзеяннях па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Яўген БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Экскурсаводы краязнаўчага музея мінскай гімназіі № 25 Сцяпан МАНКЕВІЧ і Лізавета ЕРМАКОВА. Гэты нумар падпольнай «Звязды» яны перадалі ў архіў нашай рэдакцыі.

Інфарм-укол

Бананы ёсць за што любіць

Бананы маюць збалансаваны вітамінны склад. У іх утрымліваецца вялікая колькасць вітамінаў Е і С, а колькасць вітаміну В6 складае не менш за чвэрць рэкамендаванай штодзённай дозы.

У бананах, як і ў бульбе, шмат крухмалу, але ўтрыманне гэтага рэчыва ўсё ж такі меншае дзесьці ў 7,5 раза. Абодва прадукты добрыя крыніцы калію, але бананы крыху саступаюць па яго ўтрыманні. На жаль, хворым на цукровы дыябет ужываць бананы нельга — надта многа ў іх цукрозы, надта мала фруктозы і глюкозы. Затое ў рацыёне ўсіх іншых людзей бананы вельмі пажаданыя.

У чым шкода газіроўкі?

Газаваныя напоі — гэта тое, ад чаго дзеці не хочуць адмаўляцца не толькі летам. Аднак дарослым лепей ведаць усю праўду пра гэту «ваду» і імкнуцца рэгламентаваць ужыванне апошняй.

Большасць салодкіх газаваных напояў не спаталяюць, а выклікаюць смагу. Усе яны ўтрымліваюць або вельмі вялікую колькасць цукру, або яго заменнікі — аспартам, цыкламат, сахарын. Акрамя салодкіх дабавак, у многія напоі ўваходзіць кафеін і хінін, лімонная кіслата (Е 330) і артафосфарная кіслата (Е 338) для падкіслення.

Лішак соляў фосфару, які ўтрымліваецца ў газаваных напоях, аказвае адмоўны ўплыў на засваенне кальцыю. Ва ўсіх гэтых напоях абавязкова прысутнічаюць кансерванты: бензанат натрыю (Е 211), або сарбіт калію (Е 202), фарбавальнікі, араматызатары. Усе пералічаныя рэчывы, а таксама самі газы, аказваюць неспрыяльнае ўздзеянне на слізістую абалонку страўніка.

БАДы з чарніцамі замяняюць ягады

На жаль, у нас не заўсёды ёсць магчымасць ужываць чарніцы адразу пасля іх збору, а ў працэсе захоўвання большая частка вітамінаў губляецца.

Таму ў прафілактычных мэтах можна ўжываць БАДы з экстрактам чарніц, паколькі гэта дабаўка ўключае ў сябе комплекс вітамінаў, мінеральных і іншых рэчываў, якія паляпшаюць кровазварот у сятчатцы вока. Дарэчы, чарніцы рэкамендуюцца не толькі для паляпшэння зроку, але і пры страўнікава-кішачных і сардэчна-сасудзістых захворваннях, цукровым дыябеце.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»
«26» декабря 2008 года в 11.10 по адресу:
г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион

по продаже недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», находящегося в собственности поселка Плещеницы, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания, составляющих единые предметы аукциона

На аукционные торги выставляются:
Лот № 1. Здание склада 4/31 (инв. № 601/С-13456), общей площадью 480,8 кв.м, 1937 года постройки, и **право заключения договора аренды земельного участка**, отведенного для его обслуживания, площадью 0,4122 га, сроком на 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона: 83 038 099 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 73 264 837 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 9 773 262 рубля). **Начальная цена продажи недвижимого имущества снижена на 20 %. Сумма задатка** предмета аукциона 8 000 000 рублей.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 22 октября 2008 г. № 200.**

Лот № 2. Здание учебного класса б/н (инв. № 601/С-13920), общей площадью 722,3 кв.м, 1989 года постройки, и **право заключения договора аренды земельного участка**, отведенного для его обслуживания, площадью 0,2845 га, сроком на 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона: 71 338 295 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 64 592 800 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 6 745 495 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона 5 000 000 рублей.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 22 октября 2008 г. № 200.**

Лот № 3. Здание свинарника 4/137 (инв. № 601/С-13463), общей площадью 843,3 кв.м, 1986 года постройки, и **право заключения договора аренды земельного участка**, отведенного для его обслуживания, площадью 0,3554 га, сроком на 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона 130 607 112 рублей (в том числе: имущество – 122 303 546 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 8 303 566 рублей). **Начальная цена продажи недвижимого имущества снижена на 20 %. Сумма задатка** предмета аукциона 10 000 000 рублей.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 15 августа 2008 г. № 152.**

Продавец недвижимого имущества: Плещеницкий поселковый исполнительный комитет, Минская область, Логойский район, г.п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, 7, тел. (801774) 71435, 71035.

Арендодатель земельных участков: Логойский районный исполнительный комитет.

Земельные участки отведены для содержания и обслуживания продаваемых объектов.

1. В течение 2 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Тэлесеткі

АНТ РАЗДАЎ БЕЛАРУСКІМ АРТЫСТАМ АНТЫПРЭМІІ

Атрымліваючы запрашэнні на ўручэнне прэмій «Сярэбраны грамафон», папулярныя артысты па звычцы рыхтаваліся праходзіць па чырвонай дарожцы, усміхацца, кланяцца са сцэны і ззяць у свецкай хроніцы ў шыкоўных уборах ды ўпрыгажэннях. Сапраўдны фармат мерапрыемства да апошняга трымаўся ў сакрэце.

Ля ўвахода ў дарагі гатэль, абраны месцам здымак, «зорак» сустракалі фанаты з плакатамі «Аддам сябе ў добрыя рукі — Топлес не прапаноўваць», «Дзядзя Ваня, фінансавы крызіс, вярні 50000! Ала П», «Хрусталёў — наша ўсё» ды іншымі прывабнымі надпісамі. Чырвоная дарожка, праўда, прысутнічала, таксама як і фотарэпарцёры. Так што ў зале прысутныя крыху разняволіліся ў знаёмай атмасферы — сцэна, вядучыя, калегі і сябры, прызавыя статуэткі, «прамыя ўключэнні» з абласных цэнтраў, якія галасавалі за любімых выканаўцаў... Але спакой знік, калі вядучыя абвясцілі назву першай намінацыі, і стала зразумела, што «Сярэбраны грамафон» па сутнасці з'яўляецца антыпрэміяй, і падазрона нагадвае «Сярэбраную галёшу».

Напрыклад, на атрыманне «Сярэбранага графамана» ўдзячныя слухачы вылучылі Пятра Елфімава — за радкі з песні пра анёла — «Ласково возьмешь в губы жизнь мою». Атрымліваючы запаветны грамафон з рук доктара Сайкова, артыст знайшоў усё ж сілы пасмяяцца з сябе самога. Як высветлілася далей, Пятру, як першаму з адзначаных, яшчэ пашанцавала. Наступных кандыдатаў публіка, ужо разумеючы, чаго чакаць, сустракала спачувальным рогатам і жартачкамі рознай ступені дабрыні.

Буру эмоцый выклікала намінацыя «Звезданутая рэклама». На ўзнагароду прэтэндавалі тры чалавекі: Сяргей Кухто з хрустальнымі бакаламі, Алеся з астралагічна-картачнымі тэлефоннымі дарадцамі і Ілья Міцько, які стаў новым сімвалам МТС. Апошняму дасталося па поўнай праграме. «Вы толькі ўзгадайце, як гэты ролік напоўнены сэнсам, — іранізавалі вядучыя Сяргей Дарафееў і Марыя Лемешава. — Тут і драматургія, і мараль, і сямейныя каштоўнасці, і сцэнка «хворая кобра на прыёме ў лагапеда», і непаўторны густ!». Перамагла... узгаданая ў роліку Жанэт, у якой доўга спрабавалі дазнацца, што ж такое «нешта» з яе падабаецца Міцько? Спявачка выкруцілася, запэўніўшы, што асабіста ёй цяпер падабаецца УСЁ з Ілы.

У рэжыме «Супербліц» былі ўручаныя адразу тры прэміі — «The Best of the бюст» атрымала Алена Грышанава, якая не адным выканальніцкім талентам прыцягвае пільную ўвагу моцнай паловы чалавецтва да сваіх кліпаў, «32 жамчужыны» віталі работу стаматолагаў над вобразам па-галівудску ўсмешлівай Іны Афанасьевай, а «Глянец» за лепшую лысіну атрымаў, нягледзячы на абурэнне прыхільнікаў Аляксандра Саладухі, сёлетні ўдзельнік «Новай хвалі» Дзядзя Ваня.

Смеючыся з вядомых артыстаў, тэлевізійнікі не забыліся і пра сябе, любімых. Так, у намінацыі «Поўны блізнюк або першы клон комам» адным з кандыдатаў на ўзнагароду стаў Ягор Хрусталёў — «запаволеная версія Андрэя Малахава». Таксама Хрусталёў узяў на сябе смеласць атрымаць прыз у намінацыі «Допінг года, ці 100 грамаў для храбрасці» — замест адсутнага на цырымоніі футбольнага арбітра Сяргея Шмоліка, чыё судзейства ў нецвярозым выглядзе балельшчыкі дагэтуль памятаюць як анекдот. «Ягор таксама любіць.... Няхай забірае», — пракаментавалі лёс прыза вядучыя.

«Зоркі» было расслабіліся, спадзеючыся, што самае страшнае скончылася — але арганізатары пастараліся, каб прэмій хапіла на ўсіх. Намінацыю «Туалет года» абвясціў у прамым уключэнні са студыі вядучы АНТ Яўген Лашкоўскі. «Уручаецца прэмія імя мяне. Лаўрэаты — гурт «Тяни-Толкай, які прыходзіць на здымкі ў адзенні з дома», — зазначыў вядучы, адчытаўшы блок навінаў, устаў з-за стала... і парадаваў вока спалучэннем пінжака, гальштука і сямейных трусоў.

Хто аказаўся лепшымі кісламалочнымі братамі — браты Хлястовы ці браты Калдуны, а мо ўвогуле сёстры Груздзевы, якая падзея ў канцэртным жыцці стала найярчэйшым уражаннем года і хто з артыстаў з гонарам працягвае традыцыі «залатога Філіпа Бядросавіча» — усё гэта ў падрабязнасцях АНТ пакажа 19 снежня.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадстаўлена тэлеканалам АНТ.

Яе абралі сярод шаснаццаці прэтэндэнтак на карону. Кожная прадстаўніца дагэтуль была пераможцай конкурсу свайго факультэта. А заключны этап адбыўся на сцэне канцэртнай залы «Мінск». Сваю маладосць, талент і адукацыю, а таксама здольнасці маладзі лепей за ўсіх прадэманстравала студэнтка трэцяга курса эканамічнага факультэта Ірына ГРЫГАЛЬЧЫК (на здымку ўверсе). Каранаваная студэнтка насамрэч вельмі адораная асоба. Яе мама Наталля Іванаўна ў кароткім інтэрв'ю па завяршэнні конкурсу «Міс БДУ» паведаміла, што дачка закончыла сталічную гімназію з залатым медалём і была адзінай абітурыенткай у Беларусі, якая напісала тэсціраванне па матэматыцы на 100 балаў. Наступны выхад новакаранаванай універсітэцкай асобы чакаецца на міжінстытуцкім конкурсе «Каралева Вясна», а цяпер яна паедзе ў выйграны тур па Еўропе.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выстава

Лепш глядзець, чым уяўляць

Чацвёра мастакоў-графікаў, якія заявілі пра сябе на міжнароднай арэне і творчасці якіх не патрабуецца рэкамендацыя, аб'ядналіся ў мастацкай выставе «Графічныя варыяцыі».

Вось іх імёны: Валерый Славук, які ўжо лічыцца класікам беларускай графікі, Юрый Якавенка, які любіць эксперыменты, Мікалай Казлоў, які шырока вядомы дзякуючы ілюстрацыям да шматлікіх кніг, і больш малады Раман Сустаў, персанажы якога нібыта прыйшлі да нас з нейкага фантастычнага свету. Пра кожнага з іх варта распавядаць асобна. Але іх графіка сапраўды вартая таго, каб пра яе ведалі не толькі ў Беларусі. Гэтая выстава, напрыклад, адкрылася ў офісе АБСЕ ў Мінску. І свае могуць пабачыць, і замежнікі маюць магчымасць даведацца пра нашу краіну. Таму што кожны з гэтай чацвёркі так ці інакш адлюстроўвае тыя эмоцыі і ўнутраны свет, які нараджаецца ў іх на гэтай зямлі. Ці то гарманічны свет шчырых памкненняў Славука, які як выкладчык выхаваў не адно пакаленне беларускіх графікаў. Ці гэта Якавенка са сваім стаўленнем да вялікага свету — на выставе можна ўбачыць шэсць яго новых прац з серыі «Музы». Ці Казлоў са сваім «Фантазусам» — прадстаўлены чатыры працы з гэтай серыі. Ці літаграфіі і афорты Сустава, якія былі выкананы ў 2008 годзе. Але самае прыемнае ў гэтай выставе тое, што ўваход на яе абсалютна свабодны.

Мастацтва плюс рамяство

Складаюць сутнасць майстэрства мастака-кераміста Валерыя Калтыгіна

«Кераміка — складаны і шматгранны від мастацтва, які заснаваны на сур'ёзным, даволі глыбокім і дакладным веданні рамяства, тэхналогіі керамічных матэрыялаў», — сцвярджае Валерый Аркадзьевіч. Акрамя таго, за ім яшчэ мастацкая адукацыя і вялікі вопыт працы. Усё гэта спалучаецца ў яго творах, якія можна ўбачыць у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі.

«Варыяцыі на тэму...» Валерыя Калтыгіна выдаюць у ім імправізатара, які не абмяжоўвае сябе жорсткімі рамкамі, калі шукае вырашэнне тэмы. Аднак пры гэтым ён шукае ўзаемадзеяння з матэрыялам, адзінства з ім, выкарыстоўваючы яго асаблівасці, такія, як мяккасць, чуллівасць да чалавечых рук. Гэта маглі ацаніць прыхільнікі творчасці Калтыгіна не толькі на радзіме, але і на міжнародных сімпозіумах па кераміцы, у якіх удзельнічаў майстар. Ён і сам неаднаразова станавіўся арганізатарам пленэраў керамістаў. «З гадамі ў мяне сфарміраваліся свае погляды на працу з керамічным матэрыялам, выпрацаваўся свой стыль вобразных рашэнняў, — падкрэслівае мастак. — І хоць мае веды ў галіне керамікі даволі шырокія, я ўсё роўна ўвесь час адчуваю недахоп ведаў і імкнуся ўдасканальваць сваё майстэрства, якому можна вучыцца ўсё жыццё».

Ларыса ЦІМОШЫК.

Наш фармат

Таранціна не прыехаў на фестываль смешнага відэа «КВеНцін-2008»

Але беларусы і без яго няблага павесяліліся

Аматары і знаўцы смешнага ў Мінску не перавяліся. Гэта пацвердзіў І адкрыты фестываль смешнага відэа «КВеНцін-2008», які нядаўна прайшоў у беларускай сталіцы.

«Першы фестываль адразу стаў міжнародным, — расказвае прэс-сакратар беларускага КВЗ Аляксандра Прылоўская. — Нават міжкантынентальным, бо ўдзел у ім узялі беларускія рэгіянальныя тэлеканалы, каманды КВЗ і незалежныя аўтарскія калектывы з нашай рэспублікі, а таксама конкурсныя работы прыйшлі з Расіі, Украіны і нават ЗША». Журы, якое вызначала пераможцаў у кожнай намінацыі, таксама было міжнародным. А сам фестываль натуральным чынам сумясціўся з гульнёй Еўралігі КВЗ. Менавіта ў размінцы гэтай гульні каманды, напрыклад, далі свае тлумачэнні, чаму на фестываль не прыехаў Квенцін Таранціна:

— Андрэй Мікалаевіч (Мукавозчык, вядучы беларускага КВЗ. — **Аўт**.) не захацеў па сцэнарыю Квенціна ператварацца ў вампіра і махаць мячом, — меркавала каманда «V.I.P».

— Не, у яго проста елкі, — удакладніў у адказ сам Мукавозчык.

Потым гледачы змаглі ацаніць творчасць украінскіх калег вясёлага і знаходлівага руху — былі прадэманстраваныя лепшыя ролікі «Вінніцыянскага фестывалю» (г. Вінніца, Украіна). І толькі пасля гэтага публіка і журы настроіліся на ацэнку конкурсных работ.

У намінацыі «Мультыплікацыя» перамог арыгінальны праект «Белка і Стрэлка» — новая версія знакамітага палёту ў космас, прадстаўленая маскоўскім аб'яднаннем «Мультфільмай.нет». У раздзеле «Рэгіянальнае відэа» першынствавалі прадстаўнікі Салігорска, якія зрабілі «Небяспечны рэпартаж»... у процівагазе. Самы ўдалы «Відэакліп» атрымаўся ролік каманды КВЗ «Гораздо» з Брэста — на песню гурта «Беларускія песняры» «Мая душа», а самае адметнае «Іншае кіно» — прагулку пад паланез Агінскага — паказала каманда КВЗ «Благо». Таксама журы вызначыла пераможцаў у намінацыях «Відэакалаж» (сумяшчэнне кадраў з розных фільмаў найлепшым атрымалася ў віцябчан з каманды «Pit-stop»), «Агучка» (фрагменты фільма «Людзі ў чорным» пераагучыла «Беларуская зборная»), «Рэклама» (пародыя на рэкламны ролік сотавай сувязі ад каманды «Маторы» з Віцебска). «Сапраўднае мастацтва — гэта калі разумееш, у каго крадзеш, што крадзеш і навошта ты гэта робіш, — рэзюмаваў свае ўражанні член журы, рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў. — Хацелася б параіць усім, хто будзе далей здымаць кіно, часцей узгадваць гэту фразу. Бо здымаць смешнае кіно — гэта адказна і сур'ёзна».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.17	15.48	7.31
Віцебск —	8.14	15.30	7.16
Магілёў —	8.07	15.38	7.31
Гомель —	7.56	15.43	7.47
Брэст —	8.31	16.04	7.33
Гродна —	8.23	16.13	7.50

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Барыса, Васіля, Гаўрылы, Захара, Івана, Мікалая, Рамана, Сяргея, Усевалада, Якава.*
К. *Марыі, Юліі, Андрэя, Данізля, Рыгора.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Дзве даты

10 снежня

1963 год — пачала дзейнічаць 1-я чарга Салігорскага калійнага камбіната (з 1975 года — вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій»).

1948 год — Генеральная асамблея ААН прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека.

Цытата дня:

«Парады старых людзей — як зімовае сонца: свецяць ды не грэюць».

Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.

БЯСПЛОДНАСЦЬ

Бясплоднасць — стан жанчыны ці мужчыны, пры якім яны не могуць мець дзяцей. У народнай культуры да бясплоднасці ставіліся як да пакарання за нерэгламентаваныя паводзіны, парушэнне забаронаў (напрыклад, інтымныя зносіны ў пост і г.д.), а таксама як да выніку «наведзенай псоты», бацькоўскага праклёну ці як знак лёсу. У народзе да бясплоднасці ставіліся як да чагосьці саромнага, грэшнага. Лічылася, што бясплодныя людзі, якімі б добрымі яны ні былі, пасля смерці не змогуць трапіць у рай.

● У старадаўняй часы бясплоднасць практычна паўсюдна адносілі толькі да жанчыны. «За вочы» яе называлі «пустой» ці «ялавай».

● Немагчымасць нарадзіць дзіця, працягнуць род адбівалася на сацыяльным статусе такой жанчыны. Бясплодным жанчынам катэгарычна забаранялася ўдзельнічаць у каляндарных святах (напрыклад, на Каляды альбо ходзіць дварамі, на Масленіцу хадзіць да парадзіх і наважонаў і г. д.) і сямейна-родавых абрадах (напрыклад, быць хроснай, выпякаць вясельны каравай і г.д.). Ёй была наканавана адна даволі сумная роля: прымаць самы актыўны ўдзел у пахавальна-памінальных абрадах.

● Каб «выправіць» такое становішча, жанчыны выконвалі шэраг самых разнастайных рытуальных дзеянняў, звярталіся па дапамогу да народнай медыцыны, белай і чорнай магіі. Перш за ўсё, гэта быў прамы кантакт з цяжарнай жанчынай ці той, якая толькі што нарадзіла, і яе дзіцем. Але парадзіха павінна была ведаць усю ступень адказнасці за «кантакт» з бясплоднай жанчынай: яна сама магла надалей не нарадзіць, ці бясплоднасць магла перайсці на яе дзіця.

● Бясплодная жанчына прасіла дазволу пасядзець ці паляжаць на тым месцы, дзе толькі што прайшлі роды, першай узяць на рукі нованароджанага, апрануць і панасіць ніжнюю спадніцу ці пояс парадзіхі.

● Пры бясплоднасці знахары раілі піць напой з лекавых раслін, у які абавязкова дадавалі кроў парадзіхі.

● Калі ў новую хату сялілася сям'я, якая не мела дзяцей, то першай пасля «рытуальных» жывёл прасілі ўвайсці цяжарную жанчыну, каб у новай хаце нараджаліся дзеці.

● Калі ў доме была бяздзетная жанчына, то «першую» калодзежную ваду, г.зн. ваду, якую ўзялі з толькі што выкапанага калодзежа, перш за ўсё давалі пакаштаваць ёй.

● Часцей за ўсё рытуальныя дзеянні, накіраваныя на пазбаўленне ад бясплоднасці, выконвалі ў дзень Добравешчання і на Юр'я. Напрыклад, на світанні 6 мая трэба было ручніком «сабраць» юраўскую расу і працерці ёй мужа і жонку.

● Зайцы з-за сваёй незвычайнай здольнасці да ўзнаўлення заўсёды былі сімвалам пладаноснасці. З гэтай нагоды бясплодным жанчынам раілі есці як мага больш заечыны, асабліва мяса самцоў.

● Каб паспрыяць нараджэнню дзяцей, у час вяселля нявесце на калені саджалі маленькую дзяўчынку, а жаніху — хлопчыка.

● Каб «не перахапілі» нараджэнне першага дзіцяці, на вяселлі асаблівую ўвагу надавалі вясельнаму караваю, хавалі яго далей ад чужых вачэй і «нядобрых» рук.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Што самае галоўнае ў лесе?

— Туалетная папера. Асабліва ў хваёвым.

☺

Бальныя танцы — мастацтва прымаць ногі хутчэй, чым на іх наступіць партнёр.

☺

— Што трэба рабіць, убачыўшы знак «Асцярожна, дзеці»?

— Хутчэй праехаць гэтае месца, пакуль дзеці машыну не раскурочылі!

☺

— Ты чаго такі журботны?

— Ды так, адзін мужык грошай павінен...

— Дык у цябе што, каардынат яго няма?

— Каардынаты ёсць — ракеты няма...



☺

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Спорт

Гарналыжны спорт са славенскім акцэнтам

Першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага Алімпійскага камітэта Беларусі Генадзь Аляксеенка днямі прыняў прэзідэнта НАК Славеніі Янеза Касьянчыча, які заявіў, што Славенія акажа дапамогу Беларусі ў развіцці гарналыжнага спорту. Магчыма, дзякуючы дапамозе Славеніі ў развіцці пакуль яшчэ экзатычнага для Беларусі віду спорту, айчынныя гарналыжнікі дастойна выступяць калі не на бліжэйшай Алімпіядзе ў Ванкуверы, то на наступнай, у Сочы-2014», — выказаў спадзяванне віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі.

КУБАК ВЯТОХІНА

13 снежня адбудуцца спаборніцтвы за Кубак імя В. Вятохіна, якія стануць заключным этапам сезона-2008 па стэндавай стральбе. У турніры возьмуць удзел 45 спартсменаў з Беларусі, Расіі і Літвы, якія выступяць у трох дысцыплінах: скіт, трап і спортынг.

Кубак, які пройдзе ўжо ў пяты раз, атрымаў назву ў гонар Вадзіма Іванавіча Вятохіна — майстра спорту СССР міжнароднага класа. У далёкім 1966 годзе Вадзім Вятохін выйграў Кубак СССР, устанавіўшы ўсесаюзны рэкорд — 196 з 200 мішэняў. За час сваёй кар'еры Вадзім Іванавіч 11 разоў выйграваў чэмпіянат БССР. Сёння Вадзім Вятохін працуе трэнерам у Беларускай федэрацыі стэндавай стральбы.

Юрась ШАЎЦОЎ.

АБРАМОВІЧ АПЛОЦІЦЬ КАНТРАКТ ХІДЫНКА

Расійскі бізнэсмен Раман Абрамовіч пералічыць пяць мільёнаў долараў на рахунак Расійскага футбольнага саюза для аплаты гадавога кантракта галоўнага трэнера зборнай Расіі па футболе Гуса Хіддынка, паведамляе «Савецкі спорт». У канцы лістапада ў расійскіх СМІ з'явіліся паведамленні, што Хіддынку затрымліваюць зарплату. РФС абверг гэту інфармацыю.

«Калі ў Кітаі, ЗША ці Расіі, дзе вялізныя чалавечыя рэсурсы, можна весці адбор шляхам элементарнай канкурэнцыі, прасяваючы вялікую колькасць атлетаў, то невялікім краінам гэта не падыходзіць. Мы павінны рацыянальна ставіцца да спартсменаў высокага класа, нам вельмі важна заўважыць талент і даць магчымасць яму максімальна раскрыцца. Паміж малымі і сярэднімі краінамі важны абмен вопытам і салідарнасць. І сёння мы тут, каб дапамагчы Беларусі ў развіцці гарналыжнага спорту», — заўважыў кіраўнік НАК Славеніі.

Генадзь Аляксеенка ўручыў госцю медаль НАК Беларусі за ўклад у развіццё алімпійскага руху, але Янез Касьянчыч адказаў, што пакуль не заслужыў такой высокай узнагароды. «У нас у Славеніі ёсць прымаўка, што ні ўзнагарода, ні куля ніколі не знаходзяць патрэбнага чалавека. Я прыкладу ўсе намаганні, каб апраўдаць медаль».

Разам з кіраўніком НАК Славеніі ў Беларусь прыехалі старшыня гарналыжнага камітэта Славеніі Антон Вагрынец і прадстаўнікі бізнэс-структур.

Алена КРАВЕЦ.

«ЗАЛАТЫ МЯЧ» — У РАНАЛДУ

Партугальскі паўабаронца англійскага «Манчэстар Юнайтэд» Крыштыяну Раналду стаў уладальнікам «Залатога мяча». Прэстыжная прэмія, заснаваная ў 1956 годзе французскім штотыднёвікам France Football, штогод уручаецца лепшаму футбалісту года. Крыштыяну Раналду ў складзе свайго клуба выйграў сёлета чэмпіянат Англіі і Лігу чэмпіёнаў. Сярод галоўных канкурэнтаў партугальца называўся аргенцінец Ліанэль Месі з іспанскай «Барселоны». Да Раналду апошнім з гульцоў «МЮ» гэту ўзнагароду атрымліваў Джордж Бэст у 1968 годзе. Летась лаўрэатам прэміі стаў бразілец Кака («Мілан»).

«САТУРН» І «ХІМКІ» АБ'ЯДНОЎВАЮЦЦА

Падмаскоўныя футбольныя клубы расійскай прэм'ер-лігі «Сатурн» і «Хімкі» аб'ядноўваюцца з-за складанай фінансава-эканамічнай сітуацыі ў рэгіёне. Аб'яднаная каманда будзе прадстаўляць Маскоўскую вобласць у прэм'ер-лізе пад назвай «Сатурн». Фарміравацца склад каманды будзе на парытэтных пачатках, базіравацца новы «Сатурн» будзе ў горадзе Раменскае Маскоўскай вобласці, а матчы праводзіць на стадыёнах «Сатурн» і «Арэна Хімкі». У мінулым сезоне абодва падмаскоўныя клубы выступілі няўдала. «Сатурн» заняў 11-е месца сярод 16 камандаў прэм'ер-лігі, «Хімкі» фінішаваў на 14-м радку.

«ДЫНАМА» ПАДПІСАЛА ФРАНЦУЗА

Агледзіны французскага абаронцы Арэльена Мантарупа ў мінскім футбольным «Дынама» завяршыліся падпісаннем кантракта. Выхаванцу клуба «Рэн», які мае рэпутацыю аднаго з наймацнейшых футбольных школ у Еўропе, не спатрэбілася шмат часу, каб даказаць сваю прафпрыдатнасць у стане мінскага «Дынама». Днямі Мантаруп афарміў свае адносіны са сталічным клубам, якія разлічаны на два гады.

КУБАК САДРУЖНАСЦІ-2009

Прайшла жараб'ёўка 17-га міжнароднага турніру па футболе «Кубак чэмпіёнаў Садружнасці», на якім Беларусь будзе прадстаўляць бронзавы прызёр першынства сталічны МТЗ-РІПА. МТЗ-РІПА трапіў у групу В, дзе таксама згуляюць «Ашхабад» (Туркменія), «Экранас» (Літва) і маладзёжная зборная Расіі. Групу А склалі «Рубін» (Расія), «Арарат» (Арменія), «Актобе» (Казахстан), «Пахтакор» (Узбекістан). У групу С увайшлі «Шахцёр» (Украіна), «Шэрыф» (Малдова), «Левадыя» (Эстонія), «Рэгар-Тадаз» (Таджыкістан). У групе D — «Інтэр» (Азербайджан), «Венспілс» (Латвія), «Дардой-Дынама» (Кіргізія), «Інтэр» (Фінляндыя). Кубак Садружнасці пройдзе 17—26 студзеня ў Маскве.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6831. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12